Новы час | 13 жніўня 2021 | № 31–33 (739–741) | «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | №8–9


Літаратурная Беларусь

Выпуск №8–9
(180–181)
(жнівень–верасень)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas.by

Змест



Фота Дзмітрыя Дзмітрыева

«Бяссмертнае роднае слова»

Перад вамі апошні — у гэтым часе — папяровы выпуск «Літаратурнай Беларусі». У Беларусі, дзе ўжо не засталося аніводнага друкарскага варштата, каб старадаўнім скарынаўскім метадам распаўсюджваць беларускае слова — свабоднае, незалежнае. Дзе не засталося аніводнай легальнай магчымасці гэта рабіць...

У падобнае немагчыма было паверыць 15 гадоў таму, калі ў ліпені 2007-га выйшаў першы нумар «Літаратуркі». Не хочацца верыць у гэта і цяпер...

Вось перадмова-анонс з таго ўжо няблізкага выдання:

«“Літаратурная Беларусь” — гэта супольны праект Грамадскага аб'яднання “Саюз беларускіх пісьменнікаў” і тыднёвіка “Новы час”, гэта альтэрнатыва адабранай у старэйшай творчай арганізацыі Беларусі і цяпер падкантрольнай уладам газеце “Літаратура і мастацтва”.

Гэта фармаванне незалежнай творчай думкі нацыянальнай эліты.

Гэта імкненне супрацьстаяць татальнаму замоўчванню вольнага мастацкага слова ў дзяржаўных СМІ.

Гэта свабодная трыбуна паэтаў, празаікаў, драматургаў, крытыкаў і чытачоў Беларусі.

Гэта напамін аб тым, што Беларусь — і дзяржаўная, і літаратурная — створана найперш пісьменнікамі, і яна патрабуе іхняй новай працы і апантанасці.

«Літаратурная Беларусь» — новы час чытання»...

Час не выбіраюць. Ды й амаль ніколі ён не быў спрыяльным для нацыянальнай культуры, для беларускага слова. Забарона друку на беларускай мове паводле царскага ўказа была адменена толькі ў снежні 1904 года. А затым змяняліся «цары» і ўказы — але вальней беларускаму слову не станавілася. Вось толькі адно паэтычнае сведчанне Янкі Купалы, які яшчэ на пачатку мінулага стагоддзя прароча ўвершаваў наш нацыянальны кліч-пазоў «Жыве Беларусь!»:

Бяссмертнае слова, ты, роднае слова!
Ты крыўды, няпраўды змагло;
Хоць гналі цябе, накладалі аковы,
Дый да́рма: жывеш як жыло!

Свабоднае слова, ты, роднае слова!
Зайграй ты смялей, весялей!
Хоць га́дзіны сыкаюць, кружацца совы,
Жывеш ты на хвалу людзей.

Новыя га́дзіны не стамляліся атручваць носьбітаў свабоднага беларускага слова і ў часы Курапатаў, і ў часы «кукурузаводства», і ў часы «паспяховага застою».

Вальней беларускаму слову не станавілася. І не становіцца...

Тым не менш, «Новы час» падараваў сучаснасці і гісторыі 181 нумар нашага выдання. А гэта — сустрэчы з сотнямі адметных беларускіх і замежных аўтараў, з тысячамі арыгінальных вершаў, апавяданняў, эсэ, нарысаў, рэцэнзій, артыкулаў, гутарак, лістоў, успамінаў. Гэта — штомесячныя творчыя сустрэчы як з класікамі беларускай літаратурнай сучаснасці, так і з іх наступнікамі-прадаўжальнікамі — творчай моладдзю.

Рыхтуючы гэты «часоваапошні» выпуск, мы вырашылі сабраць у ім найбольш адметныя мінулагоднія публікацыі, — і прапануем своеасаблівы «літбелаўскі» дайджэст, мініхрэстаматыю «новачаснага» літаратурнага сугалосся.

Вядома, выбраць лепшае з раней апублікаванага — справа суб'ектыўная і немагчымая. Таму перад вамі найперш тэксты тых творцаў, хто ўжо не зможа прапанаваць да друку сваю паэзію ці прозу ні сёння, ні заўтра: Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Анатоль Кудравец... А таксама — творы тых аўтараў, якія найактыўна супрацоўнічалі з «Літаратурнай Беларуссю» і станавіліся выразнікамі яе тэматычнага і стылістычнага накірунку.

У гэтых, трэба прызнацца, шчымліва-скрушных абзацах хочацца ад імя ўсяго Саюза беларускіх пісьменнікаў выказаць сонечную ўдзячнасць апантанцам вольнага беларускага слова: рэдакцыі «Новага часу», яе кіраўнікам — колішняму светлай памяці Аляксею Каралю і цяперашняй — Аксане Колб, а таксама, безумоўна, усім нашым аўтарам і вам, дарагія чытачы — за непахіснасць, веру і моц.


Але мы — не развітваемся! Заставайцеся з «Літаратурнай Беларуссю» — яе бібліятэчнымі «падшыўкамі» ды інтэрнэтнымі версіямі. Учарашнімі, сённяшнімі і — будучымі.

І памятайма: якія б совы не кружыліся над намі, якія б аковы не накладалі на нас і на нашае свабоднае слова, яно па-купалаўску «жыве як жыло».

А таму — да новых сустрэчаў!

Вера і вернасць. Сіла і моц

Ніл ГІЛЕВІЧ (1931–2016)



Да выхаду першых нумароў «ЛІТАРАТУРНАЙ БЕЛАРУСІ»

Нарэшце! Нарэшце пабачыў, адчуў.
Аж стала да слёзаў шчымліва ў грудзях.
Аж стала прасветла-святліста ўваччу.
Ёсць, ёсць беларускага думання сцяг!

Ёсць вера і вернасць. Ёсць сіла і моц.
І мараў разбежнасць. І стройнасць пісьма.
І гостава памкненняў. І чыстасць яснот.
А блуду і бруду — і на́ дух няма!

2007

Не выйдзе, лірычная мышка, нічога не выйдзе

Лагодненькі-згодненькі лірык
з нявострым ад роду пяром,
паўвеку праседзеўшы ціха,
як мышка пад венікам ці памялом,
не піскнуўшы нават ні разу
у знак абурэння, пратэсту, нязгоды
з засіллем хвастатых ва ўладзе,
з разгулам нялюбцаў свабоды,
ні слова не мовіўшы
супраць бясчынстваў і гадства —
ні рыфмай, ні ў прозе, —
цяпер спахапіўся, апомніўся,
як гэта кажуць, «ужо на парозе»,
і ўздумаў — ні многа, ні мала –
у шэрай лірычнай старэчасці,
што трэба яму прапісацца
у часе, у веку, у вечнасці —
у ролі змаганца
супроць удушэння
нам Богам даверанай мовы, —
авось ды прызнаюць:
усё ж такі ў думках, употай,
і я быў гатовы...

Не выйдзе, лірычная мышка!
Нічога не выйдзе!
З мышынаю доляй змірыся.
Нервамі, сэрцам, крывёю
бароняць свабоду паэты.
Як ЯНКА. Або як ЛАРЫСА.

Крытыку сучаснай паэзіі

З захлёбам ты вершы ў рэцэнзіях хваліш —
з «афулам» хвалебствы на аўтараў валіш.
А як працытуеш у доказ страфу —
чытач скаланецца і выгукне: «Цьфу!»
Цытуй адпаведна, брат! Гэта ж рэклама!
І геніяў, бардзо пшэпрашам, таксама.

Даруй, Мікіта, гэта я ад зайздрасці

Выхаванец і ўслаўляльнік ладу,
сто прыварак грэбшы да акладу,
трыццаць год сцявярджаў у кінатворах,
хто працоўнаму народу вораг.
А цяпер ён стаўся мільярдэрам,
збудаваў маёнтак з бельведэрам,
пяць катэджаў, для гасцей прыгодных,
мае псярню, стайню рысакоў...
Не хапае мужыкоў прыгонных.
Пуцін! Дай Мікіту мужыкоў!
Ды не мёртвых душ, а жвавых, дужых!
І не сотню, а — хаця б паўтысячы.
Каб не толькі чынна неслі службы,
а й было каго на стайні высечы!

Народ

Народ! Калі ты ёсць народ,
А не бязвольны раб дармовы, —
Не дай пусціць сябе на звод:
Не выракайся роднай мовы!

Яна не горшая нічуць
За мовы іншых слынных нацый.
Таму — адрынь, адпрэч, адгудзь
Майстроў хлусні і махінацый!

Каб не загналі без пары
Цябе ў магілу злыдні-юды, —
Загавары, загавары
На роднай мове скрозь і ўсюды!

Загавары — каб свет наўсцяж
Пачуў твой голас валадарны!
Тады на дзедаўскіх касцях
Узыдзе лёс — як дзень бясхмарны.

Як мала...

Як мала
за мову зямлі беларускай
пакутнікаў!
Як многа
ахвочых па ёй патаптацца
паскуднікаў!

Як мала
за нашу душу беларускую
ратнікаў!
Як многа
ад гэтай душы адшчапенцаў
і здраднікаў!

Не падайце духам, хлопцы!

Не падайце духам, хлопцы!
Адкіньце суздром сумнеў!
І гнеў не тапіце ў стопцы —
У сталь загартуйце гнеў!

Не трацьце надзей і веры,
Пакутнай зямлі сыны!
На вежах званіц збуцвелых
Мы ўдарым яшчэ ў званы!

Яшчэ мы абудзім сілы,
Што спяць да пары ў касцях.
Яшчэ мы на Шлях Гусіны
Уздымем наш Герб і Сцяг!

Каб бачыла ўся планета,
Каб ведала людства ўсё,
Якая вядзе нас мэта,
Што ў сэрцах сваіх нясём.

Не падайце ж духам, хлопцы!
Адкіньце суздром сумнеў!
І гнеў не тапіце ў стопцы —
У сталь загартуйце гнеў!

Дзе вы?

— Дзе вы? Што робіце вы,
Беларусі сыны?
— П'ём, залажыўшы сумленне
ў ламбард Сатаны.

— А ці яшчэ вы не ўсё, што ільга, прапілі?
— Не! Дапіваем яшчэ. Вось — ізноў налілі.

— Дзіўна! Па-мойму,
вы ўсё прасцулячылі ўжо!
— Не! У запасе — барыш
ад прадажы крыжоў.

— Тых, што на храмах?
Што нам сцерагуць небасхіл?
— Тыя пасля. Напачатку —
з дзядоўскіх магіл.

Не пытаюся...

Не пытаюся, бо знаю, Маці,
Знаю, што ім трэба ад Цябе —
Гэтым нелюдзям жандарскай масці,
Гэтай прагнай, хцівай галыцьбе.

Знаю, чым Ты іх так угнявіла,
Адчаго і шал на іх найшоў:
Воля, воля ім Твая няміла,
Уваскрэслая з магіл Дзядоў!

Не да смаку ім, што праўды светач
Азарыў Тваіх вякоў прастор,
Што, як роўная, Ты з цэлым светам
За адзін усаджваешся стол.

Ім нялюба, што на вольнай волі
Дыхаць робіцца Табе лягчэй,
Што дала Ты клятву — больш ніколі
Не ўгінаць перад ярмом плячэй.

Дык трымайся ж гэтай мужнай клятвы!
Не сагніся, Маці, і не ўкленч!
Не зважай, што нейкі найміт платны
Прымярае адэкватны фрэнч.

На сваёй зямлі адвечнай, Маці,
Не дадзім мы ўкрыжаваць Цябе —
Гэтым нелюдзям жандарскай масці,
Гэтай прагнай, хцівай галыцьбе!

***

Браты! Ачніцеся! Няўжо вам
Не чутна, хоць бы і скрозь сон,
Як прамаўляе божым словам
Да вашых сэрцаў вешчы звон?

Як кліча ён знайсці свой Кіцеж,
Паўстаць з прадоннай нематы...
Дык не праспіце ж, не ўпусціце ж
Час, Богам дадзены, браты!

***

Родная мова! Ты воч не расі!
Лёс твой — свабода.
Іменна ты незалежнасць дасі
Духу народа.
Ты — чыя веліч, і моц, і краса
Толькі ўзыходзяць.
Ты — чыя слава наперадзе ўся
Ў тысячагоддзях.

***

І зноў брыдота слоў пустых!
І зноў з экраннай рамкі цеснай
Якісь нявысветлены тып
Бялкамі бліскае злавесна.

І зноў крычыць пра Беларусь,
Маўляў: люблю і ганаруся,
Але ў вачах яго чамусь
Зусім не бачна Беларусі.

Каб хоць бы што ад той зямлі,
Што ўся замешана на ласцы,
На дабрыні, на цеплыні,
На мроях, светлых, як у казцы.

Пра Беларусь крычыць, аднак,
Як доўга слухаць я ні мусіў —
Каб хоць адзін маленькі знак,
Што гэта голас Беларусі.

Каб хоць бы што ад той душы,
Што ўся збалелася ад болю,
За гвалты дзякуй даючы,
За крыўды плацячы любоўю.

О, краю мой! Ты столькі знёс
Абраз — хапіла б на паўсвету.
Яшчэ і гэту ўскінуў лёс.
Няўжо знясеш яшчэ і гэту?

***

Усё гэта будзе абернута ў міф
Судом, што не хібіць ніколі.
І стлеюць паперы, паводле якіх —
Народу гібець у няволі.

Усё ператворыцца ў тлен спакваля,
Што мела трываласці знакі.
І здраднікаў косці адрыне зямля,
І іх парасцягнуць сабакі.

***

Сярод разнамоўных на свеце плямён
Ёсць рэдкі феномен — пачвары.
Па мове іх тут пазнавалі здавён,
А можна пазнаць і па твары.

У чым іх адметнасць, іх код племянны?
У тым, што, адрокшысь мовы,
Якой даражылі іх продкі, яны
І продкаў зрачыся гатовы.

Таму і гукае галоўны іх жрэц
Амаль што не з кожнай трыбуны:
«Пачвары! Тутэйшая мова — сырэц,
Не годны для будучай Думы.

Ніякае літасці к ёй, ні спагад!
З касцямі гламзайце ікласта!
З карэннем карчуйце! Як хмыз на лугах.
Як з сэрцаў — Вялікае Княства.

Карчуйце, пачвары, жывей і смялей,
Да ейнага плачу аглухшы!
І будзе ісці трыумфальна далей
«Язык наш, із лудшых найлудшы»!

Нават з амбону

Божа праведны! Нават з амбону
Бласлаўляецца ўладным крыжом —
Не Свабода, не святасць Закону,
А душы беларускай пагром.

Пра якое яднанне ён кажа —
Гэты знаны вялебны святар?
Злыдзень рукі вяроўкаю вяжа,
Што паклалі вянок на алтар.

Пра якую духоўнасць вяшчае?
Пра якую маральнасць гудзе?
Злыдзень мову народа знішчае
І на вусны мне плямбу кладзе.

Пад якою харугвай святою
Ён пяе — каб і я падхапіў?
Злыдзень бруднай, паскуднай пятою
На святыні мае наступіў!

Для чаго ж, нібы дыму з кадзіла,
Напускае імглы ягамосць?
Каб забыў я, што наша Радзіма —
Гэта наша Радзіма і ёсць?

Марна, марна шчырые вялебны!
Беларусь на планеце — адна.
Нашы продкі ў змаганнях палеглі
Не затым, каб згібела яна.

А затым, каб насуперак гвалту
Нейчай волі нялюдскай, сляпой,
Узрасла і набралася гарту
Пад уласнай харугвай святой.

Ніл ГІЛЕВІЧ: «Будзем аптымістамі, іншага не дадзена»

...Ён некалькі гадоў не выходзіў са сваёй кватэры на вуліцы Карла Маркса, але актыўна сачыў за навінамі, шчыра цікавіўся беларускай літаратурай і палітыкай. Цягам некалькіх гадоў Ніл Сымонавіч адмаўляў журналістам у інтэрв'ю. Але для прэс-службы Саюза беларускіх пісьменнікаў зрабіў выключэнне. Гэтая размова — пра Беларусь, Украіну, прэзідэнцкія выбары. Пра ўсё, што набалела.

— Ніл Сымонавіч, вы адзіны Народны паэт Беларусі, найстарэйшы нацыянальны творца, дзяржаўны дзеяч і палітык. Якою вам бачыцца сёлетняя Беларусь, ці адчуваюцца пэўныя змены да лепшага альбо да горшага?

— На вялікі жаль, вясёлага на сённяшні дзень нічога не бачу. Як і раней — і год, і два, і пяць, і дзесяць назад — наша грамадства ці нават, скажам, народ наш, насельніцтва Беларусі далёка не ўсё паднялося да разумення галоўнай задачы, якая стаіць перад намі, перад нашай дзяржавай. Галоўная задача — не дапусціць, каб наша мова і далей гінула так, як яна гіне цяпер. Без усведамлення, што такое мова ў жыцці народа, што такое нацыянальная культура, нацыянальная гісторыя, у народа не можа быць будучыні. Дык вось, на вялікі жаль, гэту ісціну, апрабаваную дзясяткамі народаў на працягу стагоддзяў, у нас разумеюць далёка не ўсе. І таму падымаюць пытанні, патрабуюць вырашаць эканамічныя праблемы, сацыяльныя, экалагічныя і іншыя. Не ўсведамляючы, што пaперадзе ўсіх праблем павінна ісці праблема мовы. Сказаў жа некалі першы вялікі, першы народны беларускі паэт Францішак Багушэвіч: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!». Усё! Што ж незразумелага? Калі не хочам памерці, а хочам жыць, значыць, павінны перш за ўсё ратаваць мову. Гэтым не адмаўляючы важнасць рашэння іншых вышэйпералічаных задач. На вялікі жаль, і сёлетняя сітуацыя, і пяць гадоў назад, і дзесяць... Прэтэндэнты на самую высокую пасаду ў нас вось на гэта самае галоўнае забываюцца. Не лічаць самым галоўным. Мяне гэта бязмерна засмучае. Інтэлігенцыя гэта павінна разумець. Канечне, некаторыя з прэтэндэнтаў на правадыра краіны забываюцца па іншых прычынах. Але яны і не з'яўляюцца патрыётамі Беларусі. Іх мала цікавіць лёс Беларусі менавіта як «беларускай Беларусі». Таму лічу, што сёння найпершы абавязак усіх свядомых беларускіх грамадзян — патрыётаў бацькаўшчыны — думаць пра гэта, турбавацца пра гэта. Ну і па меры магчымасцяў дабівацца карэнных пераменаў у гэтых адносінах.

— Апошнія некалькі гадоў назіраецца пэўнае ажыўленне цікавасці да мовы. Адкрываюцца добраахвотніцкія бясплатныя курсы беларускай мовы. І яны ніяк не звязаны з дзяржаўнай адукацыяй. Як вы думаеце, мажліва ў нашых варунках будучыня беларускай мовы за недзяржаўнымі адукацыйнымі праектамі?


— Дык гэта і ёсць сапраўдная прапаганда беларускай мовы. Больш за тое, выхаванне павагі і любові да беларускай мовы, але менавіта не з ласкі дзяржавы. Гэта выдатная падзея, выдатная наша рэалія, што ўтвараюцца такія асяродкі, дзе кожны, хто жадае, можа палепшыць сваё веданне мовы.

— Скажыце, наколькі ўдаецца вам сачыць за новымі кнігамі, за літаратурнай перыёдыкай, наогул за станам сучаснай беларускай літаратуры?

— Я ўжо некалькі разоў сказаў «на вялікі жаль» і яшчэ раз скажу: на вялікі жаль, вельмі мала. Па стане здароўя. У мяне ўвогуле глядзіць толькі адно вока, і тое ўсё слабей і слабей. Мне чытаць вельмі цяжка, сам амаль не чытаю. Вось прыходзіць часам пляменніца, сястра малодшая, чытае. Ну яшчэ прэсу сяк-так перакідаю, хоць загалоўкі, набраныя буйнейшымі літарамі. Таму стараюся больш слухаць радыё. Бывае, што ўвесь вечар і да позняй ночы каля радыё — і нашага афіцыйнага дзяржаўнага, і Радыё Свабода, і іншыя станцыі — каб усё-такі быць у курсе, дзе, што і як адбываецца. Выручаюць і сябры, прыйдуць, раскажуць, абмяняемся думкамі па тым ці іншым пытанні. Я вельмі неабыякавы да таго, што адбываецца ў нашай краіне і ў блізкім свеце. За падзеямі ва Украіне з першага дня сачыў і сачу, як толькі можна. І вельмі хачу і спадзяюся, што паразумнеюць нарэшце тыя, хто сёння займае не тое што нейтральную, але недружалюбную пазіцыю ў дачыненні да нашай братняй Украіны. Так нельга, катэгарычна так нельга.

— Цяпер стаўленне беларусаў да Украіны праз расійскія СМІ падзеленае на два лагеры. Ёсць тыя, хто верыць расійскім навінам, і тыя, хто не верыць.

— Натуральна. Мне цяжка сказаць, але я ведаю, што мы падзеленыя на дзве палавіны і, зноў жа «на вялікі жаль», нашмат больш тых, хто падтрымлівае Расію і не перажывае, не хварэе за лёс Украіны. Што хацець, калі наша насельніцтва, у вялікай сваёй частцы, за Беларусь не змагаецца і не перажывае — дык дзе ж ужо там за Украіну! І аднак жа, думаю, я не памыляюся, калі маркую, што з ліку нашай моладзі ўсё больш і больш тых, хто разумее наш абавязак крэўных братоў, суседзяў украінскага народа суперажываць і, па магчымасці, дапамагаць. Мяне вельмі кранула, што нямала нашых хлопцаў удзельнічала і на Майдане, і ў баях на баку ўкраінскай арміі за незалежную і непадзельную Украіну. З вялікім хваляваннем чытаў пра смерць і пахаванне берасцейскага хлопца Алеся Чаркашына. Вельмі кранула мяне, што столькі людзей сабралася на пахаванне. Узрадавала вестка пра ўрадавую ўзнагароду, дадзеную пасмяротна Міхасю Жызнеўскаму. Гэта і сапраўдныя беларусы, і сапраўдныя сябры братняй Украіны.



— Вы кажаце, што праз радыё і газеты сочыце за грамадска-палітычнай сітуацыяй. Якое ў вас склалася меркаванне наконт чарговых прэзідэнцкіх выбараў, калі можна ўжываць тут гэтае гучнае слова.

— Апошні раз я ўдзельнічаў у выбарах у 1994 годзе. Пасля вельмі хутка зразумеў, што з намі здарылася, з нашай Беларуссю. Выбараў сапраўдных, належных, як ва ўсіх дэмакратычных краінах, не можа быць, пакуль не памяняецца сітуацыя. З павагі да сябе, да свайго разумення, што такое дэмакратыя і абавязкі кіраўнікоў дэмакратычнай краіны, я не хачу прыніжаць сябе і ўдзельнічаць нават намінальна. І на гэты раз, што б ні гаварылі, што б ні абяцалі, усё застанецца як было. Мы павінны былі ісці шляхам, як у найбольш перадавых еўрапейскіх краінах: тэрмін прэзідэнцтва — максімум дзве кадэнцыі. Не больш. А ў нас, бачыце, — адзін і той жа правадыр... Хочаш не хочаш, атрымліваецца, тыя, хто будзе ўдзельнічаць у выбарах, гэтым самым сваім удзелам працуюць на карысць аднаго кандыдата. У Еўропе скажуць: балатаваліся ж вы, але не прайшлі, і народ выбраў іншага. А як ён выбера, калі ў яго даўно ніхто не пытае. За столькі гадоў хіба не пераканаліся, што сапраўдных выбараў няма?..

— Ніл Сымонавіч, але як змяніць гэтую сітуацыю?

— Адна партыя ці група не зменіць нічога. Толькі Майдан зменіць. Як ва Украіне: быў Януковіч — і няма Януковіча. Выйшаў народ. Таму ўсе свядомыя змагары за беларускую Беларусь павінны рыхтаваць народ. А ён выйдзе тады, калі будзе гэтак жа нацыянальна выхаваны і патрыятычна настроены, як украінскі народ. Нам яшчэ далекавата да гэтага. Бо інакш як выйдзе народ увесь, не дзясяткі нават тысяч, а сотні, калі не разумеюць галоўнай задачы? І думаю, што я прагаласую за таго, каго я хачу, і ўсё на гэтым. Ну і што? Даўно было сказана: выйграе не той, хто галасуе, а той, хто падлічвае галасы.

Але складаць рукі ў бяздзейнасці і маўчаць нельга. Трэба як мага больш актыўна тлумачыць народу, у чым наша слабасць. Простыя людзі і сёлета спадзяюцца, што пасля выбараў зажывуць лепш, багацей. Трэба ж разумець, калі гэта можа адбыцца. Няма іншага шляху, як асветніцтва ў народзе. Помніце, чыталі, як пры цары яшчэ дэмакратычная інтэлігенцыя ставіла задачу асветніцтва сярод масаў. Цёмныя масы могуць узарвацца, але чаго гэтым дасягнуць? Таго, што на змену аднаму дыктатару прыйдзе другі, на змену другому — трэці. Таму колькі ёсць магчымасцяў, хоць яны не такія вялікія, колькі ёсць сілаў, трэба гаварыць з людзьмі, тлумачыць, якім чынам мы можам павярнуць у іншы бок усю сітуацыю. Так, як людзі рабілі. Не мы першыя, не мы апошнія.

Глядзіце, найбольш даступны нам прыклад. Возьмем Польшчу. Дзвесце з гакам гадоў назад царская Расія на пару з Прусіяй і Аўстрыяй разарвалі Польшчу. Нават сталіца Польшчы апынулася ў складзе Расійскай імперыі, там былі заснаваны рускі ўніверсітэт, і ўсе найважнейшыя, галоўныя парадкі былі ўсталяваныя гэткія, як і ў Расіі. Але ёсць адно вялікае «але»: польская інтэлігенцыя, а следам за ёю і польскі народ, не адракліся ад польскай мовы. Наадварот, узяліся яшчэ з большым натхненнем выхоўваць нацыянальныя польскі патрыятызм. Геніяльны польскі паэт Адам Міцкевіч нарадзіўся, калі Польшча ўжо была ў складзе Расіі. Але ён і яго сучаснікі — і пісьменнікі і навукоўцы — сталі вялікімі патрыётамі, адчуўшы сур'ёзную небяспеку. А таксама зрабілі некалькі спробаў вызваліцца ад прыгнёту. І што? Як толькі наступіў гістарычны момант, 1918 год, уваскрэсла Польшча, атрымала дапамогу ад іншых дзяржаў і настолькі адчула ўнутраныя сілы, што ў наступным годзе пайшла вайной на савецкую Расію. Вось што значыць — не страцілі нацыянальны дух, нацыянальную годнасць, пашану да сваёй польскай культуры і мовы. Цяпер, пасля апошняй вайны, навязаў Іосіф Вісарыёнавіч Польшчы такія ж парадкі, як і для ўсяго сацыялістычнага лагеру. Цярпелі, так, але і пры сацыялістычных парадках як расквітнела польская культура, літаратура, мастацтва. І як падышоў час — і ніякай крамлёўскай апекі. Вазьміце Прыбалтыку: здаваліся, так прыдушылі, што далей няма куды. А што мы бачым цяпер? Нам ёсць з каго браць прыклад — з нашых суседзяў.

— Пытанне на астачу: што б вы маглі пажадаць новым пакаленням беларускіх літаратараў і наогул беларускай моладзі? Якою бачыцца вам іх сучаснасць і іх будучыня?

— Нядаўна Барыс Пятровіч прынёс аж шэсць новых кніжачак. З бальшынёю іх аўтараў я не знаёмы. Што выходзіць велічэзная колькасць кніжак маладых, мяне вельмі цешыць. Не важна, што яны не ўсе на тым узроўні, на якім хацелася б бачыць. Так было ва ўсе часы. Ёсць таленавітыя, ёсць вельмі таленавітыя, ёсць, дай Божа, геніі. І ёсць слабейшыя, але не безнадзейныя. Нешта карыснае могуць рабіць — хай робяць! Калі трапляецца зусім пустое графаманства — што ж з таго, гэтак і сто гадоў таму было. Ну, добра, вось шэсць, дзесяць, сто кніжак. Але нават калі палавіна будзе вартая ўвагі — і тое дзякуй Богу. Так што памажы Божа. Канечне, вельмі мала магу я чытаць, а па радыё з той кагорты маладых, якую я хачу пачуць, дзяржрадыё нікога не перадае, а пускае якраз тых, якія мала даюць падстаў ганарыцца.

Я вельмі ўзрадаваўся, калі пачуў, што пачалі вяртацца ў наш Саюз беларускіх пісьменнікаў некаторыя таленавітыя людзі. Што яны былі ў праўладным, я не асуджаю. У кожнага малыя дзеці, сям'я, а чым карміць, калі прыгразілі, што паляціш з працы? Што ж, можна змірыцца, але часова. Можна змірыцца, але нельга рабіць подласць, як некаторыя. Падтрымліваць, як Купала казаў, «ворагаў беларушчыны», тым больш заўзятых, лютых ворагаў.

У мяне на маладых вялікая-вялікая надзея. Я некалі і верш напісаў «Кліч да беларускай моладзі» і заклікаў не падаць духам. «Не падайце духам, хлопцы, і гнеў не тапіце ў стопцы». Толькі так. Я пры гэтым разважаю, што не можа ўсё насельніцтва, увесь народ да такой ступені страціць розум, каб адмовіцца ад абароны сваёй Бацькаўшчыны. З ліку моладзі ўсё больш і больш тых, хто ўсё разумее. Таму і ходзяць і на курсы беларускай мовы, пішуць на роднай мове, і выдаюць, і чытаюць. Ну, і на мітынгі ідуць.

Я надзей не трачу. Я веру. Калі я заклікаў «не падаць духам», дык ясна, што і сам не падаю. Вельмі бывае цяжкі настрой ад усёй брыдоты, якую бачыш, чуеш. Але, як у народзе кажуць, перажылі зіму, перажывём і лета...

Мяне заўсёды падтрымлівае веданне, як выстаялі народы еўрапейскія, не проста меншыя колькасна за Беларусь, а ў некалькі разоў меншыя. Славенцы квітнеюць, чарнагорцы, македонцы, славакі, фіны... Нават чэхаў і балгараў менш, чым беларусаў. І трымаюцца, не скардзяцца Богу на свой лёс. Тут можна задушыцца ад крыўды: чаму беларусы нічога не бачаць і не разумеюць? Дзякуй Богу, моладзь пачала разумець, асабліва як стала ездзіць за мяжу.


Будзем аптымістамі, іншага не дадзена. Будзем верыць у нашу праўду, у нашу перамогу.

2015

Гутарыў Ціхан Чарнякевіч

Жалезны камандзір

Васіль БЫКАЎ (1924–2003)



Атака сарвалася.

«Як жа так?. Як жа так?. От, праклятая шпокаўка! Адкуль яна ўзялася?» — праз горыч, боль і адчай стукала ў яго галаве неадчэпная думка ўвесь гэты час неспадзяваных ганебных уцёкаў ад вышыні ўніз, туды, у выратоўчыя рытвіны аўражыны, з якой гадзіну назад ён павёў людзей у атаку.

Ён ужо не спрабаваў падганяць байцоў, перастаў падаваць каманды — яго сарваны прастуджаны голас толькі сіпеў, без следу патанаючы ў грымотнай ліхаманцы бою. І Клімаў бег перад усімі, ведаючы, што толькі так можна не даць роце легчы, і раз за разам пазіраючы то ў адзін, то ў другі бок, дзе лупцавалі мерзлую, голую ад снегу зямлю злыя чорныя чэргі гэтай праклятай аўтаматычнай тарахцелкі.

Распырскаўшы абцасамі лёд у вымерзлай да дна лужыне, ён пераскочыў дарогу, пераскочыў канаву з пыльнай ссохлай травой.

Траншэя была ўжо зусім блізка, праз якіх дваццаць крокаў, калі агністыя калючыя клубкі разрываў падкаціліся амаль пад самыя ногі камандзіра роты. Асколкі ірванулі перапэцканыя полы паўшубка, бы дубцом сцебанулі па кірзавых халявах ягоных ботаў. Клімаў упаў ужо каторы раз за гэты сакавіцкі ранак — з усяго маху, як бег, і збітыя да крыві калені адразу апёк боль. Але ён адразу зразумеў[:] гэта не рана, гэта аб зямлю. Лейтэнант ускінуў галаву — у траншэі, прыгнуўшыся, беглі кудысьці зялёныя каскі, на брустверы, калюча бліскаючы агеньчыкам, сек аўтамат, яго кулі пырскалі ў вочы лейтэнанта пяском[;] ротны ўскінуў пісталет і торапка стрэліў туды тры разы. Побач торапка ўдарыў з аўтамата Косця. Заскарузлым рукавом лейтэнант выцер потны, запырсканы зямлёй твар. Чарга тым часам з гулкім трэскатам па ўмерзлым у зямлю леташнім іржэўніку кацілася далей, можна было ўскочыць. Яшчэ дваццаць шалёных імпэтных крокаў-скачкоў па адхоне — і ён узляцеў на бруствер, стрэліў перад сабой у чорную шчыліну траншэі і кульнуўся туды. Адразу перад ім, здаецца, іншыя, хто мог, ужо ўсе паўбягалі ў гэтае глыбока і шырока разварочанае прыродай сховішча і туліліся да яго голага, падзёўбанага напярэдадні мінамі берага, хаваючы ад куль і асколкаў галовы. Тарахцелка збавіла імпэт і, нібы задумваючыся, з перапынкамі біла па самым краі, часам з пералётамі, і тады траскотныя яе дваццацімілімятровыя снарады ірваліся ззаду, на другім баку аўражыны, між глеістых прамоін і гразкіх шэрых плям апошняга снегу.

«Адкуль жа яна ўзялася за ноч? Няўжо свежыя сілы?» — думаў ротны, стуліўшы за абрывам галаву. Сэрца яго шалёна гоцала ў грудзях, гарката стомы распірала лёгкія, у скронях з натужным звонам таўклася кроў. Ён выцягся на цвёрдым гліністым касагоры, з хвіліну аддыхваўся, затым, павярнуўшыся на бок, запіхаў у кірзавы кабур свой з драўлянай рукаяткай «ТТ». Пасля выглянуў на схіл пад вышыню, якая трохі ўжо суняла свой кулямётны вэрхал. Мацней за іншыя тачыла трывога за ардынарца Віцю Прахарэнку: ад самай дарогі ён згубіў яго. Але на схіле нікога жывога ўжо не відаць было, толькі там-сям бугрыліся шэрыя суконныя камякі забітых аўтаматчыкаў ды ля дарогі, наўскасяк перарэзаўшай схіл, з абвіслымі парванымі правадамі стаялі пасечаныя асколкамі слупы тэлефоннай лініі.

«І Смірнова не відно. І Пашы. Колькі ж засталося?»

Ён павярнуўся на другі бок — амаль побач на аўражным схіле, уткнуўшы твар у рукавы, ніцма ляжаў баец. З яго ўшчэнт пасечанага кулямі рэчмяшка выцягнуўся брудны вафельны ручнік, канец якога матляўся ад ветру на нерухомай спіне. Клімаў падцягнуўся і разы два штурхнуў ботам у чорную заскарузлую падэшву валёнка.

— Эй ты! Жывы?

Баец сапраўды варухнуўся, падняў на камандзіра зморанае, зашчаціненае, ужо зусім не малады твар.

— Паранены?

— А хто яго… ведае. Не, здаецца. Замарыўся… От жа нарабіў гад… Каб на яго халера…

Баец заварушыўся, стомлена сеў, палез у кішэнь па курыва. Клімаў яго не ведаў (мабыць, ён быў з апошняга папаўнення, якое рота атрымала тры дні назад) і падумаў, што чалавеку для пачатку пашанціла нямала: куль з дзесяць, не меней, прайшло, не зачапіўшы, над самай яго патыліцай.

— Што ж гэта будзе цяпер, га, лейтэнант? Столькі пабіла! На фарміроўку адвядуць ці як?

— Ага, чакай.

— Няўжо ж пакінуць яшчэ?

Чуйна прыслухоўваючыся да таго, што рабілася наверсе, і раскручваючы чырвоную нямецкую маслёнку-партабак, ён з непрыкрытай трывогай глядзеў на камандзіра роты. Занепакоены сваім, Клімаў адной уцалелай рукавіцай збіў пыл з рассечанага асколкам бота.

— Тваё як прозвішча? — запытаў ён.

— Маё? Ды прозвішча такое… Дзеўкін.

— Доўга жыць будзеш, Дзеўкін. Азірніся.

— Хто, я?

Намацаўшы ззаду шкоду, баец пачаў бурчэць і лаяцца, а лейтэнант споўз ніжэй, падняўся і пайшоў уздоўж ручая па аўражыне.

Аўражына была даволі глыбокая, але хадзілі ў ёй толькі па адным баку: другі быў пад агнём. Цяпер, аднак, тут папрыціхла, напэўна, ужо ўсе пахаваліся і стралець не стала па кім. У гэтай цішыні стала чуваць, як грахаталі выбухі пад вёскай, дзе вялі бой іншыя роты палка… Па аўражнаму схілу ўніз да ручая спусціўся баец у кароценькім пакамячаным шынялі, тупнуўшы разы два пяткай валёнка, праламаў тонкі лядок і пачаў кацялком зачэрпваць ваду. Ён таксама быў незнаёмы Клімаву. Незнаёмыя цяпер наогул трапляліся ў роце часта — полк шмат дзён у баях, і старых байцоў у ім засталося мала. Ды і сам ён у гэтай роце з'явіўся нядаўна, з тыдзень назад, да гэтага быў у іншым батальёне камандзірам узвода. Боты падварочваліся на касагорыне, ісці было нязручна. Клімаў спусціўся ніжэй да ручая. У аўражным беразе дзе густа, а дзе радзей, накапаным жвірам жаўцелі выдзеўбаныя за мінулую ноч ямкі-акопчыкі. Цяпер некаторыя з іх туліліся ў зямлі пустыя. Над берагам сям-там тузаўся на ветры быльнёг, і ў небе плылі-кудлычыліся шэрыя хмары. Было сцюдзёна, дзень абяцаў непагоду. Клімаў пераскочыў ручай, следам зазвінелі тонкія ільдзінкі. Тут, ля завароткі, была самая адкрытая мясціна, лейтэнант, увагнуўшы галаву, кінуўся бягом, але ў канцы не ўтрымаўся і азірнуўся на вышыню — у якім кіламетры над шэрымі рытвінамі бруствераў сноўдалі, знікалі і зноў з'яўляліся галовы ў пляскатых касках.

«Сволачы! Не баяцца», — са злосцю падумаў ён, забегшы за паваротак. Хаця, чаго ім было баяцца: боеприпасаў у роце не хапала, ашчаджалі кожную абойму з тых, што, атрымаўшы па норме, старшына прывозіў уначы ў роту. Лацно немцам. Але хай, да пары, суцешыў сябе лейтэнант, зноў пераскочыў ручаіну. Па нейкай палеглай і вельмі гразкай траве ён перайшоў крывуліну чарговага паваротка і ў задуменні аж схамянуўся ад нечаканай сустрэчы: перад ім стаяў конь. Конь, відаць, быў прыблудны, чужы, не падобны ні на аднаго з чатырох ротных вараных абознікаў, якія, дарэчы, цяпер былі са старшыной у тылах. Спачатку Клімаў махнуў рукой, спрабуючы сагнаць яго з свайго шляху, але конь нават не адрэагаваў на гэтую спробу, толькі трошачкі прыўзняў голаў і з такім анямелым дакорам зірнуў на чалавека сваімі бліскучымі бяздоннымі вачмі, што Клімаву стала няёмка. Ён дакрануўся да яго маршчыністай шыі, натапыраная поўсць з дробнымі белымі плямкамі — слядамі даўніх памулак — зябка здрыганулася на яго хрыбце, конь зрабіў спробу пераступіць, кульгануў і зараз жа падабраў пад сябе заднюю нагу. Пасля ён працяжна, трудна ўздыхнуў. Стараючыся болей не патрывожыць жывёліну, Клімаў праціснуўся па сцяжыне пры яе боку і, прайшоўшы яшчэ крыху, палез угору, дзе перад гэтай няўдалай атакай пакінуў свой КП з тэлефонам да камандзіра палка.

За ўвесь час адсутнасці камандзіра роты на яго імправізаваным КП у глыбачэзнай старой варонцы на краі рова гаспадарыў тэлефаніст Тарасікаў. Ні наступленне, ні абарона, ні паспяховыя ці няўдалыя атакі — нішто, здавалася, не датычыла гэтага хлопца, які ведаў адзіны свой на вайне клопат, — сувязь. Што б там ні адбывалася навакол, ён, кавалкам бінта прывязаўшы да вуха трубку, карпеў над старэнькім УНФ, слухаючы і баючыся толькі за свой даўжэзны, безліч разоў ірваны і вязаны-перавязаны провад. Крыху вышэй за яго на апарожненай жалезнай шпульцы сядзеў ягоны напарнік — маўклівы з рабым тварам сувязіст, перад наступленнем прысланы да аўтаматчыкаў з роты сувязі.

Абрушваючы з берагоў варонкі падмерзлую зямлю, Клімаў ссунуўся ў яе дно на тоўстую заследжаную льдзіну. Тарасікаў як рупны падначалены пры з'яўленні начальства неяк няўлоўна падабраўся нутром, прыўзняўся, прыўстаў на каленях і крануў ручку апарата.

— Як сувязь? — прывычна кінуў Клімаў, і Тарасікаў з бадзёрай гатоўнасцю, тонам, у якім чулася трошкі выхвальнае «а як жа інача», падхапіў:

— Ёсць, таварыш лейтэнант, — і, стрэльнуўшы на камандзіра прыгожымі выразнымі вачмі выхаванага, чуйнага хлопца, дадаў: — Тут вас дваццаць першы пытаўся.

— Даўно?

— Хвілін дзесяць.

Клімаў даўляную на шчоках жаўлакі і, укленчыўшы на адно калена, пад адтапыранае вуха шапкі сунуў канец трубкі. Пакуль у трубцы шчоўкалі кантакты пераключэнняў, Клімава абдало духмяным араматам махоркі, ён ускінуў голаў і моўчкі працягнуў руку да сувязіста. Той паспешліва адкусіў канец недакурка, выплюнуў яго. Клімаў зручней сеў ля апарата: са дзве зацяжкі калі не зусім супакоілі яго, дык усё ж пасобілі сабрацца перад непрыемнай размовай.

— Пашы не было тут? — усё яшчэ чакаючы з трубкай ля вуха, запытаў ён Тарасікава, які глыбей забіваў у зямлю стары паіржавелы штых, што служыў зазямленнем.

— Не, не было.

Нарэшце ў трубцы шчоўкнула, буркнула, Клімаў засяродзіўся ўсім сваім вельмі брывастым, вельмі абсівераным і ўсё ж, не зважаючы на гэта, маладым тварам.

— Слухаю, таварыш дваццаць першы.

— Што? Клімаў, ты? Што гэта ў вас сціхла там? Чаму не дакладваеш? Вышыня ўзята?

Клімаў зноў выдавіў на шархотkіх шчоках жаўлакі, рука яго намацала ў пале паўшубка дзірку, і пальцы з сілай ірванулі павіслы з белай паўсцёй мэтлах скуры.

— Алё! Далажы, як вышыня.

— Вышыня на месцы.

— Га? Алё! Што цябе дрэнна чуваць? Як вышыня, я пытаюся?

— Возьмем вышыню.

— Што? Возьмем? Ага, возьмем! — голас у трубцы адразу зрабіўся пагрозліва-з'едлівы. — Да вас што, толькі цяпер загад да розуму дайшоў…

Угары раптам грымотна трэснула, Клімаў інстынктыўна хіснуўся ніжэй да апарата, зірнуўшы з-пад локця ў неба, — над ровам плыло невялічкае рудае воблачка брызантнага разрыву. Камандзір палка яшчэ нешта казаў, але Клімаў зноў не пачуў, аглушаны новым, яшчэ больш блізкім разрывам. У доле наўкола бы хто сыпануў жменяю дробных каменьчыкаў — пыхнулі і прапалі пад ветрам сотні пыльных дымкоў.

— Малакасосы! Спалохаліся дзясятка вшывых фрыцаў! Аўтаматчык[і] мне называецца! Куча дрэні вы пасля гэтага. Вы… — далёкім злым голасам шархацела трубка.

Клімаў апусціў на калені трубку і, безуважны да яе шорхату, пацягнуў бычок.

Але ў гэты раз над ровам зноў аглушальна трэснула, і вецер хутка пагнаў прэч новае воблачка. «Прыстрэльваюць, — падумаў Клімаў.

— Цяпер будзе». Прыўзняўшы ў паветра трубку, ён спачатку не зразумеў, чаго гэта маўклівы тэлефаніст бокам ссунуўся на яго, прываліўся да пляча, галава яго ўпала на руку з трубкай, і лейтэнант схамянуўся толькі, калі струмені крыві пабеглі па яго штанах. Аднае рукой Клімаў згроб сувязіста, адхінуў назад і тут жа адхіснуўся сам — уся скроня байца была разварочана асколкам, з страшнае раны на твар, плечы зашмальцаванай ватоўкі і на лейтэнантаў паўшубак лілася кроў. Клімаў вылаяўся і з усяе сілы ляпнуў на лёд недакурак.

— Дабяруся!.. — крычала трубка, калі Клімаў зноў прыклаў яе да вуха пад ссунутай набок шапкай. Гнеўныя, злыя, несправядлівыя словы, якія за хвіліну да гэтага выклікалі ў ім толькі прыкрасць, цяпер узарвалі яго.

— А што вы крычыце! Я не палахлівы! І не для вас ваюю! Вось! А вышыню — не горш за вас ведаю, што трэба ўзяць. Але вунь шпокаўка не дае.

— Во-во, так і ведаў! Дрэннаму танцору, ведаеш, што заўжды перашкаджае? Якая гэта яшчэ ў цябе шпокаўка?

— У немцаў, не ў мяне. Дваццацімілімятровая аўтаматычная гармата, вось! З фланга, ад Сахно. Ды кулямётаў няма ўжо, адзін ручнік застаўся. А ў іх шэсць на вышыні. Ды яшчэ шрапнеллю лупяць, — скарыстаўшы нечаканую паўзу ў камандзіравай лаянцы, скардзіўся Клімаў. — А ў маіх па тры абоймы на вінтоўку ды па дыску на аўтамат. Чым браць, скажыце?

— Расплакаўся! Чым браць? Чым вунь Сахно бярэ? Чым Кузняцоў наступае? Храбрасцю! Гераізмам! Адвагай! Чуеш, які бой ідзе? Пад самай вёскай ужо. А ў іх па адной абойме на ствол. Сам правяраў. Затое ўмеюць. І не пушчаюць у штаны, як вы!

— Няма каму пушчаць, — гэткім жа сварлівым тонам адказваў лейтэнант. — Трыццаць чалавек засталося. Ад усёй роты.

— От здзівіў: трыццаць чалавек! Вунь у Сахно па дваццаць у роце, і то не скардзіцца.

— Ну, у мяне яшчэ да гэтага не дайшло!

— Мяккацеласць праяўляеш, таварыш камандзір роты. У жаласць іграеш. Вайна ідзе, лейтэнант! Нечага шкадаваць для перамогі! Дывізіі гінуць! — перайшоў ужо на крык маёр і раптам закашляўся. Адкашляўшыся ж пасля паўзы, ужо мякчэй аб'явіў:

— Ладна, Клімаў. Карандашоў падкіну. Сёння зноў атрымаем. Прама з марша. Семак не прасі. Няма. А карандашы будуць. Ну, але і я з цябе скуру здзяру, калі ты мне да дванаццаці нуль-нуль не возьмеш вышыню.

— Немцы скарэй здзяруць. Яны бліжай, — сказаў лейтэнант, але трубка ўжо змоўкла, і ён паклаў яе ў апарат.

Нейкі час ён сядзеў, утаропіўшы вочы і не бачачы нічога, апроч дробных пыльных струменьчыкаў крыві, якія з-пад цела забітага хутка паўзлі-каціліся на затаптаную плаху лёду ў дне варонкі. Хутка астываючы, кроў слаба парыла рэшткамі апошняга цяпла, побач сінім дымком струменіў у паветры недакураны «бычок». Лейтэнант дзеўбануў яго наском бота і выскачыў з варонкі ў роў.

Назад да свайго ланцуга Клімаў ішоў, не разбіраючы ўжо, дзе сцежка, дзе ручай, а дзе адкрыта і прастрэльваюць немцы. Адносіны да сябе з нейкага часу зноў сталі абыякавыя. Паўгадзіны назад ён бег з вышыні ў гэты роў, падаў, выкручваўся між разрываў, з усяе мочы стараючыся, як і ўсе, уберагчы сябе ад кулі або асколка, бо ў гэтым была найбліжэйшая небяспека і найбольшы клопат. Цяпер жа, раззлаваны і расстроены сваркай з начальствам, ён ураз згубіў усю ашчаднасць да сябе. Гэта было незразумела і дзіўна, каб задумацца аб тым, але думаць не было калі.

Агнявы бой на ўчастку суседняга батальёна Сахно ішоў без асаблівай сілы: тузалі паветра мінныя выбухі, гудзела зямля, кулямётная траскатня перамежвалася таропкім нязладным буханнем вінтовак. «Не падобна, каб Сахно дужа прасунуўся, — услухаўшыся, падумаў Клімаў. — Топчацца перад самай вёскай». Вядома, у такім становішчы яму нямала пасобіла, каб рота аўтаматчыкаў узяла гэтую праклятую вышыню. Але зноў жа, калі Сахно возьме вёску, тады лягчэй будзе ўзяць і вышыню. Вось табе і зачараванае кола, і разарваць яго якой хітрасцю наўрад ці магчыма.

Насустрач яму ўздоўж ручаіны бег нізенькі, як здалося Клімаву, дужа шустры баец. Каска сядзела на яго галаве неяк бокам, каўнер шынялка быў пастаўлены, і зашмальцаваныя палявыя ромбікі пятліц, бы рожкі, тырчэлі ад падбародка. У абодвух руках падмышкамі баец трымаў распаратыя цынкі ад патронаў.

— З якога ўзвода? — запытаў Клімаў. Баец паслухмяна спыніўся.

— З першага, таварыш лейтэнант.

— Дзе Смірноў?

Баец прастадушна паціснуў плячмі.

— Хто яго ведае. Мусіць, там, — кіўнуў ён на вышыню. — Не прыбег.

Клімаў прамаўчаў, пасля кіўнуў на цынкі.

— Многа далі?

— Дзе там! Мала, — ахвотна, як пра балючае, загаварыў баец. — Паўсотню на ўсіх. Ды во яшчэ пяць фенек, — ён трасянуў цынку — і ў ёй важка грукнулі жалезам гранаты.

— Запалы не забыўся?

— Не. Во, — нязручна штурхнуў ён нагой абвіслую кішэню.

— Адразу ж зарадзіць. Магазіны таксама. Рыхтуйцеся да атакі.

Баец насцярожана ўскінуў голаў, з твару яго адразу знікла кароценькая бадзёрасць ад гэтай сустрэчы і камандзіравай увагі да яго спраў, дзве дробненькія зморшчыны скранулі яго абсіверанае пераноссе.

— Ёсць, — вяла прагаварыў ён і, чагосьці яшчэ чакаючы ад лейтэнанта, не ішоў, а глядзеў яму ўслед. Клімаў адчуваў гэтае замяшанне і гэты позірк, але не азірнуўся, каб не размякчаць свае халоднай суровасці, і на хаду кінуў:

— Сам павяду ўзвод.

Баец нявесела падабраў цынкі і пабрыў далей, а Клімаў, прыпыніўшыся, выцягнуў за цэпку з-пад палы гадзіннік: было без чвэрці дзесяць.

Ён пайшоў далей у трэці ўзвод, якім камандаваў малодшы лейтэнант Грэчка. Гэта быў цяпер адзіны камандзір узвода ва ўсёй роце. Што ён жывы, Клімаў ведаў пэўна, бо, бегучы з вышыні, бачыў, як трэці ўзвод раней за іншых паспеў схавацца ў рове і такім чынам найменш пацярпеў у той няўдалай атацы. Грэчка тады на беразе рова ўсё размахваў сваім ППД, аж покуль апошні баец яго не ўкрыўся ад агню.

Гэта было крыху на водшыбе ў тым канцы рова, які сама бліжай падступаў пад вёску з тае ўедлівай, такой ашалела-бязлітаснай гарматай. Роў тут рабіўся вузейшы і, мабыць, глыбейшы — голыя гліністыя абрывы зусім сціснулі замерзлую ручаіну, якая брала адсюль свой пачатак. Грэчкаўцы, відаць, акапваліся — з берага ўніз сыпалася зямля, і відаць было, як раз-пораз выляталі адтуль рассыпістыя лапаткі глею. «Ужо акапваюцца! Якія спрытныя», — злосна падумаў Клімаў. Ён ускарабкаўся па жорсткай калючай, бы наждак, кручы, крыху прайшоў і запытаўся ў байца ў ямцы, што назіраў за вышыней, дзе камандзір. Баец паказаў у акоп за вымаінай, адкуль у паветра часта выляталі камякі зямлі.

Клімаў добра ўгрэўся, пакуль пералез тую вымаіну і дабраўся да ўзводнага. Грэчка так улёг у сваю працу, што не заўважыў ротнага і ўжо на самым брустверы ўссыпаў яму на шапку поўную лапату зямлі. Бокам прысеўшы на глей, Клімаў страхнуў яе ў акоп.

— А ну, вылазь сюды.

З акопчыка паказаўся разагрэты працай, белабрысы, з крутаватым падбародкам твар, на якім адзначаліся незадаволенасць і запытанне. Убачыўшы, аднак, Клімава, узводны адкінуў лапатку і лёгка выскачыў наверх. Гэта быў камлюкаваты, тугаплечы крапак, распрануты да гімнасцёркі з расшпіленым адкладным каўняром, на чырвонаармейскіх пятліцах якой нечая няўмелая рука белаю ніткай насцягала па кубіку. На грудзях хлопца бліскаў ордэн Чырвонага Сцяга.

— Во вырыў, ніякая шрапнель не возьме, — аддыхваючыся і папраўляючы на рамяні чорны кабур трафейнага парабелума, сказаў ён. Затым накінуў ватоўку і апусціўся побач з лейтэнантам. Клімаў без цікавасці зазірнуў у акопчык.

— Возьме. Рыхтуй узвод да атакі.

Грэчкавы рукі замерлі на захінутых краях ватоўкі.

— Які ўзвод?

— Свой.

— Зноў?

— Зноў.

Грэчка змоўк, не спускаючы позірка з Клімава, затым ляпнуў нагой у ком глею, які, падскокваючы і трушчачыся ў драбязу, пакаціўся ў роў.

— Не павяду. Хай вунь Сахно тую балаболку ўбярэ. Тады пайду.

Клімаў зламаў высахлую сцяблiну быльнёгу і раструшчыў яе ў пальцах.

— Пойдзеш на левым фланзе. Ад ляска. Так паспрабуем.

— Пайшлі яны да д'ябла. Усе на роце аўтаматчыкаў выязджаюць. У мяне галава не затычка. Як-ніяк жыць хочацца.

Ён ускочыў, адышоўся вышай і сеў на накапаную зямлю тварам да вёскі. Пэўна, з вышыні заўважылі нейкі рух тут, і кароткая кулямётная чарга пранізала паветра над самымі іх галовамі; на тым баку рова з кручы пасыпалася жарства. Грэчка, спахапіўшыся, упаў на бок, Клімаў сеў ніжэй. Чарга змоўкла. Настала няёмкая для абодвух паўза. Клімаў пазіраў кудысь на пагоркі па той бок рова. Яршыстая ўпартасць Грэчкі яго не здзівіла. Гэты малодшы лейтэнант быў самы трудны з усіх узводных у роце, Клімаў ведаў яго яшчэ з фарміроўкі, пазнаёміўшыся, калі яшчэ сам быў камандзірам узвода. Стаўшы ротным і не раз сутыкнуўшыся з ім, лейтэнант адчуў, што найлепшае, што можна супрацьпаставіць яго ўпартасці, гэта неаслабная суровая цвёрдасць. Вядома, ён мог бы і проста загадваць, не дапускаючы абмеркавання, але таго не хацеў, бо ўсё ж як-ніяк яны былі знаёмыя, свае хлопцы, і думалася, што можна абысціся без гэтага, па-сяброўску.

— Паспрабуем ад лесу, — сказаў ён, коратка зірнуўшы на ўзводнага. — Там шпокаўка не дастане. Ад вёскі ёй не відно. Праўда, так будзе далей. За адзін брасок не адолееш. Але паспрабуем.

Грэчка стаў на калені і рэзкімі нярвовымі рухамі ўздзеў у рукавы ватоўку. Твар яго гарэў ад абурэння і нязгоды, светлыя вочы пад белымі брывамі зыркалі халодным агнём.

— Так дапрабуешся, што ў роце нікога не застанецца. Людзей па-дурному нішчыць. Брухамі глыжы церці. Да дурыкаў надакучыла гэта. Ісці дык ісці. А то туды, як чарвякі, а адтуль, як зайцы, — бурчэў ён, не пазіраючы на камандзіра. І раптам загаварыў гучна і рэзка:

— Зноў жа патронаў няма. З чым ісці? Па тры абоймы на вінтоўку. Аўтаматных па жмені.

— У Сахно вунь па адной засталося.

— Мне Сахно не ўказ. Хай аб тым у самога галава баліць. І што ты не растлумачыш капэ? — так ён зваў камандзіра палка.

— Ты кулямёт збераж, — казаў Клімаў сваё. — Апошні застаўся. Дыскі з чатыры збяры для яго.

— Што ты яму не ўтлумачыш, кажу? Дрэйфіш? Ты яшчэ яго не ведаеш: паддасіся, дык ён цябе заганяе. Дай я з ім пагавару. Я ў яго артпадрыхтоўкі патрабую…

Грэчка раптам ускочыў з гліны і [падаўся] да бруствера за аўтаматам. Клімаў крыва ўсміхнуўся аднымі вуснамі.

— Што тлумачыць? Усё растлумачыў.



Працяг на стар. 18 (6) »

Жалезны камандзір

« Працяг. Пачатак на стар. 16 (4)



Грэчка спынілася на схіле.

— Ну?

— Ну і ну. Загадаў атакаваць.

Малодшы лейтэнант плюнуў і вяла апусціўся на зямлю. Памаўчалі. Пасля ўзводны насцярожана зірнуў убок цераз голаў Клімава.

— Сібірачка чэша, — зусім другім тонам — сцішана і без следу злосці сказаў ён. Клімаў таксама азірнуўся і паспешліва захінуў падраныя полы паўшубка. Унізе ўздоўж ручая торапка ішла сюды Паша.

Абодва камандзіры некалькі часу глядзелі ўніз на кароценькую дзявочую постаць у падрэзаным і туга падпярэзаным дзягай шынялі, касцы, непамерна вялікай на яе галаве. Паша была тоўсценькая, з празмерна поўнымі сцёгнамі; пераскокваючы рытвіны і камяні, яна няспрытна закідвала ў бакі ногі і размахвала аднае рукой, прытрымліваючы другой на баку сваю таўшчэзную санінструктарскую сумку. Лейтэнанты змоўклі, назіраючы, як дзяўчына ўскарабкваецца па крутым адхоне, як, узлезшы, папраўляе споўзлую на лоб каску і расслабленым зморaным крокам падыходзіць да іх. Яе шырокі, быццам расплюснуты твар, як заўжды ззяў здаровай маладой чырванню, адзінай адзнакай дзявочага хараства, якім так скупа надзяліла прырода гэту дзяўчыну.

Яна падышла да Клімава.

— Вы мяне шукалі?

Клімаў, зірнуўшы на яе, апатычна адвёў позірк.

— Я не шукаў.

Паша ссунула наперад сумку і стомлена апусцілася побач.

— А я з раненымі завазілася. Пакуль пасцягвала... Ой, і вы паранены! — спахапілася яна, убачыўшы яго парваныя полы.

— Не паранены, — няласкава адказаў Клімаў.

— Кроў жа...

— Кроў чужая. Тэлефаніста з роты сувязі...

Паша адкінулася на каленях і нахмурыла рэдкія броўкі.

— Што, памочнік смерці, многа мілёнкаў забінтавала? — грубавата запытаў у яе Грэчка. Паша ўздыхнула.

— Дванаццаць чалавек. Трое ляжаць: цяжкія. Ноччу трэба эвакуіраваць. Хайрудзінаў памёр. Толькі перавязала, гляджу, ужо ўсё. А Сокалаў на дарозе застаўся. Спачатку поўз яшчэ. Я — да яго, а яны з кулямёта. Дапаўзла — ужо гатовы.

— Сволачы, такую іх!.. — не зважаючы на прысутнасць жанчыны, салёна вылаяўся Грэчка. Паша заламала бровы і пачала скубсці з долу сухую леташнюю траву. Вецер падхопліваў яе з апэцканых ёдам пальцаў і кружыў над ровам. На Клімавым твары пульсавалі жаўлакі.

— Значыць перавядзеш узвод на той фланг, — закалянеўшы нахмураным тварам, сказаў ён. — Праз гадзіну пачнем.

Грэчка падняўся на калені і, асабліва злы ў сваё зацятай маўклівасці, пачаў зашпільваць рамень на ватоўцы, пасля моўчкі падабраў з бруствера ППД і палез у акопчык па гранаты і сумку. Калі ён схаваўся ў зямлі, Клімаў таксама ўстаў, папраўў на плячах свае кавалерыйскія партупеі і пачаў торапка збягаць уніз. За ім з асцярогай, рызыкуючы ўпасці, пайшла Паша.

За некалькі хвілін да атакі ён ляжаў на краі абрыву і пазіраў у канец рова пад лес, дзе Грэчка павінен быў падаць умоўны сігнал аб гатоўнасці яго ўзвода. Ззаду ў двух кроках ад яго, саставіўшы з кручы ногі, сядзела Паша і па свайму звычаю калупала шчэпкай зямлю.

Ішлі апошнія хвіліны цішыні, хутка, ведаў ён, яна знікне, на тысячы асколкаў расколецца громамі бою, небяспекі, і тысячы смерцяў пачнуць слепа сцябаць зямлю ў пошуках гэтых трыццаці шасці жыццяў, якія замерлі, стаіліся і нацэліліся цяпер на вышыню.

— Віця! Ну што, табе абавязкова весці ўзвод? Табе ж ротай камандаваць трэба. Можна б і не лезці на самы ражон — кулямёты ж, яны па ланцугу б'юць.

За ровам да пары свайго часу бруяў наліты вясновымі сокамі лес, вытаяўшы з-пад снегу, ажывала гатовая да сваёй адвечнае справы зямля. З кожным днём увачавідкі меншалі снегавыя лапікі — рэшткі па аўражынах, на падлесках, марнеў-падтайваў гразкі змутнелы лёд на забалацях. Ішла вясна, першая вясна вайны. Праўда, пакуль было холадна, абцяжарвалася неба ад хмар, дзьмуў, не сціхаючы, рэзкі вецер, на мёрзлым доле прабірала да дрыжыкаў. Сцюжа і смерць. Сцюжа і смерць — вось што найбольш запомнілася з гэтай цяжкай, пакутна бясконцай зімы. І разам слабенькім балючым светлячком ліпела надзея — неспатольная, пастаянная, вялікая і меншая, слабая і мацнейшая — на круты паварот да перамогі ў гэтай несціханай калатнечы людзей са злом.

— Віць, а Віць... Ты чуеш?

— Чую, ну што? — з прыкрасцю павярнуў ён галаву да дзяўчыны. Скасіўшы вочы, тая злавіла яго кароткі позірк і ўсміхнулася з затоеным сумам.

— Нічога ты не чуеш. Пра другое думаеш.

— Ладна. Чакай. Каб сігнал не прагледзець.

— Давай трошачкі адстанем. Га? Як да дарогі дабяруцца, тады пойдзем, — з болем і сумам, не верачы ў тое, што яе паслухаюць, гаварыла Паша. Клімаў прыўзняў галаву.

— А ну паглядзі туды. Не махае?

Яны абодва ўглядзеліся ў канец рова, над якім залеглі, ужо не акапваючыся, аўтаматчыкі трэцяга ўзвода. Відаць было, як там нехта перабягаў ад аднаго байца да другога, пасля нехта з абрыву спускаўся ўніз. Не, сігналаў адтуль пакуль не давалі.

І будзе сонца на зямлі, і згіне сцюжа, і заззяе шчасце перамогі, і знікне з зямлі крывавая чума — фашызм. Толькі той час ужо не для іх. Вельмі мудрона выжыць у такой вайне, у такой пякельнай віхуры смерцяў — так мудра, што і не варта дбаць аб тым — дарма і недарэчна. Гэтую ісціну Клімаў усвоіў даўно — іншай у яго не было. А была толькі справа кожнага дня і задачы, якія трэба было выконваць, было начальства і немцы — яны дыктавалі, вызначалі, усё ў ягоным жыцці залежала ад іх.

— Вунь я некалі служыла ў другім батальёне. Там ротны быў Сіязаў. Дык ён усю восень з акопа пракамандаваў. Залягуць дзе байцы — адразу яму акоп. Два ардынарцы былі. Здаровыя такія дзецюкі, усё капалі, капалі, — лілася ў напружанай цішы ціхенькая, добразычлівая гаворка дзяўчыны. Клімаў, не адрываючы позірка ад Грэчкавага ўзвода, намацаў і расшпіліў на баку кабур.

— Ну і што ж гэты Сіязаў? Дзе ён?

— Цяпер няма ўжо. Пад Кашырыным забіла.

— Ну вось. А гаворыш: капалі.

— Дзівак! Дык то выпадак. Ноччу на маршы былі. За дзесяць кіламетраў ад перадавой. Самалёты бамбілі і — асколкам.

— Вось іменна.

Шэсць кулямётаў, зараджаных і нацэленых у іх, стаяць на вышыні, варушыцца дзясятак аўтаматчыкаў. Вінтоўкі. Дзесьці стаілася да часу батарэя, гатовая абрынуць на іх шрапнель. Чакаюць. Боепрыпасаў ім не шкада. У немцаў іх многа. Віхура агню і жалеза запане на гэтым касагорыстым лапіку зямлі, наўкасяк перарэзанай вузенькім, стаптаным жывёлай прасёлкам. Летась тут было збожжа, была сяўба і жніво, быў хлеб. Цяпер будзе іншае жніво без сяўбы. Трыццаць шэсць страхаў чакаюць таго — за сваё слабае, такое падаткае пад жалезам цела, такое хліпкае сваё жыццё. І для кагосьці гэта ўжо апошні ранак, апошняя пядзя жыцця, апошні рубеж яго жыццёвага шляху. Толькі для каго? — вось якім праклятым і нікім ніколі не разгаданым пытаннем мучыцца ад веку людзей вайна.

Але — трэба.

Трэба. Інакш нельга. Грукочыць, вурчыць, ірвецца ў вёсцы, джгаюць агністымі струменямі кулі, ірве цела метал. А трэба. Трэба ісці зноў туды, дзе ўжо ганялася смерць і за імі і дзе ляжаць вунь на іржышчы нерухомыя бугаркі таварышаў. Трэба.

— Ты вось што, Паша, — не паварочваючыся да дзяўчыны, сцішаным голасам сказаў Клімаў. — Ты прыйдзеш пасля. На вышыню. Цяпер пабудзь тут, з раненымі.

Паша грэбліва фыркнула, наморшчыла загнуты піпачкай носік, твар яе ад таго стаў яшчэ больш непрыгожы — дурнаваты і плаксівы.

— Во яшчэ. І не падумаю. Я ад цябе сёння не адстану.

Ён павярнуў галаву.

— Надумалася. А як жа другія? Раненыя ж будуць.

— Во я іх і дагледжу. Як вышыню возьмем. Так жа ты хацеў?

Клімаў махнуў рукой і зноў распластаўся ніц.

— З табой дагаворышся! Толькі вунь байцы глядзяць. Думаюць, да ротнага як прыліпла.

— Я не прыліпла.

Усё нішто. Усё можна стрываць. Трэба стрываць. Калі б толькі болей сілы. Болей магчымасці і болей справядлівасці. Рускі чалавек усё можа, усё ўмее, усё здолее, толькі трэба яму болей чалавечнасці ці што. Людскасці. Каб без крыку, без гарлапанства. Душэўней бы. І патронаў. І зброі болей. Тэхнікі. Дужа цяжка так: штыком і прыкладам. Перад вайной гаварылі: усё ёсць. Усіх пераможам. Любога агрэсара разаб'ём на яго ж зямлі. Варашылаў падлічваў шчыльнасць куль на кіламетр фронту, параўноўваў. У нас атрымлівалася за ўсе арміі больш. Яму апладзіравалі. Тым ганарыліся. У вучэльнях вывучалі тактыку наступлення, менш абароны. Адступаць ніхто не вучыў: у Чырвонай арміі адступленне не прадугледжвалася. Вінтоўка СВТ выдавалася за лепшую ў свеце. Аўтаматы забракавалі. На вайне за ўсё гэта расплаціліся. Тыя, хто быў не вінаўны ні ў чым. Заплацілі крывёю.

— Я не прыліпла.

— Што?

— Я не прыліпла. Калі так — то і не трэба. Я не ліпучка...

На абрыве зашуршэў глей, Клімаў азірнуўся. Паша, узмахваючы ўскінутымі рукамі, хутка, не разбіраючы шляху, збягала ўніз. Ззаду, шырока разышоўшыся ў разрэзе, хуценька матляліся полы кароценькай яе шынелкі.

— Ну і бяжы! Падумаеш!

— Устаць! Наперад!

Усё, што было дасюль — усе перажыванні, сумненні, клопаты — усё адляцела, знікла, быццам адсечанае назаўжды, засталося ў беззваротным былым. Наступіла новая часіна, пара новага быцця на страшным і няпэўным рубяжы жыцця і смерці.

Клімаў ускочыў, зірнуў у адзін бок, у другі, улавіў позіркам, як здрыгануўся нерухомы да гэтага рэдкі ланцужок яго аўтаматчыкаў і ірвануўся ў ветраную прастору поля.

Некалькі крокаў ён бег, але потым адчуў, што апярэдзіў іншых, і прытрымаў крок. Бліжэйшыя ад яго байцы ўжо ўсталі і беглі, уставалі дальнія. Густаватай купкай высыпаў зводдаль узвод Грэчкі.

Вецер шкуматаў полы паўшубка, сцябаў па твары матузамі ад шапкі, але Клімаў не прыкмячаў таго — бег. Адна толькі думка кіравала цяпер усім — хутчэй! Хутчэй, пакуль не ўдарылі немцы, пакуль ціха, прабегчы б лішні хоць дзясятак метраў да гэтай вышыні, куды — ведаў ён — шлях вось-вось абарвецца мукай і потам. Кожная часцачка ягонага цела сціскалася, напружылася і чакала гэтага гатовага вось-вось грымнуць удару.

— Шась, шась... шась, шась, — мялі струхлелы іржэўнік боты, валёнкі, гамашы з абмоткамі, калязныя англійскія бацінкі, тупацелі трыццаць шэсць пар ног. Клімаў ужо ўвесь да самых пят выбег на адкрытае, убачыў перакапаную траншэяй вышыню — усю, ад лесу да пакатага схілу ў вёску, згледзеў, як матлянуліся там у бакі пляскатыя каскі, і ў той час вецер данёс слабы далёкі крык:

— Фойе...

Канец яго пакрыўся трэскатам дзясяткаў ствалоў.

— Нічога, нічога, — казаў лейтэнант, не ведаючы каму — ні то сабе, ні то каму іншаму, хоць у громе і стукатні стрэлаў і сам не пачуў сваіх слоў. Кулі густа нізалі паветра, зыкалі, вірашчэлі, на ўсе галасы скуголілі над зямлёй. Здавалася, нейкія нябачныя рукі тузалі за нябачныя даўжэзныя струны, туга напятыя ў паднябессі.

Шквал агню з вышыні адразу прыгнуў людзей да зямлі, нехта ўжо ўпаў. Клімаў адчуў, што патрэбен рывок, інакш рота заляжа. Падхоплены ўласнай рашучасцю, ён выскачыў наперад, ускінуў угору рукі — адну з пісталетам на вузенькім раменьчыку, а другой проста кулак і, азірнуўшыся назад да сваіх, закрычаў:

— Бягом! Бягом!!!

І, не аглядваючыся больш, што было сілы пабег.

[1962?]

Радкі любові



Данута БІЧЭЛЬ

У Курапатах

Выбіраеш свой шлях? Выбірай!
З апраметнай не трапіш у рай!
З Курапатаў шлях — на той свет,
а цяпер там спраўляюць банкет.

Скачуць чэрці ў гасцях на касцях
нявінна забітых людзей...

...Жывыя за рукі трымаюць дзяцей...
Дзеці трымаюць сцяг.
Немаўляты, таму што анёлы...
тармозяць чортавы колы!

У чарцей шмат іншых хадоў —
іх машыны заводзяцца зноў...
Нібы град, арда чарцянят
на крывавых касцях Курапат.

...Беларусь у яме маўчыць...
Вам смачна жэрці і піць, —
хто святую памяць Яе
за юдаў мядзяк прадае?

...Мара, Давід і Франак,
Ян, Якуб і Сымон...
у жывым ланцугу перад ямай:
— Вымятайцеся, чэрці, вон!

На магілах не сеюць пшаніцы!?
Курапаты — дарога ў нябыт.
Крыж Хрыста па нявінна забітых
з татам уздымае Давід.

Хто скрыўдзіў мяне адну —
таго стараной абміну...

Хто зняважыў наш род і сцяг —
таму люцыфер суддзя!
За здзек над касцямі без трун —
няхай пакарае пярун!

Радкі любові

Пад збаўленчую музыку ці́шы
прачынаюся на гарышчы,
праз шчылінку месячык з неба
цалуе вуснамі таты.
Праз стрэху ляцець страшнавата...
Усё само адбудзецца неяк...

Абы Ты, мая Ластаўка ў стрэсе,
маё сунічнае ўзлессе,
Галубка мая, Свіцязянка,
аднаўлялася з ранку да ранку.

Каб Дняпра і Нёмана хвалі
з любоўю цябе цалавалі,
чыстыя хмаркі і росы
сукруху з сэрца змывалі.

Радзіма, на мапе нябёсаў
адбітак Божай далонькі.
Цень ад далонькі Божай
на мапе зямелькі босай...

Заполле

Светлай памяці Алеся Зайкі

Я думала: наша Заполле
ад Ліды да Косава,
там канюшыну косяць
літоўкамі-косамі,
каб не параніць пчолак...
А сябра Алесь Зайка
заблукаўся паміж вясёлак...

Прачынаецца ў паднябессі,
на крылцах школьных анёлаў,
у горы палескай сям'і,
у смутку духоўнай радні...
У памяці тэлефона
шчэ захаваўся Ваш голас...
Вы адгукаліся зрэдку...

Таму і прашу:
— Пазвані!

Пазваніце мне з таго свету,
сябра Алесь Зайка!
Як там на Божай градцы
зернем сябе пасеялі?
Няўжо і там мы заціснуты
між Польшчаю і Расеяй?
— Яны думаюць, што мы
ўгнаенне,
але мы тут насенне!

Пакуль не памерлі словы
ў агародах вясковых,
пакуль жыву, буду памятаць
Ваш голас, бадзёры самы:
— Калі ёсць рай на небе,
то насельнікі яго — нашы мамы.

Як збіралі Вы тут,
як выцягвалі з багны на груд,
абціраючы бруд,
моўны скарб, гэты цуд,
што бабулі пакінулі нам, —
так збірайце і там
непамерлыя словы,
і замест тэлеграм,
там, пры Богу, прыдумайце спосаб,
як вярнуць нашу мову адтуль.

Натхненне

З рэўнасці, па маладосці,
нехта некаму пазайздросціў...
Злосная, як запалак,
распаліла пажар ад сварак.

Вось такое здарэнне...

На прымірэнне
яна пасылае яго
на бязлюдную выспу...
Ён павінен сваё натхненне
на выспе на досвітку высыпаць...
І каб ніхто не ўбачыў...

А Паэт усё перайначыў!
Захацеў так жыць,
каб натхненне
не з'яўлялася на імгненне,
а пасялілася ў сэрцы
ад нараджэння да смерці,
і без перасялення
заняло ўсяго сэрца абшар...
І няхай там палае пажар!

Так навучыцца трываць,
усё па-свойму мяняць,
і кожнае імгненне мяняцца,
ёй, адзінай, жыццё аддаць,
нікому больш не здавацца.

Экспромт пасля кароткага сну

Ва ўсіх вялікіх хаты спалілі.
Залічаю сама сябе да вялікіх...

Мама, тата, вы ў маім сне,
падобныя да спарыша...
Спынены час глыбока на дне,
і вечная з пяткаў душа...

Прыходзіце сном
з няспаленай хаты,
знікаеце зноў
за свае небагляды...
і анігадкі...
Болей наш кроцік не поле
вольныя градкі.

Высахлі ў лесе суніцы...
Мама, тата,
не ўздумайце мне не сніцца...
Не шкадуйце вы мае вочы,
няхай плачуць...
Не шкадуйце вы маё сэрца,
няхай б'ецца!



Фота radzima.org

Галіне Скарына,

сяброўцы Ніны Мацяш

Белым кветам адзета каліна...
У Белым возеры белы глей.
Унучка Францішка Скарыны Галіна
з продкам святкуе свой юбілей.

У Белым моры ёсць цёмнае месца,
там гадуецца зграя гадзюк.
Гады, чуеце добрае сэрца
і пяшчоту Галініных рук?!

Нават смутак з'яўляцца рэдка
паміж светлых хвілін пачуцця.
На руках у Галіны — паэтка,
усё жыццё, як малое дзіця.

Адбалеліся слоўцы Нініны...
Хвалі, воблакі, белы птах...
А нашчадкі Францішка Скарыны
прадаўжаюць Скарынаў шлях!

Алег Лойка

Прафесар юнацкіх душаў!
Калі гора прымусіла ампутаваць нагу,
ніхто з яго вучняў не адгукнуўся
забытым словам:
— Дапамагу!

Паслухалі, выйшлі — жывуць, як чужыя...
Дýшы да ўлады чужой перашылі...
А ён, стваральнік самабытнай
культуры, —
ад чэрствай, непрамакальнай скульптуры,
ад тых, каму розум і сэрца аддаў, —
у Слонім, як сам ад сябе, уцякаў...

Уцякаць гэтак страшна...
А, можа, не страшна?
Да Бога, вечнага, ад сябе, учарашняга...
хто мог залічыць у студэнты кожнага,
таленавітага, пустапарожняга,
кожнаму ўкласці ведаў, як лёду...
мудрасці кніжнай, Лойкавай логікі.

Калі патрэбны рукі і сродкі,
чым заняты былі сябры-аднагодкі?
Ніхто на руках яго не паднёс,
як падносіў бязногіх Хрыстос...

Ён вучыў лётаць адкрыта і ўпотай...
ды ніхто, між будзённых спраў,
крылаў Ікаравых не змайстраваў.
Не падставіў плячо, не падаў руку
з удзячнасці за навуку...

А прыйшла да Лойкі жанчына —
яна не ведала, кім быў Скарына...
Калі тонеш, хапаешся за саломінку.
Лойка прыдумаў,
што любіць простую слонімку...

Кнігі, узоры, прасторы... музыка...
Лойка навучыўся падаць на муліцах
перад тым, невідочным, выраем,
у які паляцеў... і вынырнуў
на святло — і вярнуўся вуліцай...

Шлях, дарога, сцяжына, лаз...
Бессмяроцце. Покуць. Імжа.
Дыхнуў — сарваўся ў экстаз.
Жыве Беларусь! — і жыве душа!

Самабічаванне

Каб абмануць сваё гора,
сэрца Маці-Радзімы вырвалі,
апрануліся ў скуры ворагаў,
пераліліся ў іх і загінулі...

Беларусь — няволі Краіна.
Каб жыць тут, трэба загінуць.
Беларусь — чужых войнаў дарога...
Каб жыць, трэба трапіць да Бога.

З нас усе прывыклі смяяцца.
Нас яшчэ не б'юць, мы хаваемся.
Тут каб жывымі застацца,
адразу падпісвай капітуляцыю.

Але моцныя мы, арэшкі,
вяртаемся ройна ў свой вулей,
таму, што ўсе грэблі, сумежкі
пераплаканыя матулямі...

Зязюля крыжыкам вышывае
меткі, у якіх гняздзечках хавае
сваіх нявылупленых птушанят...
Яшчэ нас, такіх, шмат...

Маналог уладаркі склепу

У склепе мяне нарадзіла мама,
склеп мой на два паверхі.
Першы паверх — глыбокая яма,
другі — страха ў паднябессі.
Усе мае смуткі, згрызоты, цярпенні
праходзілі ў тым скляпенні.
Дажджу і аблокаў песні —
ў салодкім водары плесені.
Мяне называлі Стракозкай,
Склепкай, Саломінкай боскай.
Паілі мяне, як цялятка, з соскі
па чарзе шкадавальніцы з вёскі.

Былі ў мяне два таты,
ды яны аб гэтым не ведалі.
На хутары жыў дзед барадаты,
мяне туды «замуж выдалі...».
Калі я за дзеда замуж выходзіла,
было мне пяць годзікаў...
Мой жаніх-дзядуля быў добры:
карміў аладкамі з мёдзікам,
сунічкамі і сырадоем...
Падараваў мне кужэльную світку,
спёк на лісцейку ў печы духмяны хлеб...
Аднойчы перастаў дыхаць на досвітку.
Я ўцякла і схавалася ў склеп.

Шмат сірочых прайшла асяродкаў.
Ва ўнівер прынялі мяне, як сіротку.
Я працавала пісаркай і пісацелькай,
і настаўніцай, і выхавацелькай,
і уніяткай, і катэхеткай,
і прыбірачкай, і дармаедкай...
У хоры спявала святыя песні.
Па першай групе далі мне пенсію...

Калі мамы не стала,
брат не пускае ў склеп...
Кажа:
— Пайшла ты
на ўсе чатыры... у стэп!

...У склепе найлепей...
Калі тушацца ў вёсцы агні,
Рыцар збройны на белым кані
з мечам і тарчай
штовечар ад месяца скача...
І няхай сабе конь-агонь
ранкам ператворыцца ў клячу,
якая траву каля склепу скубае, —
мне ўсё роўна добра, я плачу.
Мне гэтага шчасця хапае!

Школа танцаў



Уладзімір НЯКЛЯЕЎ

Слаўнае мора, свяшчэнны байкал

—Ты на Байкале быў? — спытаў Срабрэц. — На баркасе плаваў?..

Яны пілі гарэлку «Руслан» і запівалі падобным на кока-колу і на колішняе савецкае сітро газаваным напоем «Байкал», таму Срабрэц і спытаў: «Ты на Байкале быў?..».

Перад тым яны сядзелі і гаварылі пра жыццё. Яны й сышліся, каб пасядзець і пагаварыць пра жыццё, але пасля забыліся і напіліся.

Чэрня паспрабаваў успомніць, ці быў ён на Байкале. Па ўспамінах, нейкіх цьмяных, выходзіла, што не быў.

І на баркасе не плаваў. Ён нават не ведаў, што такое баркас. Човен нейкі, але які?

— Не быў...

— Дык запрашаю!

Яны пачыналі ўжо трэцяю пляшку — і Чэрня не здзівіўся.

— Калі?

— Сёння. Чаго цягнуць?

— Цягнуць няма чаго, — згадзіўся Чэрня. — Ката за хвост.

Кот Бонус ляжаў на стале паміж пляшкай з «Русланам» і бутэлькай з «Байкалам», слухаючы размову, якая нарэшце падалася яму цікавай, і кот паглядзеў на гаспадара ўхвальна: «Малайчына! Чаго цягнуць?..».

— Тады грошы патрэбныя, — сказаў Срабрэц. — На самалёт. Цягніком доўга.

Чэрня згодна кіўнуў. Цягніком, канешне, даўгавата. Дзе той Байкал? Ён і за савецкім часам быў не блізка, а цяпер...

— Толькі ты, Талян, скажы, — паспрабаваў ён перад тым, як рушыць на Байкал, вярнуцца да размовы пра жыццё, — я хіба вінаваты? Працую дзень і ноч, дзень і ноч гарбачуся, а яна...

— Не ві-на-ва-ты ты, Ві-цёк, — сціснуў яму галаву і пацалаваў у лоб Срабрэц. — І я не ві-на-ва-ты! Гарбачуся, працую дзень і ноч, а яна... Грошы патрэбныя.

Грошы, сем тысяч даляраў, назбіраныя за дзесяць гадоў жыцця на машыну, ляжалі ў спальні пад матрацам, так што з грашыма праблемы не было. Праблема была з жыццём — і яна не вырашалася. Гаварылі пра яе, гаварылі — і без толку.

Чэрня схадзіў у спальню і выцягнуў з-пад матраца, на якім спаў, грошы. Жонка думала, што ён ніколі не здагадаецца, на чым спіць. Ён бы, можа, і не здагадаўся, не дадумаўся, тым больш, што думаць не было для чаго, прапіваць грошы ён не збіраўся, але аднойчы перавярнуў матрац, бо нешта пад бокам замуліла, а там яны, у старых жончыны калготкі закручаныя, ляжаць. І ён ніводнага даляра не спёр — да сённяшняга дня, калі яны ў дарогу спатрэбіліся. Спачатку ён хацеў узяць палову, але прыкінуў, якая яна, дарога да Байкала — і ўзяў усе.

Закаркаваўшы пачатую пляшку і сабраўшы закуску, яны замовілі таксоўку.

Калі выходзілі з кватэры, Бонус заматляў хвастом, замяўкаў, закруціўся ў нагах гаспадара.

— На Байкал хоча, — паспрабаваў адчапіцца ад ката Чэрня, але кот не адчапляўся, і яны ўзялі яго з сабой. У Бонуса была свая, сплеценая з лазы хатка, у якую гэтым разам ён сам залез, хоць звычайна, калі трэба было некуды яго везці, усімі лапамі ўпіраўся.

— Омуля лавіць будзе, — зачыніў Бонуса ў хатцы гаспадар. — На Байкале рыба омуль.

Таксіст, у адрозненне ад ката, на Байкал ехаць не захацеў — і Срабрэц махнуў рукой:

— Тады ў аэрапорт!

Ужо цямнела, трэба было паспець хоць на апошні рэйс.

— Па-мойму, на Байкал ад нас не лятаюць... — паспрабаваў спыніць іх таксіст, убачыўшы, што грошы з іх можна стрэсці, далёка не едучы. — Лятаюць з Масквы.

— Тады ў Маскву! — сказаў Чэрня, але Срабрэц з таксістам не згадзіўся:

— І з Масквы, і ад нас... На Байкал лятаюць адусюль.

Таксіст уключыў лічыльнік.

— Ну, глядзіце... Адусюль дык адусюль, лятаюць дык лятаюць. Толькі плацім наперад.

Чэрня сунуў яму пачак:

— На!..

Пакуль ехалі ў аэрапорт, Чэрня глядзеў, як скакалі на лічыльніку, светлякамі мітусіліся, няўмольна павялічваючыся, лічбы, — і нешта яму гэта нагадвала, але што?..

Жыццё?..

Рыжая лярва ў касе аэрапорта прадаць ім тры квіткі да Байкала, два чалавечых і адзін каціны, не захацела, а калі Срабрэц сказаў ёй, што яна рыжая лярва, выклікала міліцыю.

— На Байкал, значыць, сабраліся? — знайшоўшы ў іх амаль сем тысяч даляраў, дапытваўся ў пастарунку малады, але ўжо палыселы капітан. — А гэта адкуль?..

— На Байкал, капітан, — адказаў на першую частку пытання Срабрэц, бо таго, як Чэрня даставаў з-пад матраца грошы, не бачыў, і сказаць, адкуль яны, не мог. — Ты быў на Байкале?

— Ты мне не тыкай! — адсек усялякае панібрацва капітан, з нечаканай тугой падумаўшы, што не: не быў ён на Байкале. Спачатку ў простай школе вучыўся, пасля ў школе міліцыі, а на Байкале не быў.

— Адкуль грошы? — затармасіў ён Чэрню, які ў цёплым пастарунку прыснуў і не хацеў прачынацца: яму сніўся Байкал і баркас на Байкале. А, можа, гэта быў і не баркас, хто яго ведае, але Чэрня думаў у сне, што гэта баркас — і баркас яму сніўся. Далёкі баркас з белым ветразем.

— І дзе вы ката ўзялі, начорта вам кот на Байкале?

Навошта ім кот, Срабрэц не ведаў. Забыўся, што омуля лавіць. А Чэрня не забыўся: бачыў Бонуса на баркасе, чорны кот здалёк віднеўся на тле белага ветразя. Адзін кот бачыўся, болей на баркасе не было нікога, і Чэрня не мог уцяміць, дзе яны, ён і Срабрэц, падзеліся?..

У камеры Срабрэц паспрабаваў заспяваць «Слаўнае мора, свяшчэнны Байкал...», і Чэрня заспяваць паспрабаваў, але песня не пайшла — і яны заснулі.

— Грошы адкуль? — зноў прычапіўся з раніцы капітан, і Чэрня ўспомніў, што грошы гэтыя ён зарабіў, працуючы на маторным заводзе нарміроўшчыкам.

Капітан не паверыў, уперыўся ў вочы:

— Сем тысяч на заводзе?..

— Дык за дзесяць год...

— І што: на заводах яшчэ ёсць нарміроўшчыкі?

— Ёсць... — разгублена не зразумеў яго Чэрня. — Як гэта нарміроўшчыкаў можа не быць?..

— А так! — пляснуў па стале капітан. — Таго, чаго няма, значна больш за тое, што ёсць.

Сказаў нешта такое... Філосаф нейкі гэты капітан...

— Дзе яны пяцьсот даляраў падзелі? — падазрона пыталася ў капітана Марына, Чэрніна жонка, якая была медсястрой і палюбоўніцай галоўнага ўрача шпіталя, у якім была медсястрой, і таму ў ноч, калі муж забраў грошы і на Байкал сабраўся, дзяжурыла. — Не маглі ж яны прапіць пяцьсот даляраў? — налягала яна на капітана, і той ужо шкадаваў, што не паслухаў яе мужа, які, пад раніцу працверазеўшы, прасіў выпісаць любы штраф, толькі не выклікаць жонку, бо мала тады не будзе і яму, і капітану, але ж трэба было пераканацца, што грошы гэтыя мужыкі не ўкралі.

— Я прэзідэнту на вас напішу! Нават ката не папаілі, замучылі, злодзеі, звяры!

Чэрня вінавата глядзеў на капітана: «Я ж прасіў цябе, я ж табе казаў...» — а Срабрэц радаваўся, што, дзякуй Богу, Чэрня, а не ён, ажаніўся з Марынай, іх колішняй аднакласніцай, але ж потым ажаніўся і ён, хоць і не з Марынай і нават не з аднакласніцай, але якая розніца, калі ажаніўся — лепш бы яшчэ тады, дваццаць гадоў таму, на Байкал паехаў.

Капітан дастаў сподак з падрапанай шафы і наліў Бонусу вады... Яны глядзелі, як кот сасмягла, захлёбваючыся, лыктаў, і Чэрня са Срабрацом усё менш разумелі, куды гэта яны ўчора сабраліся, а капітан, дыктуючы Марыне распіску: «Я, грамадзянка такая... грошы ў суме...» — прыкідваў, што яму рабіць пасля дзяжурства, да Марыны... таксама, дарэчы, Марына... адскочыць, ці ехаць адразу дахаты, і раптам падумаў, ката пагладзіўшы, што ў сподку вада, мусібыць, гэткая самая, як і ў Байкале.

28.02.2010, Мінск



Фота klike.net

Школа танцаў

Галіна Язэпаўна памерла ў цягніку Мінск—Мурманск. У чацвёртым вагоне, у трэцім купэ на ніжнім дзявятым месцы.

Ёй у Мурманск не трэба было. Не было да каго. Проста яна любіла ездзіць у цягніках — і пад канец свайго зямнога шляху вырашыла выбрацца ў апошнюю вандроўку. У самую далёкую, у якую можна выбрацца з Мінска без перасадак. Галіна Язэпаўна не любіла перасадак, бо заўсёды губляла на іх ці валізы, ці дакументы, ці грошы.

Перад гэтым гадоў пяць яна моцна хварэла, амаль не магла рухацца і рабіла вось што. Купляла да першай станцыі, Маладзечна ці Барысава, самы танны квіток, заходзіла ў вагон, як толькі абвяшчалася пасадка, даставала мяшэчак з ядой: яйкі, соль, памідор з гурком, — раскладвала ўсё на сурвэтцы і замаўляла гарбату. Праваднікі звычайна пачыналі лаяцца: «Яшчэ цягнік не рушыў! Якая гарбата!» — але кожны раз Галіна Язэпаўна кожнага з іх неяк угаворвала, сядала і ела, з асалодай частуючыся вагоннай гарбатай. У тонкай шклянцы, у бліскучым — пад срэбра — падшкляннічку. Вось дзеля гэтага рытуала яна і квіток купляла, і ў цягнік сядала. Калі да адыходу цягніка заставаліся хвіліны і праваднікі пачыналі зачыняць дзверы, яна сыходзіла на перон і доўга глядзела ўслед апошняму вагону.

У яе не было нікога ні ў Барысаве, ні ў Маладзечне. Нідзе ў яе нікога не было. Апроч, можа быць, мяне. Хоць сказаць, што я ў яе быў, можна хіба з нацяжкай. Так, завітаў іншым разам, дапамагаў ёй да цягніка дайсці, чакаў, пакуль яна вып’е сваю вагонную гарбату — і праводзіў дадому. Праз гэта яе новы сусед, адстаўны палкоўнік, які пасяліўся праз сцяну, напісаў у міліцыю, што я хачу грамадзянку Г. Я. Бельвядэрскую нейкім чынам звесці са свету і ўсяліцца ў яе кватэру.

— Бельвядэрская... — грацыёзна падавала ў свае семдзесят гадоў руку для пацалунка Галіна Язэпаўна, і ўсім здавалася прозвішча гэтае аднекуль знаёмым, знакамітым, кожны недзе яго чуў, хоць і даўно. А Галіна Язэпаўна, як яна казала, сама сабе яго прыдумала, калі была акторкай і мела такога наменклатурнага палюбоўніка, які ўпісаў гэтае прыдуманае ёй прозвішча ў яе сапраўдны пашпарт. За гэта яна кахала таго наменклатуршчыка даўжэй, чым іншых, нават нарадзіла ад яго дзіця, якое памерла ў радзільні, і больш Галіна Язэпаўна нарадзіць не магла.

Дзіця тое, дзяўчынка, пражыло ўсяго некалькі гадзін, але Галіна Язэпаўна паспела даць свайму дзіцяці імя — і пасля ўспаміналa: «Гэта было тады, калі Бог даў мне і Бог забраў у мяне маю радасць, маё шчасце, маё жыццё, маю Кардэлію...». Галіна Язэпаўна ў той час, калі ў яе нарадзілася і памерла дзіця, марыла сыграць ролю дачкі караля Ліра ў драме Шэкспіра, але мара тая памерла таксама. Увогуле ў жыцці Галіны Язэпаўны было шмат смерцяў — і калі б не радасць ад паездак у цягніках, ад яды ў купэ і вагоннай гарбаты, дык яна б і не ведала, што ў гэтым жыцці ёсць такога, каб яго любіць. Не любіць жа ёй жыццё за тое, што пад канец яго да яе прысуседзіўся адстаўны палкоўнік. «Раней я, — спрабаваў жартаваць палкоўнік, — прысуседзіцца не мог. А цяпер магу, дык чаму не прысуседзіцца?..».

Яна яго, палкоўніка, не трывала. І ўсяляк тое паказвала. А ён да яе заляцаўся. І таксама ўсяляк тое паказваў. Заходзіў, газеты прыносіў, абвёўшы нешта ў іх чырвоным фламастарам. «Прачытайце, тут цікава...» Што можа быць у газетах цікавага? Галіна Язэпаўна драла іх — і яе котка ў тое ашмоцце свае лайнешкі заграбала, а палкоўнік газеты насіў і насіў.

Вось котку Фурцу (названую так, бо міністрам савецкай культуры, а значыць, і начальніцай над усімі тэатрамі была ў той час жанчына з прозвішчам Фурцава) Галіна Язэпаўна любіла. Але і котка Фурца памерла, а пасля памерла і Фурцава, якая была міністрам.

Ад чаго я весялюся?
Я на Фурцавай жанюся!
Буду мацаць цыцкі я
Самыя марксіцкія!

— праспяваў прыпеўку, прыйшоўшы да Галіны Язэпаўны з газетамі і хатняй вішнёўкай, адстаўны палкоўнік, і яна вішнёўку выпіла, бо любіла вішнёўку, а палкоўніка, хоць той і прыпеўку праспяваў, пратурыла, бо не любіла.

Адбылося ўсё гэта пры мне. Прычым, я застаўся ў кватэры, а палкоўнік — не, дык ён і напісаў у міліцыю, што я збіраюся ягоную суседку звесці са свету, спойваючы яе самаробнымі, небяспечнымі для жыцця напоямі.

«Гадзюган!» — сказала пра адстаўнога палкоўніка Галіна Язэпаўна і наліла вады на ганак. Палкоўнік уставаў раней за ўсіх у доме, дзе яны жылі, і выходзіў у двор прысядаць. Трымаць форму, бо раптам з Галінай Язэпаўнай ажаніцца выпадзе. Была зіма, палкоўнік паслізнуўся на лёдзе, зламаў, грымнуўшыся з ганку, нагу ў сцягне — і насіць газеты Галіне Язэпаўне не мог. Ужо не кажучы пра тое, каб з ёй ажаніцца. А тым больш — пражыць мядовы месяц у цягніку. Яна кажа, што пражыла некалі свой месяц мядовы ў цягніку, наўмысна дзеля гэтага выйшаўшы замуж. Але не кажа, за каго...

Я ў цягніку з Галінай Язэпаўнай і пазнаёміўся, калі ехаў з Мінска ў Талін. Быў некалі такі фірменны цягнік, «Чайка» называўся. Мяне здзівіла жанчына, якая, як толькі ўвайшла ў вагон, расклала яду на сурвэтцы і запатрабавала гарбаты.

— Хочаце?.. — працягнула яна мне пабітае, у смятку зваранае яйка, з якога выцякаў жаўток, які запляміў ёй спадніцу. Я падаў ёй насоўку, яна выцерла пляму і схавала насоўку ў сумачку, як сваю.

— Пральную машыну купіла, але ж не падключаць машыну, каб насоўку папраць. Рукамі памыю. Прыдзіце — аддам.

І яна выйшла з вагона. Гэта мяне здзівіла яшчэ больш, чым тое, што яна, толькі-толькі ўвайшоўшы ў вагон, пасцяліла сурвэтку і пачала есці.

Я прыйшоў да яе, вярнуўшыся з Таліна — яна напісала адрас.

— Мне было тры гады, калі памерла маці, і трынаццаць, калі мяне знайшоў у чужых, зусім чужых людзей бацька. Той дзень, калі ён знайшоў і павёз мяне дахаты, быў самым шчаслівым днём у маім жыцці. У вас жывая маці? І бацька ёсць?.. Тады вы ўявіць сабе не можаце, што значыць быць круглай сіратой — і раптам займець бацьку. Мы селі ў цягнік, бацька адразу спытаў: ты галодная? Канешне, я была галодная, як сірата можа быць сытай? Вы не сірата, вы гэтага не ведаеце. Калі б вы былі сіратой, вы б маглі палюбіць мяне як маці.

Я не мог палюбіць яе як маці. У мяне была маці, якую я любіў.

— Тады як сястру. Старэйшую...

І сястра ў мяне была... У адрозненне ад Галіны Язэпаўны, якая не мела нікога, я меў усіх: бацьку, маці, сястру, брата — і ў мяне не толькі бабуля з дзедам, а нават прадзед быў яшчэ жывы...

— Бацька разаслаў сурвэтку, паклаў на яе гуркі, яйкі, памідоры; было лета, сонца блішчала на срэбным падшклянніку, у якім праваднік прынёс тонкую, якая таксама блішчала, шклянку гарбаты — такой смачнай, якой не смакавала я раней ніколі... вы не заўважалі, што гарбата ў цягніках нейкага асаблівага смаку, нават калі праваднік запарвае самы звычайны, крамны пакецік?..

Я не заўважаў. Я шмат чаго не заўважаў да таго часу, пакуль не пазнаёміўся з Галінай Язэпаўнай, якая таксама шмат чаго не заўважала, але зусім не тое, чаго не заўважаў я.

— Скажы, дзяўчынка, гэта твой бацька на героя падобны? — спытаў вайсковец, генерал ці хто там, я не разбіраюся, які ехаў у суседнім купэ і зайшоў да нас выпіць. — Пашчасціла табе такога бацьку мець, я б таксама хацеў мець такога.

Яшчэ б не!..

Бацька пазней, калі я ўжо вырасла, прызнаўся, што дамовіўся з тым вайскоўцам за выпіўку, каб той прыйшоў і так сказаў, але якая розніца, схітраваў бацька ці не, калі ён і праўда здаваўся мне героем. Знайсці мяне ў прасторы ад Магадана да Мінска было не лягчэй, чым іголку ў сене, а ён знайшоў, пасадзіў у цягнік, адразу накарміў і павёз дахаты.

Яшчэ пазней мой бацька прызнаўся ў тым, што забіў маю маці. З пісталета ў патыліцу. Вы падумалі, што застаў яе з палюбоўнікам? Дык вось не. Гэта яна застала яго з палюбоўнікам. Ён разазлаваўся, што яна падлавіла яго — і забіў. Пасля дзесяць гадоў ён сядзеў, а я жыла сіратою.

Гэта змяніла мой лёс. Гэта ўсё нутро маё змяніла.

З таго часу бацька перастаў для мяне быць героем. Але тое, чым і як ён мяне, знайшоўшы, адразу пачаставаў, на ўсё жыццё ў мяне запала, стала маім святам. Я святкую яго так, як святкавала з бацькам. Гэта можна рабіць



у любы дзень, у які куды-небудзь адпраўляецца які-небудзь цягнік. А які-небудзь цягнік адпраўляецца куды-небудзь штодня, толькі далёка я ўжо не магу ездзіць, дый блізка цяжкавата... А так бы ў мяне кожны дзень магло быць свята. Хоць свята не адчуваеш, калі яго спраўляеш. Гэта клопат — спраўляць свята. Свята павінна быць бясклапотным. Як у нас з вамі, бо вы не адчуваеце да мяне клопату ні як да маці, ні як да сястры, ні як...

Яна не дагаварыла, як да каго яшчэ, але я зразумеў.

Я адчуваў да яе клопат. Не як да маці ці сястры, або яшчэ да каго, пра што яна не дагаварыла, але адчуваў. Бо яна нечакана стала дарагім для мяне чалавекам. Не праз дзівацтвы яе, не праз вагонную гарбату, не... Ні праз што. Так — ні праз што — кахаюць, але ж я не мог яе кахаць?

Ці мог?..

Аднойчы мы былі ў тэатры, глядзелі «Караля Ліра». Яна хадзіла толькі на спектаклі па гэтай драме Шэкспіра — больш ні на якія. Калі на сцэне з'явілася Кардэлія, Галіна Язэпаўна падалася да мяне і сціснула руку. Яна не адрывала позірку ад сцэны, уся была там, дзе наймалодшая дачка Ліра так любіла бацьку, так любіла, а ён так пакрыўдзіў яе, так пакрыўдзіў, — але як яна сціснула, як сціснула мне руку, якая хваля прайшла ад пальцаў да пляча, да сэрца, па мне ўсім — якая хваля!..

Пасля гэтага я часцяком думаў: што між намі магло быць, калі б мы спаткаліся, не разведзеныя ў часе? І чым часцей пра гэта думалася, тым больш здавалася, што час з намі абышоўся несправядліва. Як кароль Лір з Кардэліяй.

— Ведаеце, я сёння падумала, што магла б пакахаць гэтага палкоўніка, нават пражыць з ім жыццё — вось у якім я сёння стане, і вы мне патрэбныя, каб я перастала так думаць, — патэлефанавала яна мне за дзень да таго, як паехала ў Мурманск, але я не прыйшоў да яе, раптам пачуўшы, як чапляецца за падсохлы язычок яе голас у ссушаным горле — і падумаўшы: старая.

— Вам здаецца, што я старая? — спытала Галіна Язэпаўна яшчэ тады, калі я застаўся, а яна пратурыла палкоўніка, і я шчыра ўсклікнуў: «Ну што вы!..» — бо па выглядзе яна не здавалася мне старой, зусім не здавалася, а вось па голасе — за два дні да смерці — здалася, і я не прыйшоў яе суцяшаць, шкадаваць, затрымліваць, адпусціў яе ў дарогу, у якой яна памерла.

Рана ці позна маладосць становіцца бязлітаснай да старасці, рана ці позна...

Пра смерць Галіны Язэпаўны я дазнаўся ад палкоўніка, які патэлефанаваў мне і сказаў, што, збіраючыся ў Мурманск, яна жалілася на мяне — і прапанавала яму, палкоўніку, паехаць з ёй. Ён спытаў: «А да каго мы паедзем? Хто ў вас ёсць і што вам трэба ў Мурманску?» — і калі Галіна Язэпаўна адказала, што нікога ў яе ў Мурманску няма і нічога ёй там не трэба, ён упершыню заўважыў, што яна дзіўнаватая. Настолькі дзіўнаватая, што з ёй нельга ажаніцца — не для палкоўніка такая жонка.

На хаўтурах палкоўнік казаў, што суседка ягоная была незвычайная жанчына, ён усялякіх бачыў, але такіх не сустракаў — і, кажучы гэта, плакаў. Дзіўна было бачыць, як слёзы цякуць з вачэй чалавека, пра якога ты пастанавіў, што ён пень дубовы — і не можа плакаць.

— Калі я зламаў нагу, я доўга не падымаўся, бо надта балела. А Галіна Язэпаўна прыйшла мяне праведаць і ўбачыла на шафе патэфон. Стары, ад вайны яшчэ, і яна спытала: «Вы таньчыце?». Я не танцаваў ніколі, а яна зняла, на зэдаль ускочыўшы, патэфон з шафы: «Запрашаю ў школу танцаў!..». Нібы ў мяне нічога не зламанае, не баліць... І я забыўся, што яшчэ паўгадзіны таму ўстаць не мог, што ўвогуле не танцаваў ніколі — і мы танцавалі. Доўга... Потым яна пайшла, я зачыніў дзверы — і ўпаў, як толькі дзверы зачыніў, як толькі яна пайшла. Яна цуды ўмела рабіць, разумееце? І я ўцяміць не магу, як яна памерла, калі ўмела цуды рабіць? Магла б жыць... А то вунь пустая кватэра засталася — у яе ж нікога. Можна было з маёй аб'яднаць, столькі прасторы для школы танцаў...

Палкоўнік выглядаў нібы не палкоўнікам.

На дзевяць дзён я пайшоў на могілкі. Набліжаючыся, пачуў музыку: аргенцінскае танга. На грудку Галіны Язэпаўны стаяў патэфон. Круцілася кружэлка — і палкоўнік таньчыў каля магілы.

— Перастаў разумець, як жыць? Дзеля чаго?.. — казаў ён мне, калі мы там жа, на могілках, паміналі нябожчыцу. Сяду з раніцы перад акном і гляджу на вуліцу. А з вуліцы глядзіць на мяне. І ўсё... Трэба рабіць нешта. Давайце з'ездзім куды-небудзь на якім-небудзь цягніку. Раскладземся ў купэ — яйкі, гуркі... Вось так... Адразу замовім гарбату... Што яна ў гэтым знаходзіла? Трэба ўцяміць. Тады, можа, і астатняе зразумею. Паедзем? Абяцаеце?..

Я паабяцаў, але не паехаў. Куды і навошта было мне з ім ехаць?..

З часам я, мусібыць, пачаў бы забывацца на Галіну Язэпаўну. І пра тое, што яна жыла, і пра тое, што памерла. Жыццё круцілася хутчэй за кружэлку. Але забыцца на памерлую актрыку не давалі мне лісты палкоўніка, якія прыходзілі спачатку зблізку, а пасля з краёў усё больш далёкіх.

«...я прадаў кватэру, плюс пенсія — да скону павінна было хапіць, каб у цягніках пасажырам ездзіць, але адзін кемлівы праваднік, калі я распавёў яму, што да чаго, спытаў: а чаму тады не праваднікам? Усё тое самае: яйкі, гуркі, гарбата — ды яшчэ й зарплата. Я ўладкаваўся праваднікам — і адразу ўсё прапала: не тая гарбата! Ну вось тая самая — і не тая!..»

«...я спытаў яе — пасля таго вечара, калі мяне яна выгнала, а з вамі засталася, памятаеце? — ну што ўва мне не так, што кепска? Чаму вы мяне не трываеце?.. І яна сказала: «Кепска, што вы палкоўнік, які хоча быць палкоўнікам. Разумееце? Вы ўжо палкоўнік — і яшчэ хочаце ім быць...». Я сказаў, што пад пенсію хацеў стаць генералам, тады пенсія большая, дык яна засмяялася: «А гэта яшчэ горш».

«...і паступова, пацяху да мяне пачало даходзіць... карацей, без толку я ўсё ездзіў, гарбату піў — дык стоп-кран аднойчы сарваў, выскачыў з вагона і нагу зламаў, тую самую ў тым жа месцы... Ну вось чаму ў тым жа месцы тую самую?.. Мяне прывезлі ў шпіталь, загіпсавалі, а ў палацы па радыё тое самае танга. І медсястра ў палацы. Я паспрабаваў падняцца, запрасіць сястру, танцаваў жа я гэтае танга з гэтай самай паламанай нагой, але і кроку не зрабіў — другая нага падвярнулася. Вось скажыце: чаму з ёй — мог, а з медсястрой — не? Чаму я ўвогуле так жыццё апошнімі гадамі жыву, як бы з ёй гэтыя гады жыў, калі б яна не памерла. Я ведаў, як жыць, я меў лёс палкоўніка і лічыў, што гэта сур'ёзна. А яна давяла мне, што гэта смешна, і цяпер я не маю лёсу ніякага — і жыву невядома як. Ці гэта і ёсць лёс?.. Можа быць. Але ён мяне не дагоніць, не стрэліць у патыліцу».

У канверт быў укладзены фотаздымак: маладыя ў купэ вагона. Ён у вайсковай форме, яна ў фаце. Сядзяць за вагонным столікам, засцеленым дзвюма сурвэткамі.

Я не тое што не пазнаў, нават не падумаў, што гэта яна. Не падобная на Галіну Язэпаўну была нявеста. А ў вайскоўца падабенства з палкоўнікам было... Я перавярнуў фотаздымак — на звароце тым самым почыркам, што і ў лісце, было напісана: «Мядовы месяц».

Праз месяц я знайшоў у сваёй паштовай скрыні газету. Яна называлася «Крымінальны кур'ер». Не ведаю, хто тую газету мог мне ўкінуць, але... Але крымінальны рэпартаж на апошняй стронцы: «Палкоўнік застрэліўся на магіле актрысы», — быў абведзены чырвоным фламастарам.

Бомж, які начаваў на могілках, распавёў журналісту, як яно было. Палкоўнік прыйшоў уночы з патэфонам, завёў кружэлку, пачаў танцаваць, дастаў пісталет, лёг на грудок і, вывернуўшы руку, стрэліў сабе ў патыліцу. Танга скончылася, але кружэлка нейкі час яшчэ круцілася.

Я не ведаю, чаму так, а не інакш пражылі жыццё гэтыя людзі — і чакаю лістоў ад палкоўніка. Галіна Язэпаўна мне ніколі не пісала.

Рыгор БАРАДУЛІН
(1935—2014)

Небавы сны

Аж пакуль...

*Мінулае
Шматгулае,
А цішыня скупая.
Наступнае
Наступае —
На ўзгадкі наступае.*

*Сум радуецца рэшце
У радасці ў кішэні.
І цішынёю ўрэшце
Разменіцца цярпенне....*

*Аж покуль не значэе
слоў ранішніх значэнне.*

Радовішчы радасці

*Радовішчы радасці знайсці
Нялёгка,
Бо іх ахоўвае гора.
Жарынкі жарсці
Згараць на лісці —
На лістах, што ў заўтра
Напіша учора.*

*Радовішчы радасці, яны
Невычэрпныя,
Таму анікому
Не ўцячы ад сваёй маны,
Што разгубленасць
Верне дадому.*

*Жаху ані ў галаве,
Дзе ходзіць нявестка —
Вестка благая.
Гора ў харомах жыве.
Радасць пад зямлёй
Залягае...*

Але...

*Непрыручаных пнуцца карміць
З рукі
Усе вякі
Дарагімі прысмакамі.
Бываюць з ашыйнікамі ваўкі.
Але
Яны завуцца сабакамі...*

А там...

*Жыву не тут,
Дзе пражываю дні,
А там, дзе дні мае
Раслі са мною,
Атуленыя шчырай гаманою
Расчуленай зялёнай цішыні.*


*Імкнецца ўсё маё
Штодня туды,
Дзе зябне ў ноч завейную
Падпечнік.
Дзе Хатнік
Свой бярозавы падсвечнік
Нясе на кут,
Каб бачылі Дзяды,*

*Што ў хаце ён —
Рупліві гаспадар.
Чакае. Не спяшаецца.
Трывае.
Тут халадаецца душа жывая,
Забыць баіцца
Нетутэйшы сквар.*

*Тут мамін сум
Глядзіць яе вачыма.
Тут дні ў нябыт ідуць,
Каб па вясне
Нанова зарунець,
Але не мне,
А на мяне падобнаму,
Магчыма...*

Падзеліцца...

*Штоначы засынаем
У беспрабудным наіве,
Што неба падзеліцца з намі
Снамі сваімі.*



*А небавы сны —
Зніклыя аблачыны
Плывуць
Да ветрам акрэсленай старыны,
Да сваёй незямной айчыны...*

Маладыя дровы

*Світанне і змярканне
Хмураць бровы.
Аб лоб нябёс
Пытанне хмарай трэцца:
А можа людзі —
Маладыя дровы,
Якія вечнасць паліць,
Каб сагрэцца?..*

Родная Каменская вуліца

*Па яшчэ ацалелым бруку са мною
Ступаюць маладыя правіны.
Маркоце хапае спакою,
Пустазеллю — зямлі.
Да нябыту паварочваюцца спіною
Хаты —
Звечарэлыя дамавіны
Душаў,
Якія тут аднойчы жылі...*

Традыцыйнае

*Плыт прыстаў у прымакі
да мяжы,
І цяпер ён — плот.
Студня ў дрымотнай імжы
Пазяхае на повен рот.
Яна не паспела забыцца,
Што сястрою крыніца
была калісьці.
Вечарэе лагода.
Да мяцеліцы чорныя шчокі
гарод
Грэе азяблымі вяснушкамі
жаўталісця...*

Смелая пяшчота

*Вянкі цыбулі, як вянкі санетаў,
Сплятала мама ў чэсць
крутой зімы.
Не рассакрэчвалі сваіх сакрэтаў
Апошнія ахрыплыя грамы.
Як слёзы выкрасаць з вачэй
планетаў,
Як з мройных хмар
узводзіць церамы.
І смутны ветах ведаў
сцежкі летаў,
Якімі йшлі начлежныя дымы.
Хоць пад страхой хапала
ўсім гаркоты,
Дык каб не згловіцілі
наш нож сухоты,
Яго карміла востра,
як ён сам.
Цыбулі спелай залатыя соты
Не шкадавалі смелае пяшчоты
Ні стомленым,
ні маладым слязам.*

Чорны дзяцел

*Чорны дзяцел
У заснежаным бары
Ціха лекуе сасонку маладую.
Маладая завіруха калядуе.
У застуджаных вятроў
настрой сыры.*

*Чорны дзяцел
У наснежаным бары
Да таемнасці жывіцы дападае.
Хоць гадоў не лічыць
Скруха маладая,
Дачакалася зіма сваёй пары.*

Пра чарэнь

*І пра ката́ на каптуры
Снам на вуха
Шэпча згадка маладая.
Беспрытульнаму маўчанню
спагадае
Чорны дзяцел
У заснежаным бары...*

*Кусман сну
Вягарыць на вятры
Пыхаю парусіна.
Ціхая ласка сына —
Газаю ў ліхтары.*

*Будзеш прасіць: паўтары
Цень ад крыла жураўліны,
Дотык халоднай гліны.*

*Выраю вострыя локаць
З тога зялёны,
Калі
Ён упіраўся ў лотаць
На веснавое зямлі.*

*Вецер як гаспадар...
Дол падмяце слата.
Прагалые ліхтар
Язык дагарэлы кната.*

*Сцюжаю нагадаецца сквар.
Занядужае вечар-ліхвяр...*

*Імжа-хуткацечніца
Вечніцца...*

Не дарадца

*І маламу сучку
На крамяным ствале
Ліставейнай хапае працы.*

*Я хачу цябе з сэрца прагнаць,
Але
Сэрца — розуму не дарадца.*

*Парасчуліцца хочацца
Часам скале,
Вогнішчу з туманом пабрацца.
Думкі хочуць забыцца цябе,
Але
Напамін — забыццю не дарадца.*

*Не панура
Віну й на жалобным стале,
Не самотна віне дакарацца.
Я хачу цвярозым пабыць,
Але
Я шаленству свайму не дарадца...*

Палон

*Усе мы ў мілосці ў палоне.
І ў нашых адзіных для нас
Аблокамі пахнуць далоні,
На міг запыняецца час.*

*Да радасці ломімся ў госці,
Сячэм пад сабою сукі.
Мы ўсе ў ягамосці мілосці
Напрошаныя жабракі.*

*Пярун у раскацістым тосце,
Да зор свой паслаўшы дазор,
У гонар крыўдлівай мілосці
Падыме прадонне азёр.*

*І космас брыво небакраю
Нахмурыць, як горды сусед.
Каб выдыхнуць слова к а х а ю,
Аднойчы прыходзім на свет.*

*І слухае рэўнасць глухая,
Як блытае вернасць сляды.
Былосць звечарэла ўздыхае.
У згоды настрой малады.*

*Прачнуўшыся з зоркаю ранняй,
І цень свой не ўбачыць спакой.
Паненка знайменіцца паняй.
Мілосць не бывае ўдавой.*

*Ні кпінаў, ні позіркаў косых
Мілосць не баіцца нідзе.
Каб толькі не гнуўся той посах,
Што юнага ў сталасць вядзе.*

*Мілосць — і лагода й карыда,
Рака, дзе не спяць берагі.
І самая лютая крыўда
Ад тых, хто табе дарагі.*

*Такое надумае штосьці
Настрой, што самога сябе
Пачне раўнаваць да мілосці
Абдзелены ў шчодрай дзяльбе.*

*І моцы не хопіць зайздросці
Халоднай пабыць хоць у снах.
І вочы ў галоднай мілосці
Пазычыць баіцца манах.*

*Шануе мілосць аблачынку,
Што жарсці аценіць чало,
Каб неба здалося ў аўчынку,
З якой жыць усё пачало.*

*Мілосць — гэта шчырасць
і праца,
Акцічоны набёсамі рух.
І мусяць жывыя старацца,
Каб вечны агонь не патух!*

2007

* * *

Багата
Ў мінулым стагоддзі было:
Палдётак сподзеў,
Бацька і маці.
Ды выпала
Застудзіцца гармаце,
І ўсё
З аблачынкай дыму сплыло…

* * *

Убачыць сваю спіну
Хацелася б валуну…

* * *

Як ні напінаецца
Струна,
Не расчуліцца ніяк
Труна…

* * *

І заўтра, і сёння,
І ўвесь свой век
У самога сябе ў палоне
Жыве чалавек.
Спачатку вядома
Малому,
Як уцячы з палону.

Насуперак…

Насуперак чэрстваму суму
Канкрэтна,
А не ва ўяве
Застолле плыве ў задуму
На негабляванай лаве.
Успыхваюць суха трэскі
Зоркамі Млечнага шляху,
Не можа ўсяісны вецер
Падабраць апранаху
Голаму жаху.
Вавёрка вёрткая давярае
Свае кіпцюры сасне.
У існасці
Ўсё сябе ўспамінае
Ў задуманым сне…

2012

У неба пехатою

З незаговорлівага кірмаша,
Дзе чужыя гандляры і цэны,
Любіць беларуская Душа
Ад спакоты
Затуліцца ў цені.

Свой сакрэт у мудрага каўша,
Поўнага цудоўнага напою.
Пойдзе беларуская Душа
Да настрою ў неба пехатою.

Хопіць смаглавогнішчу сушша,
Каб абсяг не спавядаўся золі.
Бачыць беларуская Душа,
Як заўсёды рупіцца ніколі!..

2013

Сляды вады

Сляды вады
Адводзяць ад бяды.
Бяда пажаравокая
Дыміцца.
У нецярпення позірк малады.
Здалёку
Кліча рэха навальніцы.

Сляды вады,
Гадуючы гады,
Атавай смелай
Маладзяць сцяжыны.
У жарабіцы жарсці
Павады
Падраліся
Аб розбегі чужыны.

Сляды вады.
Прыстаўшы ад хады,
Вядуць у незахлын
Зліцьцё жывое.
Дыктант ад Перуна
Маланка піша,
Ды
Памылкі
Правярае ноч
Савою…

2013

Як скруху…

Колькі важыць
Сівое крыло крумкача?
Колькі цягне
Звіслая дзюба?
Адказаў бы, напэўна,
Арак з-пад карча,
Ды яму
На святле быць не люба.

Далячынь маладая
Не ўмее маніць.
Рэха шэпча
На вуха ліху.
Крумкачу сівакрыламу
Хочацца сніць.
Як скруху чорную,
Крумкачыху…

2013

* * *

Жарсць нямая.
Каханне ўзросту не мае…

Як жывы…

Вырас мярэц
З пугурка цыбатага.
Закінуў анямелую галаву
Прывітаць неба.
Рукі развёў
Адхапіць як болей жыцця,
У паветры разлітага.
Ды знянацку
Некуды галава сплыла.
Абедзьве рукі
Маланка адцяла.
Дагэтуль
Панылы крыж
Усё чакае,
Што вернецца галава
На вострую шыю.
Дзве рукі
Адрастуць учэпіста.
Хоць зноў
У цёмны холад
Не хочацца…

2013

* * *

Здаецца, ад злосці
Зайздрасць завые,
Нямогла сціскаючы кулакі.
Паважна
І помнікі, і жывыя
Парыж засяляюць
Мае землякі.

Зацятасць
Не баіцца дакораў.
Ільдзіну падпаліць
Юрлівы шал.
Ідзе з Камароўкі
Барыс Забораў
І ў небе коз
Пасвіць
Марк Шагал.

Спакоіцца рызыка
З прычыны тае,
Што неба парыжскага
На ўсіх стае…

2013

Ласыя

Ласыя да набыцця
Пад дасяжнымі кручамі,
Кватаранты жыцця,
Мы яму знадакучылі…

2013

Парада

Не спяшайся ў рай
І кумé не рай…

* * *

Як дома
Я даўно на гэтым свеце,
Не дужа-ткі
Спяшаюся на той.
Яшчэ не карты
З мёртваю вярстой,
Ні свечкі,
Што гарачаю слязой
Спакойна свецяць.
Яшчэ на гэтым свеце
Я як дома.
А як на тым,
Дагэтуль
Невядома.

2013

Ідзеш…

Хто прывязаў званец
Да рогу той,
Што ласуецца
Хрупаткой атавой?
Усё расце
У часа пад пятой.
Вітаючы дарогу
Згадкаю рухавай
Са свету гэтага
На той
Іду я ўпарта штохвіліны.
І кожны
Мазгаваць павінны,
Як ні хварэй,
Ні рухайся,
Улогам ні ляжы,
Пакуль жывеш,
Ідзеш да той мяжы,
Якая
Чакае.
Спакойнай вечнасці
Прамежак
Нам належыць.
Пазычаным жыццём
Звыкаеш зваць.
Ці ён знянацку
Можа стаць
Апошні днём.

2013

* * *

Апошні сон.
Навошта ён?

2013

Трэба!

Параіцца трэба з журбой,
Як пазнаёміць
Сябе з сабой…



Фота firestock.ru

Чысты боль

Ірыне Ржэвускай

Прыгажосць
Сама сябе баіцца.
Толькі б не ўракла
Пяшчоту злосць.
Гаспадынька
Ў беларускага здароўя
Ёсць!
Кажа кіслагубым,
Шчэразубым:
До
Ісці ў самалюбімыя.
Ці
Не лепей бачыць,
Як вожыкастае гняздо
З праменняў
Улагоджаных валасоў
Нечаканку чаканую
Зорную па-зямному
Укаранавала
Рукою слова.
І невыпадкова
Надрэчна недарэчны сум
Усур'ёз
Пакажа нос
І рыне.
А годнай,
Гонкай,
Ганаравітай спадручнай
Неадольнага жыцця
Ірыне
За чысты боль
Рупіць бяззубым хворым
Грымнуць спалоханым хорам
Дзякуй!

Неадлучны

Ценю мой,
Ты за крутой вярстой
Той,
Дзе начуе крок.
Цябе,
Хто не ведае
Анідзе
Стомы ў хадзе,
Пялегуе
Задумены змрок.
І ты ступаеш за мной,
За маёй спіной,
Як нераспаны крык,
Двайнік неадлучны.
І пакуль некалючы
Ты ў цемрадзь не знік,
Пакуль за радню
Не лічу траву —
Жыву!

2013

Нанова!

На адкрыццё курсаў
«Мова нанова»

Немінуча,
Гаюча
Нанова
Раскрываецца шчырае слова.
Мова маці —
Крыніца святая —
Да вытокаў
Намеры вяртае.
Як высокія мроі,
Аблокі
Думкі неба
Ратуюць ад спёкі.
Мы на гэтым свеце
Павінны
Гадаваць мову
Роднай Айчыны.

13 студзеня 2014 г.

Прашу…

Усятрымца ўсяісны,
Дазволь
Затрымацца на грэшнай зямлі.
Моцы дай
Вытрываць боль,
Ад якога пытанні ўзышлі.
Для чаго
Я прыйшоў
І калі
Адпусціць на волю душу,
Агарчэлую ў палыне,
Падказаць аднойчы прашу.
Хоць і не мне…

2012

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 8–9 (180–181) | 13 жніўня 2021 | № 31–33 (739–741) Новы Час

Час second-hand (канец чырвонага чалавека)

Святлана АЛЕКСІЕВІЧ



Запіскі саўдзельніка

Мы развітваемся з савецкім часам. З тым нашым жыццём. Я спрабую сумленна выслухаць усіх удзельнікаў сацыялістычнай драмы…

У камунізма быў вар'яцкі план: перарабіць «старога» чалавека, трухлявага Адама. І гэта атрымалася… можа быць, адзінае, што атрымалася. За семдзесят з лішкам гадоў у лабараторыі марксізму-ленінізму вывелі асобны чалавечы тып: «homo soveticus». Адны лічаць, што гэта трагічны персанаж, іншыя называюць яго «саўком». Мне здаецца, я ведаю гэтага чалавека, ён мне добра знаёмы, я побач з ім, плячо да пляча пражыла шмат гадоў. Ён — гэта я. Гэта мае знаёмыя, сябры, бацькі. Некалькі гадоў я ездзіла па ўсім былым Савецкім Саюзе, таму што homo soveticus — гэта не толькі рускія, але і беларусы, туркмены, украінцы, казахі… Цяпер мы жывём у розных дзяржавах, якія гавораць на розных мовах, але нас ні з кім не пераблытаеш. Пазнаеш адразу! Усе мы, людзі з сацыялізму, падобныя і не падобныя на астатніх людзей — у нас свой слоўнік, свае ўяўленні пра дабро і зло, пра герояў і пакутнікаў. У нас адмысловыя адносіны са смерцю. Увесь час у аповедах, якія я запісваю, рэжуць вуха словы: «страляць», «расстраляць», «ліквідаваць», «пусціць у расход» ці такія савецкія варыянты знікнення, як: «арышт», «дзесяць гадоў без права перапіскі», «эміграцыя». Колькі можа каштаваць чалавечае жыццё, калі мы памятаем, што нядаўна гінулі мільёны? Мы поўныя нянавісці і забабонаў. Усё адтуль, дзе быў ГУЛАГ і страшная вайна. Калектывізацыя, раскулачванне, перасяленне народаў…

Гэта быў сацыялізм, і гэта было проста наша жыццё. Тады мы мала пра яго гаварылі. А цяпер, калі свет незваротна змяніўся, усім стала цікавым тое нашае жыццё, усё роўна якім яно было, гэта было наша жыццё. Пішу, адшукваю па макулінках, па драбках гісторыю «хатняга»… «унутранага» сацыялізму. Тое, як ён жыў у чалавечай душы. Мяне заўсёды прыцягвае вось гэтая маленькая прастора — чалавек… адзін чалавек. Насамрэч там усё і адбываецца. <…>

Савецкая цывілізацыя… Спяшаюся захаваць яе сляды. Знаёмыя твары. Распытваю не пра сацыялізм, а пра каханне, рэўнасць, дзяцінства, старасць. Пра музыку, танцы, прычоскі. Пра тысячы падрабязнасцяў зніклага жыцця. Гэта адзіны спосаб загнаць катастрофу ў межы звыклага і паспрабаваць штосьці распавесці. Пра штосьці здагадацца. Не стамляюся дзівіцца таму, якое цікавае звычайнае чалавечае жыццё. Бясконцая колькасць чалавечых праўдаў… Гісторыю цікавяць толькі факты, а эмоцыі застаюцца за бортам. Іх не прынята ўпускаць у гісторыю. Я ж гляджу на свет вачыма гуманітарыя, а не гісторыка. Здзіўлена чалавекам… <…>

Гісторыя аднаго дзяцінства. Марыя Вайцяшонак, пісьменніца, 57 гадоў

– Я — асадніца. Я нарадзілася ў сям'і ссыльнага польскага афіцэра-асадніка (osadnik — па-польску «пасяленец», які атрымаў землі на Усходніх Крэсах пасля заканчэння савецка-польскай вайны ў 1921-м годзе). А ў 1939-м (сакрэтны пратакол пакта Молатава–Рыбентропа) Заходнюю Беларусь далучылі да СССР, і тысячы асаднікаў-каланістаў разам са сваімі сем'ямі былі высланы ў Сібір як «небяспечны палітычны элемент» (з цыдулкі Берыі — Сталіну). Але гэта вялікая гісторыя, а ў мяне свая… маленькая…

Не ведаю дня свайго нараджэння… і нават года… Усё ў мяне прыблізнае. Не знайшла ніякіх дакументаў. Я ёсць, і мяне няма. Не памятаю нічога і памятаю ўсё. Я думаю, што мама з'язджала цяжарная мной. Чаму? Мяне заўсёды хвалююць паравозныя гудкі… і пах шпалаў… і плач людзей на станцыях… Магу ехаць добрым, фірмовым цягніком, але прагрукоча побач таварняк, і ў мяне слёзы. Не магу бачыць вагоны для скаціны, чуць роў жывёл… Нас везлі ў гэтых вагонах. Мяне яшчэ не было. І я была. У мяне ў снах няма твараў… сюжэтаў… усе мае бачанні з гукаў… пахаў…

Алтайскі край. Горад Змеінагорск, рака Змееўка… Ссыльных згрузілі за горадам. У возера. Жыць пачалі ў зямлі. У зямлянках. Я нарадзілася пад зямлёй, вырасла там. Зямля мне з дзяцінства пахне домам. Цячэ са столі, адрываецца камяк зямлі, зваліўся і скача да мяне. Гэта — жаба. Але я маленькая, я яшчэ не ведаю, каго трэба баяцца. Сплю з дзвюма козачкамі, на цёплай падсцілцы з казінага «гарошку»… Першае слова «ме-е-е»… першыя гукі… а не «ма»… «мама». Старэйшая сястра Уладзя ўспаміналa, як я дзівілася, што козачкі не размаўляюць, як мы. Маё здзіўленне. Яны здаваліся мне роўнымі. Свет быў цэласны, непадзельны. Я і цяпер не адчуваю гэтай розніцы паміж намі, паміж людзьмі і жывёламі. Заўсёды размаўляю з імі… і яны мяне разумеюць… А жучкі, павучкі… яны таксама былі побач… такія каляровыя, такія размаляваныя жучкі. Мае цацкі. Увесну мы разам выбіраліся на сонца, поўзалі па зямлі, шукалі ежу. Грэліся. А ўзімку абміралі, як дрэвы, упадалі ў спячку ад голаду. У мяне свая школа, мяне вучылі не толькі людзі. Я чую і дрэвы, і траву. Больш за ўсё ў жыцці мне цікавыя жывёлы, сапраўды цікавыя. Як мне адлучыцца ад таго свету… ад тых пахаў… Не магу. Вось нарэшце сонца! Лета! Я — наверсе… вакол прыгажосць асляпляльная, і ніхто нікому не рыхтуе ніякай ежы. І яшчэ ўсё гучыць, усё ў фарбах. Я спрабую на смак кожную травінку, лісток… кветку… усе карэньчыкі… блёкату раз наелася, ледзь не памерла. Цэлыя карціны ў памяці… Памятаю гару «Сіняя барада» і сіняе святло на гэтай гары… асвятленне… Святло ішло менавіта з левага боку, са схілу. Ішло яно зверху ўніз… Якія гэта былі відовішчы! Баюся, што ў мяне не хопіць таленту гэта перадаць. Уваскрасіць. Словы — гэта толькі дадатак да стану. Да нашых пачуццяў. Чырвоныя макі, лілеі-саранкі, мар'ін корань… Усё гэта рассцілалася перад вачыма. Пад нагамі. Ці іншая карціна… Я сяджу поруч нейкай хаты. Па сцяне паўзе сонечная пляма… і яна розных колераў… увесь час змяняецца. Доўга-доўга сяджу на тым месцы. Калі б не гэтыя фарбы, я б, напэўна, памерла. Не выжыла. Не памятаю, што мы елі… ці была ў нас якая-небудзь чалавечая ежа…

Увечар я бачыла, як ішлі чорныя людзі. Чорныя адзенні, чорныя твары. Гэта ссыльныя вярталіся з руднікоў… яны ўсе былі падобныя на майго бацьку. Я не ведаю, ці любіў мяне бацька. Ці любіў мяне хто-небудзь?

У мяне вельмі мала ўспамінаў… Мне іх бракуе. Шукаю ў цемры, імкнуся больш адтуль выцягнуць. Рэдка… вельмі рэдка раптам штосьці ўспомніцца, чаго я не памятала. Мне горка, але я шчаслівая. Я тады страшна шчаслівая.

Нічога не магу ўспомніць пра зіму… Узімку я сядзела ў зямлянцы ўвесь дзень. Дзень быў падобны на вечар. Усё ў змярканні. Ніводнай каляровай плямы… Ці былі ў нас нейкія рэчы, акрамя місак і лыжак? Ніякай адзежы… каб штосьці з адзежы… абгортваліся нейкімі анучамі. Ніводнай каляровай плямы. Абутак… Што з абутку? Галёшы… памятаю галёшы… у мяне таксама галёшы, вялікія і старыя, як у мамы. Напэўна, маміны… Першае паліто мне выдалі ў дзіцячым доме, і першыя рукавіцы. Капялюшык. Памятаю: у цемры ледзь-ледзь бялее твар Уладзі… Цэлымі днямі яна ляжыць і кашляе, яна захварэла на рудніках, у яе сухоты. Я ўжо ведаю гэтае слова… Мама не плача… Не памятаю, каб мама плакала, яна мала гаварыла, а потым, мабыць, наогул перастала размаўляць. Калі кашаль адыходзіць, Уладзя кліча мяне: «Паўтарай за мной… Гэта — Пушкін». Я паўтараю: «Мороз и солнце, день чудесный! Еще ты дремлешь, друг прелестный!». І ўяўляю сабе зіму. Як у Пушкіна.

Я рабыня слова… я слову веру абсалютна… Заўсёды чакаю слоў ад чалавека, і ад незнаёмага чалавека таксама, ад незнаёмага нават больш чакаю. На незнаёмага чалавека яшчэ можна спадзявацца. Як быццам і самой хочацца сказаць… і я рашаюся… Гатовая. Калі я пачынаю камусьці распавядаць, потым на тым месцы, пра які я казала, я нічога ўжо не знаходжу. Там пустэча, я губляю гэтыя ўспаміны. Там імгненна — дзірка. І трэба доўга чакаць, каб яны вярнуліся. Таму я маўчу. Я ўсё апрацоўваю ў сабе. Хады, лабірынты, норкі…

Шматкі… Адкуль у мяне ўзяліся гэтыя шматкі і абрэзкі? Рознакаляровыя, шмат малінавага колеру. Хтосьці мне іх прынёс. З тых шматкоў я шыла маленькіх чалавечкаў, стрыгла сабе валасы, рабіла ім прычоскі. Гэта былі мае сяброўкі… Лялек я не бачыла, нічога не ведала пра лялькі. Жылі мы ўжо ў горадзе, але не ў доме, а ў склепе. Адно сляпое акенца. Але ў нас ужо з'явіўся адрас: вуліца Сталіна, дом сямнаццаць. Як і ў іншых… як і ва ўсіх… у нас ужо быў адрас. Там я гуляла з адной дзяўчынкай… дзяўчынка была не са склепа, а з дома. Хадзіла ў сукенках і ў чаравічках. А я — у мамчыных галёшах… Я прынесла ёй паказаць гэтыя шматкі, на вуліцы яны глядзеліся яшчэ прыгажэй, чым у склепе. Дзяўчынка пачала іх у мяне прасіць, на штосьці хацела выменяць тыя шматкі. Я — ні завошта! Прыйшоў яе тата: «Не сябруй з гэтай жабрачкай», — сказаў ён. Я зразумела, што мяне ўзялі і адсунулі. Мне трэба ціха сыйсці, хутчэй сыйсці з гэтага месца. Вядома, гэта ўжо сталыя словы, не дзіцячыя. Але пачуццё… тое пачуццё я памятаю… Табе так балюча, што ўжо няма крыўды і няма жалю да сябе, у цябе раптам многа-многа свабоды. А літасці да сябе няма… Калі літасць ёсць,

то чалавек яшчэ не так глыбока зазірнуў, ён яшчэ не сыйшоў ад людзей. А калі ён сыйшоў, людзі яму зусім не патрэбныя, яму хапае таго, што ў ім самім. Я занадта глыбока зазірнула... Мяне цяжка пакрыўдзіць. Я рэдка плачу. Мне смешныя ўсе звычайныя беды, жаночыя крыўды... Для мяне гэта шоў... шоў жыцця... Але калі я пачую, што плача дзіця... ніколі не міну жабрака... Ніколі не міну. Пах гэты я памятаю, пах бяды... Нейкія хвалі ідуць, я дагэтуль да іх падлучана. Гэта пах майго дзяцінства. Маіх пялюшак.

Я іду з Уладзяй... мы нясём пуховую хустку... Прыгожую рэч для нейкага іншага свету. Падрыхтаваная замова. Уладзя ўмела вязаць, на тыя грошы мы жылі. Жанчына разлічылася з намі, а потым кажа: «Давайце я вам нарэжу кветак». Як — нам букет? Стаім дзве папрашайкі, у нейкай мешкавіне... галодныя, халодныя... І нам — кветкі! Мы заўсёды думалі толькі пра хлеб, а гэты чалавек здагадаўся, што мы здольныя думаць яшчэ пра нешта. Ты быў замкнёны, замураваны, а табе адкрылі фортку... акно расчынілі... Аказваецца, акрамя хлеба... акрамя ежы... нам можна даць і букет кветак! Значыць, мы нічым ад іншых не адрозніваемся. Мы... такія ж... Гэта было парушэннем правілаў: «Давайце я вам нарэжу кветак». Не нарву, не збяру, а нарэжу ў сваім садзе. З гэтага моманту... Магчыма, гэта быў мой ключ... мне далі ключ... Мяне гэта перавярнула... Я памятаю той букет... вялікі букет касмей... Цяпер заўсёды іх саджаю ў сябе на дачы. (Мы сядзім якраз у яе на дачы. Растуць тут адны кветкі і дрэвы.) Я нядаўна ездзіла ў Сібір... Горад Змеінагорск... вярнулася туды... Шукала нашую вуліцу... наш дом... наш склеп... Але дома ўжо няма, дом знеслі. Ва ўсіх пытала: «А вы памятаеце?» Адзін стары ўспомніў: так, у склепе жыла прыгожая дзяўчына, яна хварэла. Людзі больш запамінаюць прыгажосць, чым пакуту. І букет нам падарылі, таму што Уладзя была прыгожая.

Я пайшла на могілкі... Ля самых варотаў стаяла вартоўня з забітымі вокнамі. Доўга стукала. Выйшаў вартаўнік, ён быў сляпы... Што за знак? «Не скажаце, дзе хавалі ссыльных?» — «А... та-а-ам...» — і махнуў рукой ці то ўніз, ці то ўгару. Нейкія людзі павялі мяне ў самы далёкі кут... Адна трава там... адна трава... Уначы не спала, таму што задыхалася. Спазм... такое пачуццё, што хтосьці мяне душыць... Уцякла з гасцініцы на станцыю. Пешшу праз увесь пусты горад. Станцыя была зачынена. Села на рэйкі і да раніцы чакала. На адхоне сядзелі хлопец з дзяўчынай. Цалаваліся. Развіднела. Прыйшоў цягнік. Пусты вагон... Уваходзім: я і чацвёра мужчынаў у скураных куртках, голеныя, падобныя да крымінальнікаў. Пачалі частаваць мяне агуркамі і хлебам. «Бум у карты гуляць?» Мне не было страшна.

Нядаўна ўспомніла... Ехала і ўспомніла... у тралейбусе ехала... Як Уладзя спявала: «Я могилу милой искал / Но найти ее нелегко...». А аказваецца, любімая песня Сталіна... калі яе спявалі, ён плакаў... І я яе адразу разлюбіла, гэтую песню. Да Уладзі прыходзілі сяброўкі, звалі на танцы. Я ўсё гэта памятаю... Мне было ўжо шэсць ці сем гадоў... Я бачыла, як у трусы замест гумкі яны зашывалі дрот. Каб нельга было сарваць... Там жа адны ссыльныя... зэкі... Забівалі часта. Пра каханне я таксама ўжо ведала. Да Уладзі прыходзіў прыгожы хлопец, калі яна хварэла — ляжала ў нейкіх анучах, кашляла. А ён так на яе глядзеў...

Мне балюча, але гэта — маё. Я нікуды ад яго не бягу... Не магу сказаць, што я ўсё прыняла, удзячная за боль, тут трэба нейкае іншае слова. Цяпер я яго не знайду. Ведаю, што ў гэтым стане я далёка ад усіх. Я адна. Узяць пакуту ў свае рукі, валодаць ёй цалкам і выйсці з яе, штосьці адтуль вынесці. Гэта такая перамога, толькі ў гэтым ёсць сэнс. Ты не з пустымі рукамі... А інакш навошта было спускацца ў пекла?

Вось хтосьці падводзіць мяне да акна: «Паглядзі, вунь вязуць твайго бацьку...». Незнаёмая жанчына цягнула штосьці на санках. Кагосьці ці штосьці... захутанае ў коўдру і перавязанае вяроўкай...

Потым мы з сястрой хавалі нашу маму. Засталіся адны. Уладзя ўжо ледзь хадзіла, у яе адніміліся ногі. Скура адслойвалася як папера. Ёй прынеслі бутэлечку... Я думала, што гэта лекі, а гэта была нейкая кіслата. Атрута. «Не бойся...» — паклікала яна мяне і дае гэтую бутэлечку. Яна хацела, каб мы разам атруціліся. Я бяру гэтую бутэлечку... Бягу і кідаю яе ў печ. Шкло разбіваецца... Печ была халодная, там даўно нічога не варылася. Уладзя заплакала: «Ты ўся ў бацьку». Хтосьці нас знайшоў... Можа, яе сяброўкі? Уладзя ляжала ўжо ў непрытомнасці... Яе — у лякарню, мяне — у дзіцячы дом.

Бацька... Я хачу яго ўспомніць, але як ні намагаюся, не бачу яго твара, няма ў маёй памяці яго твара. Потым я ўбачыла яго, маладога, на фатаграфіі ў цёткі. Праўда... я на яго падобная... Гэта наша з ім сувязь. Бацька ажаніўся на прыгожай сялянскай дзяўчыне. З беднай сям'і. Хацеў зрабіць з яе пані, а мама заўсёды насіла хустку, насунуўшы яе нізка-нізка на бровы. Не пані. У Сібіры бацька не доўга жыў з намі... ён сыйшоў да іншай жанчыны... А я ўжо нарадзілася... Я была пакараннем! Праклёнам! Ні ў каго не было сілаў любіць мяне. І ў мамы таксама не было гэтых сілаў. Гэта запраграмавалася ў маіх клетках: яе роспач, яе крыўда... і нялюбасць... Мне заўсёды бракуе любові, нават калі мяне любяць, я не веру, мне ўвесь час патрэбныя доказы. Знакі. Яны патрэбныя мне кожны дзень. Кожную хвіліну. Мяне цяжка кахаць... я ведаю... (Доўга маўчыць.) Я люблю свае ўспаміны... Люблю свае ўспаміны за тое, што там усе жывыя. У мяне там усё ёсць: мама... тата... Уладзя... Мне абавязкова трэба сядзець за доўгім сталом. З белым абрусам. Я жыву адна, але ў мяне на кухні стаіць вялікі стол. Можа, яны ўсе са мной... Я магу ісці — і раптам паўтару нечы жэст. Не мой... Уладзін жэст... ці мамчын... Мне здаецца, мы датыкаемся рукамі...

Я — у дзіцячым доме... У дзіцячым доме сіротаў-асаднікаў выхоўвалі да чатырнаццаці гадоў, а потым адпраўлялі на руднікі. І ў васямнаццаць гадоў — сухоты... як ва Уладзі... Гэта лёс. Дзесьці далёка, казала Уладзя, у нас ёсць дом. Але вельмі далёка. Там засталася цётка Марыля, мамчына сястра... Непісьменная сялянка. Яна хадзіла, прасіла. Чужыя людзі пісалі лісты. Не разумею і цяпер... ну як? Як яна дамагалася? У дзіцячы дом прыйшло распараджэнне: адправіць мяне разам з сястрою па вось такім адрасе.

У Беларусь. У першы раз да Мінска мы не даехалі, у Маскве нас ссадзілі з цягніка. Усё паўтарылася: Уладзю — у яе пачаўся жар — у лякарню, мяне — у ізалятар. З ізалятара — у прыёмнік-размеркавальнік. Сутарэнне, пахла хлоркай. Чужыя людзі...

Я ўвесь час жыву сярод чужых людзей... Усё жыццё. А цётка пісала... пісала... Праз паўгода знайшла мяне ў тым прыёмніку. Ізноў я чую словы «дом», «цётка»... Мяне вядуць да цягніка... Цёмны вагон, толькі асветлены праход. Цені людзей. Са мной — выхавальніца. Даехалі да Мінска і ўзялі квіток у Паставы... я ўсе гэтыя назвы ведаю... Уладзя прасіла: «Ты запамінай. Запомні: наш маёнтак Соўчына». З Паставаў ідзём пешшу ў Грыдзькі... у цётчыну вёску... Селі каля моста перадыхнуць. А тым часам сусед ехаў з начной змены на ровары. Спытаў, хто мы. Адказалі, што прыехалі да цёткі Марылі. «Так, — сказаў ён, — правільна ідзяце». І, відаць, перадаў цётцы, што бачыў нас... яна пабегла насустрач... Я ўбачыла яе і кажу: «А вось гэта цётка падобная на маю маму». І ўсё.

Стрыжаная «пад нулёўку», сяджу на доўгай лаве ў хаце дзядзькі Стаха, мамчынага брата. Дзверы адкрытыя, і праз праём відаць, што людзі ідуць і ідуць... спыняюцца і моўчкі глядзяць на мяне... Жывапіс поўны! Ніхто адзін з адным не размаўляе. Стаяць і плачуць. Абсалютная цішыня. Уся вёска прыйшла... І яны перакрылі мой струмень слёз, кожны плакаў са мной. Усе яны ведалі бацьку, хтосьці ў яго працаваў. Не раз я потым пачую: «У калгасе нам «палачкі» налічваюць, а Антэк (бацька) заўсёды разлічваўся». Вось яно — мая спадчына.

Нашу хату перавезлі з хутара на цэнтральную сядзібу калгаса, у ёй дагэтуль сельсавет. Я ўсё ведаю пра людзей, ведаю больш, чым хацелася б. У той жа дзень, калі чырвонаармейцы пагрузілі нашу сям'ю на калёсы і павезлі на станцыю, тыя ж людзі... цётка Ажбета... Юзэфа... дзядзька Мацей... разнеслі з нашай хаты ўсё па сваіх хатах. Дробныя пабудовы разабралі. Раскацілі па бярвенцы. І маладзі сад выкапалі. Яблынькі. Цётка прыбегла... і панесла толькі вазон з акна на памяць... Не хачу я гэта памятаць. Ганю з памяці. Я памятаю, як вёска мяне няньчыла, насіла на руках. «Ідзём, Манечка, да нас, мы грыбоў наварылі...», «Давай малачка табе налью...». Сёння я прыехала, а назаўтра ў мяне ўвесь твар пакрыўся пухірамі. Пякло вочы. Не магла падняць павекі. Мяне за рукі вадзілі мыцца. У мяне выбольвала ўсё, выпальвалася, каб я паглядзела на свет іншымі вачыма. Гэта быў пераход з таго жыцця да гэтага... Цяпер я іншла па вуліцы, і мяне кожны спыняў: «Якая дзяўчынка! Ай, якая дзяўчынка!». Без гэтых слоў у мяне вочы былі б як у сабакі, якога выцягнулі з палонкі. Я не ведаю, як я глядзела б на людзей...

Жылі цётка з дзядзькам у каморцы. Хата ў вайну згарэла. Паставілі каморку, думалі, на першыя часы, і там засталіся. Саламяны дах, маленькае акенца. У адным куце бульбачка (цётчыны словы) — не «бульба», а «бульбачка», а ў іншым — парася віскоча. Ніякіх дошак на падлозе — зямля накрыта аерам і саломай. Хутка сюды ж прывезлі Уладзю. Пажыла яна трохі і памерла. Цешылася, што паміраe дома. Апошнія яе словы: «А што будзе з Манькай?»

Усё, што я даведалася пра любоў, я ведаю з цётчынай каморкі...

«Мая ты птушачка... — звала мяне цётка. — Мая жужалка... пчолка...». Я ўвесь час лапатала, цераблі яе. Я не магла паверыць... Мяне любілі! Любілі! Ты расцеш, а табой любуюцца — гэта такая раскоша. У цябе ўсе косточкі распростваюцца, усе цягліцы. Я танчыла ёй «рускага» і «яблочко». Мяне навучылі гэтым танцам у ссылцы... Спявала песні... «Есть по Чуйскому тракту дорога. / Много ездит по ней шоферов...», «Умру, в чужой земле зароют, / Заплачет мамочка моя, / Жена найдет себе другого, / А мать сыночка — никогда...». Набегаешся за дзень так, што ногі ўсе сінія-сінія, абадраныя — абутку ж не было ніякага. Ляжаш увечар спаць, а цётка твае ножкі закруціць у падол сваёй начной кашулі, сагрэе. Яна мяне спавівала. Ляжыш дзесьці каля жывата... як ва ўтробе... Таму я не памятаю зла... Я на зло забылася... дзесьці далёка яно ў мяне схавана... Раніцай прачыналася ад цётчынага голасу: «Я дранікі спякла. Паеш». — «Цётка, я спаць хачу». — «А ты паеш і спі». Яна разумела, што ежа... бліны... для мяне як лекі. Бліны і любоў. А дзядзька наш Віталік быў пастух, насіў на плячы пугу і доўгую берасцяную дудку. Хадзіў у ваенным кіцелі і галіфэ. Прынасіў нам з пашы «торбу» — там і сыр, і кавалачак сала — усё тое, чым яго частавалі гаспадыні. Святая беднага! Яна для іх нічога не значыла, не крыўдзіла, не абражала. Як для мяне важна ўсё гэта... каштоўна... Адна сяброўка жаліцца: «Няма грошай на новую машыну...», іншая: «Усё жыццё марыла, а так і не купіла сабе норковае футра...». Як праз шкло чую... Адзінае, пра што я шкадую, што не магу ўжо насіць кароткую спадніцу... (Разам смяёмся.)

У цёткі быў незвычайны голас... дрыготкі, як у Эдзіт Піяф... Яе звалі спяваць на вяселлях. І калі хтосьці паміраў. Я заўсёды з ёй... побач бягу... Памятаю... Вось яна стаіць-стаіць каля труны... доўга стаіць... У нейкі момант адлучаецца неяк ад усіх, падыходзіць бліжэй. Павольна падыходзіць... яна бачыць, што ніхто не можа сказаць гэтаму чалавеку апошніх слоў. Людзі хочуць, але не ўсе ўмеюць. І вось яна пачынае: «І куды ты, Анечка, ад нас пайшла... светлы дзень і ночку пакінула... хто цяпер будзе хадзіць па тваім дворы... хто дзетак тваіх пацалуе... хто ўвечары кароўку сустрэне...». Ціха-ціха падбірае словы... Усё побытавае, простае, і яно ж высокае. Сумнае. Нейкая самая апошняя праўда ў гэтым простым. Канчатковая. Голас дрыжыць... І ўсе за ёй пачынаюць плакаць. Ужо забыта, што карова не падоена, муж п'яны дома застаўся. Змяняюцца твары, сыходзіць мітусня, на тварах праступае святло. Усе плачуць. Я саромеюся... і шкадую цётку... Вернецца яна дахаты хворая: «Ой, Манечка, галоўка шуміць». Але такое было ў цёткі сэрца... Са школы прыбягу... Маленькае акенца, іголка з палец... Цётка зашывае нашыя анучкі і спявае: «Агонь зальеш вадою, / Каханне ж анічым...». Я азорана гэтымі ўспамінамі...

Ад нашага маёнтка... Ад нашай хаты засталіся адны камяні. Але я чую іхняе цяпло, мяне цягне да іх. Прыязджаю туды, як на магілу. Я магу там заначаваць у полі. Хаджу асцярожна, баюся ступіць. Чалавека няма, а жыццё ёсць. Гул жыцця... розных жывых істотаў... Хаджу і баюся разбурыць нечы дом. Я і сама магу ўладкавацца дзе заўгодна, як мурашка. У мяне культ дома. Каб раслі кветкі... было хораша... Я памятаю, як у дзіцячым доме мяне вядуць у мой пакой, дзе я буду жыць. Белыя ложкі... Шукаю вачыма: ці не заняты ложак ля вакна? Ці будзе ў мяне свая тумбачка? Я шукаю, дзе будзе мой дом.

Цяпер... Колькі гэта мы сядзім і гаворым? За гэты час адгрымела навальніца... суседка прыходзіла... тэлефон званіў... Усё гэта ўплывала на мяне, на ўсё гэта я адгукалася. А на паперы застануцца толькі словы... Іншага нічога не будзе: суседкі не будзе, тэлефонных званкоў... таго, што я не сказала, але яно мільгала ў памяці, прысутнічала. Заўтра наогул я аб усім, можа быць, распавяду інакш. Словы засталіся, а я ўстану і пайду далей. Я навучылася з гэтым жыць. Умею. Іду і іду.

Хто гэта мне даў? Усё гэта... Бог даў ці людзі? Калі Бог даў, то ён ведаў, каму даваць. Пакута мяне выгадавала... Гэта мая творчасць... Мая малітва. Колькі разоў я хацела каму-небудзь усё распавесці. Прагаворвала. Але ніхто мяне ні разу не спытаў: «А далей што... далей?». А я ўвесь час чакала добрых ці дрэнных людзей, не ведаю, але ўвесь час чакала людзей. Усё жыццё чакаю, што мяне хтосьці знойдзе. І я ўсё яму распавяду... і ён спытае: «Ну, а далей што?».

Цяпер пачалі казаць: сацыялізм вінаваты... Сталін... Як быццам у Сталіна была ўлада, як у Бога.

У кожнага быў свой Бог. Чаму ён маўчаў? Мая цётка... наша вёска...

Я памятаю яшчэ Марыю Пятроўну Арыставу, заслужаную настаўніцу, якая наведвала нашу Уладзю ў бальніцы ў Маскве. Чужая жанчына... яна і прывезла яе да нас у вёску, унесла на руках... Уладзя ўжо зусім не хадзіла... Марыя Пятроўна дасылала мне алоўкі, цукеркі. Пісала лісты.

А ў дзіцячым прыёмніку-размеркавальніку, дзе мяне мылі, дэзінфікавалі... Я на высокай лаве... уся ў пене... магу саслізнуць, разбіцца аб цэмент. Слізгаю... спаўзаю... Чужая жанчына... нянька... падхопліваe мяне і прыціскае да сябе: «Маё ты птушанятка».

Я бачыла Бога.

Пераклад з рускай мовы.

Памяць нядрэмная

Генадзь БУРАЎКІН (1936-2014)

* * *

З гаманкіх сталічных станцый
У мурожны кут глухі
Цягне зноў і зноў
Вяртацца
Праз гады
І праз шляхі,
Каб знаёмы водар жытні
Удыхнуць у хаце зноў
І знайсці свае сцяжынкі
Між замшэлых валуноў,
На рыпучы ганак выйсці,
Зглядзець бусла ў вышыні
І заціхнуць,
Як калісьці,
У дрымотнай цішыні,
І глядзець,
Як ля адрыны —
Не забылася яшчэ —
Слуп нястомны камарыны
Апантана мак таўчэ,
І адчуць,
Што не дарэмна
На вятрах чужых дарог
Ты
Для памяці нядрэмнай
Патаемна ўсё збярог...

* * *

Ну што паробіш,
Не магу іначай —
Не слухаючы мудрых засцярог,
Я зноў хачу
Прайсці сцягой юначай,
Адрынуўшы наезджанасць дарог.

Мяне туды ўсё кліча сэрца,
Быццам
Яно жыве там з даўняе пары
І я ні заблудзіцца,
Ні згубіцца
Не здолею ў сасновым гушчары.

Я ведаю:
Рачулка наша гіне,
Палянкі загубіліся ў быллі...
Быў іншы час.
Былі мы ўсе другімі
І дрэвы невысокімі былі.

І, можа,
З новай яваю сваяцтва
Я сумнаю душою не прыму,
А ўсё ж хачу
Вярнуцца ў свет юнацтва,
Хоць толкам і не ведаю,
Чаму...

* * *

Праплывае месяц лодкаю
Над разлівамі расы.
А жыццё —
Яно кароткае,
Як дабаўкі не прасі.

Як шчаслівa ні галёкай
На сцяжынках між атаў,
Адспяваў сваё салоўка,
Адзвінеў,
Адшчабятаў.

Як вяртання ні выпрошвай,
Падганяе зноў і зноў
Цёплы вецер жытняй пожні,
Горкі водар палыноў...

* * *

Вы гэтулькі чакалі іх
І зблізку,
І здаля,
Іх профілі чаканілі
На новых медалях.

Вы іх прыйсці прасілі
Ва ўладу на пастой.
Вы верылі іх сіле
І спрытнасці крутой.

І вось яны
Нахрапам
Пасады занялі.
І стала бачна раптам
Што ўсе яны —
Нулі,
Што ў іх усё разлічана:
І клёк,
І благадаць,
Ды толькі за аблічамі
Асобаў не відаць,
Ды толькі справядлівасці
У іх зусім няма.
І вам з-пад іх не вылезці.
І шчасце сніць —
Дарма.

За золата прымаеце
Дзяшовенькую медзь...
Ну што ж,
Вы тое маеце,
Што так хацелі мець...

* * *

Пазбавіўшыся ад цароў,
Займелі мы такую ўладу,
Што прызначае нам сяброў
І вызначае нам пасаду.

Дыктуе правілы свае.
Каб не было ні ў кога лішку,
Усім наедак раздае:
Каму — чарпак,
А каму — лыжку.

Ніхто не трэба ёй,
Апроч
Тых,
Што з клыкастымі лычамі.
Нібы астрожнік,
Дзень і ноч
Стаіць нядрэмна за плячамі.

І марыць,
Каб усе
Сп'яна
Ляжалі перад ёю плазам...
А вы лічылі,
Што яна
Сыйшла ў нябыт
З царамі разам...

* * *

Няпраўда,
Што імгненна паміраюць
Бязгрэшнікі ў намоленай цішы.
Анёлы смерці
Доўга падбіраюць
Свой ключ
Да іх асуджанай душы.

Даюць спаўна спазнаць
Людскія мукі,
Бяссілле крыўды
І адчай трывог,
А потым
Ціха іх вядуць за рукі
Па той,
Апошняй з іх зямных дарог.

З аблокаў
Дазваляюць азірацца
На дзедаў крыж,
На матчына вакно,
На хмельнае шчаслівае юнацтва
І на сяброў,
Што здрадзілі даўно.

З плячэй здымаюць
Іхні скарб сабраны,



Сціраюць пыл,
Нязмыты пры жыцці,
І ў райскі сад,
Што за высокай брамай,
Толькі пасля ўжо
Клічуць увайсці...

* * *

Хто з дудой,
Хто з нябеснаю маннай,
Хто з тутэйшых,
А хто з чужакоў —
Колькі зведалі мы іх,
Падманных
І нахрапістых важакоў!

Як яны нам спявалі асанну,
Як кавалі для нас медалі,
Толькі б мы,
Неразумныя,
Самі
Ім жаданую ўладу далі!

Не даваў ім суцішыцца
Верад
Абяцанкі пустыя нізаць.
Нам кляліся павесці наперад,
Самі ж праглі вярнуцца назад.

І цяпер
На глухіх раздарожжах
Нерашуча глядзім з-пад рукі
І ніяк разабрацца не можам,
Нас куды завялі важакі...

* * *

Ах, палітычныя паяцы!
Ах, чынавенскія карчы!
Усё вам хочацца смяяцца.
Усё вам здзекавацца карціць.

З трыбун высокіх
І са сцэны
Вы пырскаеце ўсмак слінай,
Нібы ў вас досвед неацэнны
І справядлівасць за спіной.

Усіх, хто вам не даспадобы,
Гатовы спляжыць вы датла.
Абы заўжды было вам добра
І чарка поўная была.

А як вы кпіце на нарадзе:
Які запал,
Які напор!
І дзіўна аж,
Што ў заняпадзе
Сатыра ў нас да гэтых пор...

* * *

Над вячэрняй цішай хмызнякоў,
Над дрымотнай апусцелай шырай
Прашумела чарада шпакоў,
Што сабраліся ў далёкі вырай.

Іх пакліча ўранні шлях цяжкі
І не грэе ўжо мурожны выган,
Дзе стаяць панурыя стажкі
І блішчыць ракі халодны выгін.

Каля весніц лісця намяло.
І я ў шэры змрок гляджу нясмела...
Вось і лета позняе маё
Лёгкімі крыламі адшумела...

* * *

О, прысады мінскія,
Балюстрады нізкія,
Кветнікі з цюльпанамі,
Лаўкі пад каштанамі.

Там ішлі мы поначы,
Ласкай сэрца поўнячы,
Дзелячыся з ценямі
Снамі-летуценнямі.

Там маўчаць апоўначы,
Нашы клятвы помнячы,
Над вадою віснучы,
Вербы каля Свіслачы.

* * *

Духата,
Як спрут,
Сціскае сэрца,
Блытае і плавіць думкі ўсе.
І кропелісты дождж,
Што з неба сееца,
Ні на міг палёгкі не нясе.

Сціхлі птушкі.
Апусцілі лозы
Лісце перагрэтае ў раку.
Нават камары
І тыя млосна
Раптам пахаваліся ў цяньку.

І ўжо ў зморы бачыцца,
Як дзіва,
Што да сонца
Ў бляклай сіняве
Немінуча,
Грозна
І маўкліва
Хмара навальнічная плыве.

* * *

Спяшаюся дарогай торнай
Да хат,
Прымоўклых між прысад,
І радуюся,
Як прасторна
Мне расхінуўся далягляд.

плывуць ужо
Пад небам чыстым
У край далёкі жураўлі.
І так лагодна і ўрачыста
Спакой пануе на зямлі.

Жнівом падстрыжаныя нівы
Яшчэ змарнотнелі не ўсе.
І ветрык,
Лёгкі і гуллівы,
Мне ўслед саломінку нясе...

* * *

Вось нарэшце ўжо зіма адужала
Мокрую, расхрыстаную восень.
І дыхнула з неба
Колкай сцюжаю.
І ў вазах
Званчэй скрыгочуць восі.

Зранку
Праяўляюцца на вокнах
Першыя марозныя узоры.
Кроплі зледзянелыя
На вольхах
Свяцяцца,
Як выстылыя зоры...



Анатоль КУДРАВЕЦ
(1936—2014)

Бацька

Елка стаяла не з самага краю лесу, але ў прасвет паміж камлямі іншых дрэваў — маладзейшых, з высока падабранымі лапкамі, добра было відаць, што робіцца ў канцы пасёлка.

Урэшце, і канец пасёлка Сцяпана не надта цікавіў. Яго цікавіла трэцяя хата па той бок вуліцы. Тры акны ў блакітных аканіцах, тры вертыкальныя ромбікі, прарэзаныя ў франтоне. Ромбікі замянялі акенца, каб на гарышчы можна было нешта бачыць. Ён сам іх праразаў, гэта была яго хата.

Другі дзень яны з Валодзем глядзяць на гэту хату, і другі дзень ніхто не адчыніў дзвярэй ні туды, ні адтуль. І за вокнамі не было відаць ніякага жыцця — усё замуравана белым холадам. Быццам у хаце не было нікога жывога.

А там павінны быць сын і дачка. Пётрусь і Анеля. Пётрусю — дванаццаць, Анелі — сем. Два гады як памерла іх маці, пакутніца Алена, і два гады, лічы, усё на плячах хлапца — і яда, і дровы, і сястрычка, і хата. Сіроты пры жывым бацьку. І бацька, як загнаны звер, месца сабе не знаходзіць. Туляецца, як бадзяжка. Чужы ў сваім лесе, чужы ў сваім сяле. Вунь яна, твая хата, твае слівы, твае яблыні. Сам садзіў, сам даглядаў, няньчыў. Ці то не мужык, не гаспадар, ці то зломак — хоць з тапаром, хоць з касой, хоць плячо пад бервяно...

Хацелася волі: і сабе, а болей дзецям, каб нічога не баяліся, каб чулі сябе людзьмі. Каб ніхто не камандаваў, не ездзіў на табе, як на скаціне. Здавалася, — можна, здавалася, яшчэ трошкі пацярпець, яшчэ трошкі і... І... Не далі. І тыя не далі, і гэтыя не даюць. І не дадуць. Але, дзякаваць Богу, лёс мілаваў: крыві на яго руках не было. Не было... Хлопцы пайшлі за войскам, на захад. «Хадзем, — казалі і яму. — Хадзем, бо тут табе жыцця не будзе». — «А дзеці? Як я дзяцей кіну?» — «І дзецям жыцця не будзе...»

Не пайшоў. Не захацеў пайсці. І вось ляжыць пад елкай і глядзіць на сваю хату.

Хата жыве, пакуль у ёй жывуць, — гэта Сцяпан ведаў добра. Яшчэ даўжэй хата жыве, калі ў ёй гаспадары — сваё ёсць сваё. Свая і болька дарагая. Таму і працiвіўся, каб дзяцей забіралі ў прытулак. Калі па душы, працiвіўся не толькі таму, што хата трымала. Ён ведаў: забяруць дзяцей — і болей ён іх ніколі не пабачыць. А пакуль яны тут, тут усё яго, тут яго сям'я, тут яго дом, ***яго*** дом. Не стане іх — не стане нічога. А так хоць праз тыдзень, хоць праз два, хоць крадком, хоць на некалькі хвілін, але яны разам, усёй сям'ёй разам. Усім гняздом.

Дзеці таксама не хацелі ісці ў прытулак. «Мы будзем з бабай». Баба, Сцяпанава маці, жыла на сваім селішчы, у залеснай вёсцы, за тры кіламетры. Пра бацьку дзеці стараліся ні з кім не гаварыць. Яны ведалі, што пра бацьку нікому напамінаць не трэба. Яго лічылі бандытам, яго шукала міліцыя, яго лавілі. Бандыт. Які ён бандыт?.. Чаму ён бандыт?

Але чаму з коміна не ідзе дым?.. Хай і на вясну пайшло, хай і невялікі мароз, але ж зіма. Можа, дзеці не вытрымалі чакаць і пайшлі за лес да бабы? Але ж ён сказаў, каб былі дома, каб чакалі. Ён абяцаў прынесці хлеба, а можа і яшчэ чаго. Ён заўсёды прыносіў нешта з яды. Цяпер хлеба не прынёс, прынёс бульбы. Вунь яна, у торбе, у ігліцы.

Тыя разы ён прыходзіў адзін. Аднаму прасцей у сваім сяле, у сваім двары, у сваёй хаце. А Валодзю няма куды дзецца: ні дома, ні радні, усё з'ела вайна. Пасля Цераболі, калі іхнія зямлянкі аблажылі энкавэдысты, з шасці жывымі вышлі толькі яны ўдвух. Так і ходзяць разам.

Елка была старая, магутная, — можа, з метр, можа, болей у камлі. Сукі пачыналіся высока, у рост чалавека, але раскідвалі голле так шырока, што не маглі ўтрымаць уроўні з зямлёй ні зялёную мятлу-кучомку, ні саміх сябе, апускаліся ўніз, выгіналіся дугой, дастаючы да самай зямлі. Зверху налягалі другія лапкі — зеланейшыя, маладзейшыя, густа аброслыя іголкамі, робячы з елкі тое, што называецца словам «шацёр». Ні дождж, ні снег не маглі прабіць гэты высозны зляжалы панцыр, пад самым верхам якога знайшла месца для свайго гнязда сям'я каршакоў. Разумныя птушкі, выбіраюць дрэва і не ў самай глыбі лесу і не з самага краю.

За гэты час, як мужыкі тут, коршак прылятаў двойчы. Пасядзіць, пасядзіць між галля, быццам у яго ніякага клопату няма, потым ціха сарвецца уніз, нават не сарвецца — мякка паплыве на разгорнутых крылах убок вёскі, крута развернецца, разы са два ляніва ўзмахне пругкай сілай распраўленага пер'я і пойдзе над лесам.

Быццам і не прылятаў, быццам яму і клопату мала да гэтых двух мужыкоў, што ляжаць пад ягоным гняздом на сухой іглiцы, засланай сенам.

Дзень хіліўся да захаду. Сонца высвеціла ўсе тры акны хаты — спачатку першае, ад слівы, потым другое, потым трэцяе. Пагуляла промнямі на слюдзяных шыбах, на блакітных аканіцах, на франтоне з трыма ромбікамі.

— Сцяпан, ты сам зашываў франтон? — спытаў Валодзя.

— Сам.

— І не бачыў, што адну дошку, вунь тую, правей цэнтра, прышыў крыва?

— Ска-а-жаш...

— А ты прыгледзься...

Сцяпан прымружыў вочы. І праўда, калі глядзець адсюль, то трэцяя ад цэнтра дошка нібыта знізу ссунута ўбок і не клалася ў роўны вертыкальны строй усіх астатніх. Як жа так? Ён жа сам прыбіваў, сам меркаваў...

— Мы глядзім з боку. Калі б глядзелі ў лоб — там ніякай касіны, міліметр да міліметра, — сказаў Сцяпан.

Памаўчалі, але нядоўга.

— Валодзя, я не магу болей ляжаць, я пайду.

— Ты пойдзеш па сваю смерць, — адказаў Валодзя.

— Яны галодныя. Маё сэрца чуе: іх морацъ голадам. І холадам. Ты бачыш: другі дзень не паліцца ў печы.

— Можа, яны сышлі да тваёй маці?

— Яны не маглі пайсці. Я сказаў, што прыйду і прынясу хлеба. Яны гэта ведаюць. Няхай Анеля — дзіця, а Пётрусь — гэта ўжо мужчына. А тут, бачыш, і ў печы не паліцца. Можа, там ужо нікога жывога няма...

— Як рошыш. Калі што, я іх прышыю, — Валодзя паказаў вачыма на кулямёт, які стаяў побач на раскірэчаных ножках. Талерка дыска пляската, як шыя ў кобры, раздзімалася над стваламі. Сцяпан ведаў: калі хопіць патронаў, Валодзя прышые ўсіх, каго трэба прышыць.

— Я не пайду напрасткі і сялом. Я падыду з балота, з-за хлявоў. Калі там засада, яна чакае мяне ноччу, а не повідну. А я вось так, сярод белага дня, — Сцяпан прыўзняўся на калені, паляпаў Валодзю па плячуку: — Усё будзе добра.

Валодзя павёў плечуком — не то пагаджаўся, не то сумняваўся.

— Ладна. Ідзі.

— Аўтамат я не буду браць. Днём, у сяле, з аўтаматам... Хай застаецца тут...

— Ну, брат... — Валодзя хацеў яшчэ нешта сказаць, але Сцяпан ужо ступіў за елку. Ступіў і прапаў, як растварыўся ў лесе.

Валодзя ізноў прылёг на сена, доўга глядзеў у прагал між камлямі крайніх ад поля елак. Глядзеў не столькі на хату, як на тыя тры ромбікі ў франтоне. Непрыгожа яны чарнелі. Калі ёсць небяспека, то яна там, за імі. І гэта дошка... Як ён мог так коса яе прышыць?..

Валодзя падсунуў да сябе кулямёт, развярнуў раструбам да пасёлка, на Сцяпанаву хату, пацягнуў на сябе рамку прыцэла. «Колькі тут метраў? Сто ці болей? Соткі — метраў шэсцьдзесят, вуліца дваццаць, і тут, да сотак... Значыць, сто... Возьмем сто дзесяць». Зноў зірнуў на хату з ромбікамі.

І ўбачыў Сцяпана. Які малайчына! Сцяпан, як прыліплы, сунуўся па сцяне хаты, з-за вугла да дзвярэй. Пастаяў ля дзвярэй, відаць, слухаў, што там, у сярэдзіне хаты. Пацягнуў на сябе дзверы і знік за імі.

Было ціха ў сяле, ціха ў лесе. Так ціха, што Валодзя чуў, як шуміць кроў над вухам: «Шу-шу-шу!».

Анеля ўбачыла бацьку адразу, як толькі ён адчыніў дзверы. Яна ляжала на ложку пад тоўстай коўдрай — двое чорных вачанят над зялёным прасцiрадлам. У нагах кажух — яго стары кажух. Пётрусь ляжаў побач, адвярнуўшыся да сцяны. Ён спаў.

Анеля ўскінула вачыма ўгору, на столь. Бацька зразумеў яе, кіўнуў галавой. Нячутна ступаючы, падышоў да ложка, прыгарнуў вольнай рукой падатлівыя дзіцячыя костачкі. На другім плячы ў яго была торба з бульбай. Зняў торбу, паклаў на лаўку, паказаў на яе вачыма. Дачка заківала галавой. Пастаяў, нешта думаючы.

— Нам не даюць выходзіць, — прашаптала дачка.

Бацька прыклаў палец да губ: «Ціха!». Сказаў аднымі губамі:

— Ідзіце да бабы.

Яшчэ раз прыціснуў дачку да сябе, зірнуў на сына. Спіць... Хай паспіць. Паўтарыў:

— Ідзіце да бабы.

Анеля пільна пaглядзела на яго, быццам хацела пра нешта спытаць, але прамаўчала. Над галавою было глуха. Сцяпан яшчэ раз прыклаў палец да губ: «Маўчок!». Ён заўсёды рабіў так, калі між ім і дачкой была нейкая тайна. Анеля па-змоўніцкі кіўнула галавой.

Чаму яго павяло на вуліцу, Валодзя не разумеў.

— Дурань, што ты робіш?!.

Вароты ў двор былі расчынены, і ў гэтым быў непарадак. Не трацячы шмат сілы, Сцяпан прыўзняў іх, вярнуў на месца, як яны і павінны былі стаяць, і вароты рыпнулі. Відаць, гэтага голасу хапіла, каб разбудзіць тых, на гарышчы. Праз ромбікі яны ўбачылі, як за варотамі павярнуўся і спакойна пайшоў па вуліцы чалавек — высокі, крутаплечы, у куфайцы. Ды гэта ж ён, Сцяпан! Здаецца, і ў Цераболі ўсё зрабілі, каб узяць, а не ўзялі. Выслізнуў. І тут маглі праспаць... Бач, да дзяцей пацягнула сволач. Пацягне, мы гэта ведалі. Вось ён, колькі тут — дзесяць, пятнаццаць метраў?.. Трое сутак прымусій мерзнуць, падла. Але дачакаліся. Лепшай удачы не дажджэшся!.. Цікава, здагадваецца ён пра засаду ці не? Канечне, не. Калі б здагадваўся, не падстаўляўся гэтак адкрыта, спіной, у куфаечцы... без аўтамата...

Чарга была кароткая і злая. Прашытая дзясяткамі куль куфайка на Сцяпанавых плячах проста ўліпла ў цела. Здавалася, што гэта і не кулі прайшліся, а дождж касым наваротам сыпнуў жменю кропель, пакінуўшы на куфайцы часты шнурок ад правага пляча да паясніцы і ніжэй.

Сцяпан яшчэ змог развярнуцца, каб глянуць на свае тры ромбікі, на тры белыя акны, і ткнуўся плячом у снег.

Валодзя ўсё гэта бачыў. Ён бачыў і тое, як касая дошка ў франтоне ад'ехала ўбок яшчэ больш, і ў шчыліну высунуўся чорны ствол аўтамата. Стралялі адтуль.

Ён чакаў.

І дачакаўся.

Дзверы хаты раптам адкінуліся, быццам іх выбілі нагой, і на вуліцу выскачылі двое з аўтаматамі, у белых форменных кажушках. Яны схапілі Сцяпана за руку, перавярнулі на спіну. Ён, мусіць, яшчэ дыхаў, бо адзін з двух прыставіў дула аўтамата да разяўленага рота і націснуў на курок.

Той чаргі Валодзя не пачуў. Яна злілася з яго кулямётнай — глухой і зацята доўгай. Густое рэха падхапіла і панесла яе па лесе. Валодзя глядзеў над прыцэлам і бачыў, як падскочыў угору адзін белы кажушок, потым другі, і як яны вяла, быццам замарожаныя, сталі класціся на снег побач са Сцяпанам...

Кулямётная чарга сарвала з елкі коршака, і ён плаўна пайшоў над полем. Знізу Валодзя ўбачыў, які ў яго шырокі размах крылляў і якое прыгожае пер'е — жоўта-белае спадыспаду, з круглымі чорнымі разводамі, як у бабы на святочнай спадніцы.

Як і ў тыя разы, коршак крута развярнуўся над полем і паляцеў у лес.

А з хаты з галасам выбягалі хлопчык і дзяўчынка.



Фота radzima.org

Неба прыйшло на зямлю…



Васіль ЗУЁНАК

Начлежны світанак

Белы конь, як белы туман
Пад чырвонаю грывай зары,
І ў кашах сунічных палян
Лета выспеленыя дары.

З імі ў згодзе й прасмолены бор:
Коціць водар на паплавы.
Дагарае начлежны касцёр,
Уступаючы сонцу правы.

* * *

Выбар вялікі,
А пэўнасць адна, –
Тут не разлікам
Шана і цана,

Тут сэрцу мерак
Не дадзена знаць:
Богу – верыць,
Жанчыну – кахаць!..

Прышэсце

Сонечнай радасці крэскі
Веснянь крыло матылю,
Сведчаць на ўзлеску пралескі:
Неба прыйшло на зямлю!..

* * *

Даўно такога не было:
Пад яблыняй – сумёты.
З пялёсткаў снегу намяло,
А вулей спеліць соты.

Даўно пчаліную гурму
Так не шчадрыла квецень:
Абвесніў мёдную зіму
Рой – і сабе, і дзецям.

Наваселле

Купіў лесавік – і танна! –
У чэрвеня новы дом:
Без сцен, без вакон – паляна –
Дыхае цёплым святлом.

Старога парка жыхары

У атачэнні ліп і клёнаў,
Пад іх наглядам векавым
Дрэў маладых квітнеюць кроны,
На завязь песцячы правы.

Ланіты раніцы абвеяў
Галінкай яблыневай сад,
Як у руцэ паненкі веер
Пад сонцам трыста год назад.

І тым, хто сёння маладзее,
І тым, з вякамі на кары, –
Усім вясну пароўну дзеляць
Старога парка жыхары…

Настальгічны матыў Валі

«Купіце фіялкі!
Купіце фіялкі!» –
Спяваў патэфон.
А ў памяці даўкай,
А ў памяці даўкай
Той голас, як сон.

Заела пласцінку,
Заела пласцінку, –
Збіваецца круг.
А голас – націнкай,
А голас – націнкай:
Амаль што заглух…

Ды сонечным раннем –
Як выклік паданням –
На Лысай гары
З-пад рук тваіх дбайных
Зляцела з гайданнем
Сто кропель зары.

Як неба прыветнік,
Размаіўся кветнік:
Цюльпаны цвітуць!
Праз вёсны і леты
З пласцінкі тандэтнай
Той голас нясуць.

«Купіце фіялкі!..»
А сонечны ранак
Ідзе нагадаць:
Не ўсё адспявана –
Квітнеюць цюльпаны, –
Навошта купляць!..

* * *

А мне ўжо «энны» дзясятак, –
І гэта не трыццаць тры!.. –
А ўсё малады, незаняты
Гняздуецца чорт унутры.

І носіць вясновыя ласкі
Асенняя золь у душу,
І лета само, без падказкі,
Прыходзіць, хоць я не прашу.

Аднак, не спяшайце лякацца,
Старэчых не тузайце сноў:
Віноўніца ўсіх правакацый
Адна і нязменная – зноў!..

Такі ўжо ў яе характар,–
А я – пра яе, пра яе:
Гэта паэзія раптам
Завалу гадоў узарве.

І што з ёй рабіць? «Глуповатой»
Сам Пушкін яе ахрысціў…
А мне ўсё ж «энны» дзясятак… –
Паэзія, адпусці…

Надпіс на кнізе «Пісьмы з гэтага свету. 1995»

Лістоў лянотна не пісаў –
Разборак і паклонаў сумесь,
Паціху рыфмы выкрасаў –
І тым трымаў са светам сувязь.

З канвертаванай мітуснёй
Паштовых не ганяў кур'ераў.
Не-не, я не лічыў хлуснёй
Лісты, ды болей вершу верыў.

З начнымі думамі яго
Я адпраўляў да адрасатаў –
І да сяброў, і да багоў,
І перад кім быў вінаваты…

Цяпер шкадую: што ж, стары,
Век звекаваў, лічы, сам-насам,
І для архіва не стварыў
Эпісталярнага запасу.

І толькі верш, бяссонніц брат,
Зрэдзьчас ці кпіць, ці суцяшае:
«Як апраўдацца нам? Наўрад
Скажу, бо й сам таго не знаю…»

Зямное і нябеснае

З часам раблюся ўсё больш зямны:
Слухаю не сілы касмічныя, –
Хіба мацней, хто скажа, яны
За сілу зямную?
Не вечнасцю час адлічваю,
Ды касмічна шчырую:
Дзве-тры вечнасці –
І не меней –
За адно зямное імгненне
Космасу ахвярую.

А на зямлі раблюся
ўсё больш нябесны,–
На зямлі – цесна.
Слухаю не ўдары сарака саракоў
У адлітку славы пудовыя.
Не шукаю скрынку цвікоў,
Каб будаваць палацы лядовыя.

Ні найдзюкоў,
Ні кансерватараў,
Ні бальшавікоў,
Ні завадатараў,
Ні тылавікоў,
Ні ліквідатараў-
Сілавікоў… –

Усе і ўсё –
Нібы камень на дно.

А са мной
На арбіце зямной
Застаецца адно:

Слухаю ўдары сэрца свайго
Маленькага, –
О, не знаць бы, што ўсё гэта
ў ім сабранае! –
І нябеснае, і зямное… –
Колькі ў ім усяго-ўсяленькага…
А яно ўсё ідзе –
Не з жабрацкай кавенькаю,
На сардэчнасць не абабранае,
Не засіленае маною,
Ідзе –
Не трымціць па-рабску каленькамі
Перад уладнаю брамаю,
Ідзе –
У саюзе са мною.

Веру, сэрца, табе –
Ты знаеш:
Колькі ў мары маёй магіл,
Столькі згублена светам дарог…
Ты – зямны мой бог
І малітва мая зямная, –
Я ўсё табою напоўню,
Дзе разрывае вечнасць кругі,
І на шляху крыжавым,
Зноў і зноў я табе напомню
Пра зямныя мае даўгі:
Іх цяжар не пакінь жывым.

Дыялог

Жыццё:
– А мне ўжо – ці кручь, ці верць –
Ісці пад тваё крыло.
І што б ты рабіла, смерць,
Калі б жыцця не было?

Смерць:
– Запомні: я адбіццё
Тваё ў зваротным канверце.
І ці было б жыццё,
Каб раптам не стала смерці?..

Сучасныя

Да багоў днём і ноччу
Абіваюць парогі:
На зямлі быць не хочуць,
А ў нябёсах – не могуць…

АХОВА

Купіла жаба купіну
Ў самотнага вужа.
А тое, што ўжо куплена,
Пазначыла мяжа.

Ахова на валоданне
Бусліная прыйшла,
І жаба ўзнагародаю
На снеданне была…

* * *

Калі ўсё тое здарыцца –
О, каб жа ды знацьцё!.. –
Я б з кожным з вас па чарачцы
Узняў за небыццё –

За ўласнае, за вечнае, –
Не ўнікнеш жа яго, –
Каб не чапляць на плечы вам
Груз адбыцця свайго.

І словы ўсе апошнія
Я, пэўна б, сам сказаў, –
Няйнакш, як зняў бы пошліну,
Што сам жа й навязаў…

Ну, і яшчэ па поўненькай –
За грэшную душу, –
Усіх з маім ахоўнікам –
Па поўненькай! – прашу!..

Дальбог, пакуль не пляснула
Жалобнай хвалі медзь,
Як вып'е Юда ўласны мой –
Цікава паглядзець!..

А што не ўспеў патрэбныя
Ён выведкі прадаць –
Я ма́ю трыццаць срэбнікаў,
Каб за́жыва аддаць.

* * *

Гнеў у генах, – адкуль ён? Здалёку,
Пэўна, памяць прынесла яго:
Ад бунтоўных зямных прарокаў,
Шэравокіх паганскіх багоў.

То й глядзяць на мой чын
бязвольны
І пытаюць: – Што ж здрадзіў ты
Нашым – лесу, рэчкам і полю?
Чым жывеш ты і чым святы?..

Ланцугамі аблытаны туга
Мудраслоўя, пасланага звыш,
Ходзіш век свой затоптаным
кругам,
І надзеі няма, што ўзляціш…

Шлях развёў нас купалаўскім
ранкам…
Развітаннем працяты, стаю:
Я зямлю, як і вы, люблю,
Небу верачы па-хрысціянску.

Што яшчэ ў апраўданне скажу?
Я такі ж, як і вы, калісьці,
Ды нябеснаму Богу служу:
«Не забі, не змані, не зламыслі»…

Перад вечнасцю

Пакуль жыву, пакуль жывыя вы,
Ва ўсіх у нас адсутныя правы,
Ва ўсіх у нас падсудныя хвіліны:
Душу спытае вечнасць за правіны.



Фота pausage.com

Пра Моцю і яго сястрычку

З цыкла «Пра Моцю»



Віктар КАЗЬКО

Моця пад вечар быў непадобны сам на сябе. Так непадобны, што не мог і прыдумаць, на каго ён на самой справе падобны. Хутчэй на дзьмухаўца, які ўжо адкрасаваў, а цяпер белым пухам завіс па-над зямлёй, гатовы ў неба, на другое адраджэнне. Прарастанне, завязь, цвіценне, і зноў — у палёт, у неба. І каб ніколі не злазіць з яго, хай яму і есці туды падаюць, адно марожанае ды цукеркі. Хаця пасля іх можна адзін-другі і дранік, толькі на масле і з вяршкамі.

Расчулены, насалоджаны такімі думкамі, ён і сам не прыкмеціў, як пачаў цалаваць бабулю. У вусны і з прыцмокам, чаго да гэтага цураўся, нават грэбаваў. Здзівіцца не паспеў. Здзівілася бабуля. Доўга выцірала губы на рагі па-піянерску завязанай пад падбароддзе белай у зялёны гарошак хусцінкай. І мала таго — адварочвалася і плявалася:

— Здзяцінеў ты ці што?

— І зусім не здзяцінеў, пасталеў, падрос, параўняўся з бацькам... А ты чаго смаркаешся?

— А таго, — адказала бабуля. — Сама што таго.

–Ну, тады можаш, — дазволіў Моця. — Тады можаш і ў кулак, і на дарогу жабаў і жабянят пускаць. Я сёння добры, бо крыху шалёны.

— Во дзіва, — сказала бабуля, — толькі крыху. Ты заўсёды і быў...—Такім чынам сапсавала Моцін настрой бабуля. Зняла, скінула, сцягнула з самага што ні на ёсць сёмага неба. Абзямлячыла.

Моця ледзь не кінуўся біцца з ёй. Але хоць і на зямлі, на калдобінах з цвілой і без доўгіх дажджоў застаялай у іх і адчувальна смярдзючай вадой разважлівасць і надзвычоркавая лагода перамаглі. Старая, парахня, што яна можа разумець у яго сённяшнім жыцці, калі даўно ўжо і забылася на яго, на палёты ў сне і на яве. Пэўна, ніколі і не ведала: кухня, хлеў, венік і яго, Моцю, каршэнь, а да гэтага — бацькаў, і стогн, стогн — якія ж дзеці пайшлі, горш учорашніх. Адно толькі — заўсёды белая, па-піянерску на рагі хустка ў вечназялёны гарошак пад падбародак. Таму не варта з ёй сварыцца, тым больш біцца. Звязвацца сабе даражэй.

З гэтым ён і даклыпаў да хаты. А там замілаванне і шалёная ўзнёсласць зноў узялі верх. Не, жыццё, нават не гледзячы на бабулю, усё ж мае сэнс. Нездарма, нездарма прыдумалі яго. Варта, варта жыць і ўвечары, нават уначы, калі цябе прымушаюць класціся ў ложак. У ложак...

Моця наледзь дачакаўся маці, так яго распірала, поўніла вар'яцкай радасцю недарэмна пражытага дня. І толькі маці ступіла на парог, як ён адразу ж і вельмі голасна, столь падскочыла і збялела:

— А я сёння спаў са Светкай!

Твар маці на нейкае імгненне стаў падобны да столі, сутаргава сціўся і расціўся. Але ж яна вельмі хутка ўзяла сябе ў рукі. Толькі аднаго разу вохкнула ды двойчы развяла рукі і пляснула далонямі, што Моця ўспрыняў як апладысменты:

— Ты сёння... спаў... са Светкай?

— Ага ж, у адным ложку і цэлыя дзве гадзіны.

— Дзіва, дзіва,— амаль бабуліным голасам мовіла маці.

І Моця адчуў, што ніякага дзіва тут ёй няма. Нібыта ён усё жыццё спаў са Светкай, і не па дзве гадзіны ўдзень, а дзень і ноч напралёт, не пакідаючы ложку. І яна загадзя ўжо ведала, што ён будзе спаць са Светкай. Прывыкла ведаць і ніколькі не здзіўляецца.

«Ну чаму яны такія, — з прыкрасцю падумаў Моця.– Што бабуля, што маці. Дзе і калі яны згубілі здзіўленне. Раздзяцінелі. Дзе і калі яны так паразумнелі, што назаўсёды страцілі... не, не толькі здзіўленне, а саму радасць здзіўляцца. Згубілі, згубілі патаемнасць таго ж дзьмухаўца, што ўжо адкрасаваў, але адчуваннем асалоды таго, што ён вось-вось памножыцца, адскочыць ад амярцвелай, струпам збялелай сівой галоўкі, былой сваёй і чалавека ўцехі, і кінецца ў белы свет, залунае, залунае, куляючыся пад сонцам і блакітам неба. Паляціць, паляціць па-над зямлёй, а мо і прэч ад зямлі — у сусвет, невядомыя жыцці, планеты, як лётае, не адчуваючы ні цела, ні ног ён, Моця, як лётаў і сёння дзве гадзіны, пакуль спаў са Светкай і працягвае лятаць і цяпер. Толькі нябачна.

І гэтая нябачнасць прымусіла Моцю больш пільна прыгледзецца да маці, мо яна саромеецца яго, хавае сябе перад ім. А на самой справе яны аднолькавыя, і адчуванні іх аднолькавыя. Толькі маці не выказвае сябе. Бо яна ўсё ж маці, яго маці. Але якраз у гэтым уся і справа: абодва яны не могуць далёка адбегчыся адно ад аднаго.

Але вынік гэтай глыбокадумнасці і пільнасці да выразу твару і постаці маці быў зусім інакшы і вельмі нечаканы нават для Моці. Падсвядома, усё ж нешта маючы ў галаве, як гэта бывае толькі ў раннім дзяцінстве і ў дзяцей, ён некуды пранік. Патрапіў у недасягальнае яшчэ яму і яго розуму, мо і зусім не чалавечае, хутчэй звярынае, а найбольш верагодна ўвогуле нікому з жывых неўласцівае. Зноў жа, апроч дзяцей у пэўным узросце, дараванае невядома кім, мо нябёсамі, а мо і зямлёй, падзямеллем. Дараванае толькі на імгненне і цалкам і адразу з узростам адабранае. Адабранае нейкім найвышэйшым, каб чалавек не надта вытыркаўся па-над зямлёй і з зямлі сярод тых жа чалавекаў.

— Нешта апошнім часам ты надта патаўсцела, маці, раздалася ўперадзі і ўшыркі.

Маці зачырванелася і прысела на крэсла каля стала. Але Моцін промільг, пэўна, ужо скончыўся, і паперла з яго ўжо звычайная будзёншчына, уласцівая кожнаму ў сталасці цвярозасць і разважлівасць.

— На дыету трэба садзіцца, маці, надта ты ўжо прыпадаеш да мучнога і салодкага. Абмяжоўваць трэба сябе дыетай.

— Дыета тут не дапаможа, сынок, — уздыхнула маці і расквецілася ўсмешкай.

— Усім дапамагае, а табе не? — здзівіўся Моця. — Так не бывае. Зірні ў тэлевізар, якія там трэскі, вешалкі і фасолі. І як жа яны выдыгаюцца, хаця, я думаю, пешкі, сваімі сарочымі нагамі не кожная з іх і да могілак дапне... А ў Светкі ножкі спраўныя, абедзьве...

— Як у нашага кабанчыка? — спытала маці.

— Уга, як у нашага кабанчыка, хаця яна таксама на дыеце са сваёй маці. Тыдзень на садавіне, тыдзень на кефіры, а ў дадатак яшчэ гербалайф, крамлёўскія таблеткі, паасобнае харчаванне па... па...

— Ну, ты і адукаваны, — папраўдзе ўжо здзівілася маці.

— Дурная справа не хітрая, — па-даросламу разважліва адказаў ёй сын. — Звар'яцелі дзеўкі. І ўсе адразу і ўсе разам.

— Ну, разумнік, ну, разумнік, і ў каго ты толькі такі.

— А табе лепш ведаць, — сказаў Моця. — Табе і бацьку. Якім ужо зрабілі.

Але сказаў, пэўна, нешта не тое, бо маці ўсердзілася і ўхапіла яго за віхор:

— То ты спіш са Светкай, то... Як жа гэта ты спадобіўся пераспаць з ёй?

— Адпусці, — буркнуў Моця, — тады скажу. А так гаварыць не буду.

— Будзеш, яшчэ як будзеш, — запэўніла яго маці.

— Не буду, хоць табе, бачу я, вельмі ўжо цікава, як спяць хлопчыкі з дзевачкамі.

— Ды не так ужо і вельмі, — сумелася маці і адпусціла віхор. — І ўсё ж як гэта было?

— Было, — сказаў Моця.

— Як?

— А вельмі проста, калі ўжо так карціць табе ведаць.

— Проста?

— Зусім не проста. Спрэс адна мітрэнга і бязладдзе... Рамонт у нашай спальні быў. Ложкі павыкідвалі, і на ўсіх не хапіла. І я прапанаваў Светцы спаць са мной. Леглі і заснулі...

— І ўсё?

— Ну, не зусім. Не без таго ўжо... Пагаварылі, пабуськаліся. І дамовіліся, што заўсёды будзем спаць разам, пакуль не пажэнімся. А тады ўжо і як ты з бацькам, паасобку.

— Чаму ж гэта так: я з бацькам паасобку...Паасобку я з бацькам. Бач ты, паасобку.

Моця ніяк не мог зразумець, чаму маці так расхвалявалася, што крыўднага ёй ён сказаў. Праўду сказаў, і нічога балючага ў гэтай праўдзе няма. Чаму гэтыя дарослыя такія пераменлівыя і не трываюць ні хлуслівай, ні праўдзівай праўды. Якой жа трасцы ім трэба. На самой справе ўсім ім на дыету садзіцца трэба: мазгі ці то падсушыць, ці набрацца іх. Ён так і сказаў маці, хаця і быў супраць. Падобна, такой жа думкі прытрымлівалася і маці, бо пачала смяяцца. Ды так увішна, весела і голасна, што цяпер ужо ўсердзіўся Моця.

— Здзекуешся, усё жыццё здзекуешся. А вось Светка лепшая за цябе. Ніколі, ніколі з мяне не смяецца.

— Дурненькі, ох і дурненькі ж ты. — Маці ўстала з крэсла, выйшла з-за стала. Падышла да Моці, падняла на ногі і яго, але чамусьці зноў за віхор. І Моця хацеў ужо канчаткова раззлавацца, але маці прытуліла яго тварам да сябе, да свайго раздабрэлага ўшыркі, а больш уперад жывата.

— Чуеш? — амаль у самае вуха, што ад нечаканасці і абурэння стала бураковым і зусім не чуйным, ціхенька і ласкава спытала маці.

— Нічога не чую, — адказаў Моця.

— Ну як жа, яна ж голас табе падае і брыкаецца. Вітае і ўжо крочыць насустрач табе.

— Хто, хто вітаецца і крочыць? — перахопленым ад неспадзяванкі голасам, узбуджаным і зноў крыху відушчым нябачнае і непазбежнае, як ачужэлым яму сэрцам, спытаў Моця.

— Сястрычка. Твая сястрычка.

— Як, як яна ў жывот табе трапіла?

— Трапіла, родненькі, трапіла.

— Ты праглынула яе?

— Але ж, Моцечка, але ж...

— Ну і што ты нарабіла, што я з табой рабіць буду? Гэта ж злачынства!

— Ды не ж, Моцечка, не. Гэта не злачынства, а зусім нават наадварот.

— Як... як зусім наадварот, калі яна ў цябе ў жываце і квакае.

У жываце ў маці нешта, здаецца, сапраўды квакала, як жабяня па вясне на купіне ў балоце, калі яно ўжо ўгрэецца і пачынае набываць мову. І гэта мова чэрава матулі была ніколькі не горкай, не жаласлівай. Нейкая абвяшчальная яна была. Так абвяшчае сябе жаўтароты верабейка, што першы раз хапіў, каўтнуў з зялёнага лістка бярозы кропельку, слязінку вады, маладой расы. Мо так нікому не чутна падае голас і пушынка дзьмухаўца перад тым, як набыць крылы, залунаць пад небам і ўгрэўным сонейкам. І то быў голас, здалося Моці, яго, калі ён прачнуўся пасля ціхага часу ў ложку разам са Светкай.

І адчуванне гэтага ўласнага голасу нібыта апякло Моцю. Апякло як загадзя, як крыху наперад, пякучым агнём і зыркім полымем будучыні. Яго ўласнай і непазбежнай будучыні.

— Што ж гэта значыць, што ж гэта значыць? — вусцішна і амаль нема закрычаў Моця. — Гэта і ў Светкі цяпер можа завесціся жабянё?

— Ды не, сынок, не. Дзеці зачынаюцца зусім інакш.

— Як, як інакш?.. Толькі не трэба мне ля-ля пра капусту і бусла. Я ўжо прыглядаўся да капусты. Вусені там, вусені адны, што карады пражэрлівыя і брыдкія, зялёныя ўсярэдзіне ад соку капусты.

— Вой-вой, — адсланілася ад Моці матуля. — Прагледзела, не ўпільнавала капусту. Пабягу ж зараз...

— Не пабяжыш, не ўцячэш...— сказаў Моця. — Ад мяне і праўды не ўцячэш... І пра бусла мне не трэба. Бачыў я, як той буслік цягнуў у кубло сабе гадзюку. Вось толькі на што і здольныя вашыя белыя буслы. Гадзюк прыносяць, а не дзяцей. Брыдота, а не птушка. Я не хачу, не жадаю быць параджэннем бусла. Але ўсё ж тады... Як, адкуль, ад каго?

— Ад радасці, ад кароткага нашага шчасця... Ад таго, што мы таксама часам лётаем... Вось лётала, лётала і заляцела. — Маці ўнурылася і замоўкла.

— Чаму ж ты тады не радая ад таго, што можаш лятаць? Я вось рады, рады, што не з капусты і не ад бусла. Рады таму, што і ты, мая матулька, здольная лётаць. Рады... — Моця гаварыў гэта, але ўжо не зусім верыў, што ён сапраўды рады. Мімаволі яму здавалася, што час яго палётаў заканчваецца. Ці ж давядзе яго да дабра гэтае жабяня ў жываце маці. Дагэтуль ён быў адзіны, непаўторны і любы. А цяпер гэтую непаўторнасць і любасць бацькам прыйдзецца дзяліць надвое. І якая доля дастанецца яму?

Ён зноў наблізіўся да маці, прыхіліўся да яе жывата:

— Дай паслухаць. — Прыпаў вухам, амаль да голага распранаючы маці. І яму так урэзалі па вуху, нібыта ён рабіў нешта вельмі і вельмі непрыстойнае. Так урэзалі, што ён адхіснуўся, адпаў ад чэрава маці, як адпадае перасычаная п'яўка ад цела чалавека.

— Брыкаецца. Глядзі ты, брыкаецца цялічка-сястрычка. Біцца будзем, вой будзем біцца...

Падумаў, памаўчаў і нечакана загадаў маці:

— Садзіся і разяў рот.

І такая рашучая непрыхільнасць чулася ў яго голасе, што маці без ваганняў адразу ж і падпарадкавалася, як дзевачка.

Моця схіліўся да шырока разяўленага рота матулі:

— Дабранач. Дабранач, сястрычка!

Той, каго ўдарылі па шчацэ

Фрагмент рамана



Леанід ДАЙНЕКА (1940-2019)

Мой бацька не баяўся смерці. Мой бацька памёр, памёр, як паміраюць усе людзі, калі пакліча іх з зямных абшараў у сваю вечную нябесную дзяржаву Бог.

Я не прысутнічаў пры ягоным кананні, не ведаю, лёгка ці ў пакутах адыходзіў ён, бо так ужо запавешчана зверху нам, людзям: радуемся разам, пакутуем паасобку. Дарафееўна, другая бацькава жонка, казала мне, што той зімовай марозлівай ноччу апошнімі бацькавымі словамі былі: «Хутчэй дай мне лякарства!». Ды лекі ўжо не дапамаглі.

Я люблю ягонае імя. У нашай спрэс зрусіфікаванай Клічаўшчыне ў кожнай вёсачцы было аж зацесна ад Іванаў, Сямёнаў і Рыгораў. Бацькава ж імя было нейкае нетутэйшае, было, як выкапнёвы мамант, цвіло чужацветам на савецкім лузе. Начальнікі і начальнічкі розных рангаў прамаўлялі яго, калі ўзнікала такая неабходнасць, на расейскую манеру — Мартын. А гэта было пашанотнае старадаўняе еўрапейскае імя! Марцін, служка грознага рымскага бога вайны Марса!

То й праўда — у чатырох (!) войнах удзельнічаў мой міралюбны бацька. У так званым «вызваленчым» паходзе 1939 года, калі Сталін з Гітлерам з двух бакоў няшчадна гамілі Польшчу, у наймарозлівейшым студзені 1940-га, калі крамлёўскія стратэгі вырашылі за кошт фінскіх земляў «обеспечить безопастность колыбели революции Ленинграда», улетку 1940-га ў горадзе Рызе, калі працоўныя Латвіі адзінадушна, як, захліпваючыся ад шчасця, крычалі штатныя савецкія прапагандысты, вырашылі ўліцца ў СССР, і, вядома ж, у звышжорсткай і звышкрывавай вайне 1941—1945 гадоў.

Што далі тыя войны маму бацьку, усёй нашай сям'і і мне? Ды нічога добрага. Бацька стаўся інвалідам — аж шэсць нямецкіх куляў пранізала яго бліз польскага горада Ломжы. Маці мая з малалетнімі дзецьмі панабегалася, пакалаціліся ад страху падчас акупацыі ў лясах і балотах. Удзень апошні харч забіралі паліцаі. Уначы нярэдка заходзілі партызаны. Тыя і другія не раз ставілі да сценкі, пагражаючы расстрэлам. Нас, дзяцей, як мышэй, заганялі ў падпечча. Усю вайну і ўсю акупацыю народ быў між двух смяротных агнёў. Вечны жах. Вечны голад. Пастаяннае ўсведамленне, што ты нікчэмнейшая мізэрнейшая кузюрка, якую ўзброены да зубоў чалавек, што па-гаспадарску ўваліўся ў тваю хату, можа прыкончыць адным шчаўчком пальца.

Ды я адхіліўся ад сваёй першапачатковай задумы… Пачынаю свой аповед, сваю гісторыю дзеля таго, каб, заглыбіўшыся ў стагоддзі, расказаць пра хрысціянскую вуніяцкую веру, якая на працягу амаль 250 гадоў (1596—1839) была жывой верай нашага народа, якая, калі прамаўляць высокім штылем, стварыла нашу сённяшнюю Беларусь, якая падчас «нямога» для беларушчыны XVIII стагоддзя адзіная паміж усіх захавала беларускую мову ў сваіх храмах і якую гвалтоўна знішчылі, высеклі пад корань. Вось чаму я вяртаюся да першапачатковага сказу гэтага твора, бо менавіта ад свайго бацькі я ўпершыню пачуў пра вуніяцтва.

Мой бацька не баяўся смерці. Ён, як літаральна ўсе савецкія людзі, быў атэістам, дакладней, вымушаны быў быць атэістам, бо Улада Ваяўнічых Бязбожнікаў, якая сцірала з твару зямлі Божыя храмы, расстрэльвала або гнаіла ў турмах святароў, скідвала са званіцаў званы, пераплаўляла ў залатыя і срэбныя металамом святыя абразы, тушыла свечкі і душы, не давала чалавеку права выбару жыццёвай дарогі. Толькі адна дарога была ў кожнага і ва ўсіх разам. Толькі тая, што вядзе ў камунізм. Іншыя дарогі абавязкова вялі або на Салаўкі, або ў Курапаты.

Яны, Ленін і кампанія, зрынуўшы Бога, самі сябе аб'явілі багамі. Яны ў свой гонар прыжыццёва сваімі імёнамі называлі гарады і вуліцы, марскія караблі і калгасы. «Cuius regio, eIus religio» — чыя ўлада, таго й вера. Крамлёўскія ўладары вельмі добра засвоілі канцэпцыю Аўгсбургскага міру 1555 года, канцэпцыю, якой скончылася ў Еўропе крывавая рэлігійная вайна. Адзінай верай, калі толькі верай можна назваць звышлютую дыктатару, была аб'яўлена камуністычная вера.

Дарэчы, амаль ніхто не задумваўся, адкуль узяўся псеўданім Уладзіміра Ульянава — Ленін. Лічылася і лічыцца, што таке прозвішча пайшло ад сібірскай ракі Лены, у крайнім выпадку, ад жаночага імя Лена. Прапаную сваю разгадку. Псеўданім камуністычнага правадыра створаны ад слова «лен», што азначае зямельнае ўладанне, якое на ўсё жыццё ўручаў пан-суверэн васалу за ягоную звышвернаю службу. Ад каго ж, ад якога такога гаспадара атрымаў лен (усю Расійскую імперыю!) васал Ленін?

…Мой бацька Марцін Дайнека быў атэістам, але не быў камуністам, хоць членамі кіруючай партыі і членамі камсамолу былі ўсе ягоныя пяцёра братоў. Каб не здраджваць ісціне, зазначу, што ён таксама хацеў уступіць у партыю, пісаў заяву і насіў яе за шэсць кіламетраў у райцэнтр у Клічаў, ды поспеху не меў. Аказваецца, ён быў жанаты на сястры ворага народа, то бок, на маёй маці, старэйшы брат якой, Павел, старшыня калгаса, згінуў, як камар у спёку, падчас чарговага яжоўскага хапуна. І невядома, дзе прах ягоны. Ясна адно — не ў крамлёўскай маскоўскай сцяне. У ёй, сцяне, і каля яе мірна спачываюць верныя слугі і апрычнікі камуністычнага рэжыму.

Адзінага старшынёўскага сына Толю загналі аж на Калыму. Толькі ў 1956 годзе вярнуўся ён дадому, сядзеў у нашай хаце, прагна піў гарэлку, закусваючы кіслай квашанай капустай, моцна, неяк істэрычна захмялеў, садраў з сябе кашулю, і на ягонай шырокай валасатай грудзіне ўбачылі татуіроўку: «Отец, ты спишь, а я страдаю».

Але ці быў мой бацька і ўвесь навакольны люд бязбожнікам? Вядома ж, не. Чалавек ужо з матчынага лона выпраўляецца ў неабсяжны белы свет запраграмаваным на рэлігійнасць, гэтаксама як запраграмаваны ён на адчуванне голаду, смагі, цеплыні, пяшчоты, любові… І гэта не мая белетрыстычная выдумка. Гэта цвярозы голас сённяшняй шматвектарнай усюдыіснай навукі. Бог быў. Бог ёсць. Бог будзе заўсёды. І нават калі патухне над нашай зямлёй вечнае сонца, Бог будзе. А тыя, што скідвалі яго з нябёсаў, зрабіліся мярзотным пылам мярзотных падзямелляў, дзе поўзаюць бязвокія мярзотныя павукі.

Па словах маці, мой бацька мог бы стацца вялікім начальнікам, калі б у свой час не збег дадому са Свіслачы (не гродзенскай, а магілёўскай), дзе вучыўся на настаўніка. Што падштурхнула яго на гэта? Сум па роднай Змітраўцы? Адсутнасць харчоў? «Вунь Васілька ў Клічаве дырэктарам школы робіць, а ты быкам хвасты круціш», — часцяком, разззлаваўшыся, ушчувала бацьку маці. Васілька (Васіль Кандратовіч) разам з бацькам паехаў у Свіслач, але не збег адтуль, датрываў да канца вучобы, у чыне дырэктара важна хадзіў па райцэнтру ў сінім гальштуку і ў белым капелюшы.

Марцін жа Сцяпанавіч пры ўсім сваім вострым прыродным розуме, дасціпнасці і нязводным гумары пайшоў, як камень, на сацыяльнае дно. Не, ён не ператварыўся ў шараговага селяніна-калгасніка, аднаго з тых ціхмяных аднаколерных людзей, што спрадвеку сахой, а затым і трактарным плугам рэжуць зямлю, і пра якіх іранічна кажуць: «Бяры болей, кідай далей». Перад самай вайною ён быў старшынём мясцовага змітраўскага калгаса «Пяцігодка», пасля вайны — загадчыкам прадуктовай базы на станцыі Несята, куды аж з-за акіяну, з Амерыкі, прысылалі прадукты харчавання. Тады мы пачулі таямнічае слова «лэндліз». Базаўскія грузчыкі выкладвалі цэлыя піраміды з прыгожых бліскучых кардонных скрынак, якія называліся «рацыёнамі». Іх дзяліла-размяркоўвала згаладаламу да дзікунства мясцоваму насельніцтву раённае начальства. Нейкая драбязга перападала й майму бацьку Марціну. Калі сёння нехта па камуністычнай завядзёнцы бэсціць Амерыку, я ўспамінаю той галодны год і тыя «рацыёны». Толькі дзякуючы ім мы выжылі. Дзякуючы ім мы даведаліся, што такое таматны сок, шакалад, кава, свіная тушонка, апетытна нарэзаная вяндліна ў бляшанках, жуйка… Нашы камуністы-гуманісты, нашы начальнікі ўсё гэта елі ўдосталь яшчэ да вайны, але свайму народу далі магчымасць паспытаць-пакаштаваць такія прадукты толькі гадоў праз пяцьдзясят.

Пасля гэтай базы мой бацька, так мовіць, заўсёды быў на кіруючых пасадах сярэдняга звяна. Брыгадзір, загадчык малочнай фермы, каморнік-землямер… Яму даручалі нарыхтоўваць у навакольных вёсках бульбу і вагонамі адпраўляць яе данбаскім шахцёрам. І вось за гэтую самую бульбу, што змерзла ў капцах, ён атрымаў пяць гадоў зняволення, якія (два з пяці) адбухаў у мінскай турме. З турмы прывёз шахматы — уласнаручна вытачыў іх на турэмным станку, часам гуляў са мною, але хутка стамляўся, загарэлай даланёй змятаў фігуры з дошкі.

Няпростае нялёгкае жыццё, вядома ж, гняло яго, і ён моцна пасябраваў з гарэлкай. Працуючы брыгадзірам, ездзіў на кані. Іншым разам п'яны не мог сесці ў сядло, чапляўся рукамі за лейцы, намотваў лейцы на рукі, і разумны конь асцярожна валачыў яго па зямлі дадому. Аднойчы прыкалываўся ўначы да сваёй хаты, пастукаў у шыбіну і жалосна папрасіў родную жонку:

— Жанчынка, падкажы, у якім баку Змітраўка.

Успамінаючы пра такое, я абсалютна ўпэўнены, што не абражаю свайго любімага бацьку, што, прачытаўшы гэта, ён весела ад душы пасмяяўся б разам са мной і, смеючыся, абавязкова сказаў бы:

— Калі б я не піў, ужо б даўно памёр. Налівай, Лёнік. Глынем яшчэ па адным каліву. І, дай Бог, не апошняму.

О, гэты жыццярадасны бацькаў смех! Да скону не забуду яго. Да скону не забуду тыя доўгія восеньскія і зімовыя вечары, калі над нашай хатаю глуха шумелі старыя змрочныя ліпы, чэрства шкрэбліся халодным голлем у вокны, а мы сядзелі пад жоўтым утульным святлом керасінавай лямпы, і бацька з гумарам і досціпам распавядаў пра сваё жыццё-быццё. І радасна ззялі ягоныя добрыя, самыя сінія на зямлі вочы.

Сам сябе бацька называў бальшавіком, хоць савецкай уладзе не верыў.

— Ат, замянілі аднаго цара другім, — махнуўшы рукою, быццам адганяючы надакучлівую муху, іншым разам казаў ён мне. Калі ж я паступіў вучыцца на журфак у Мінску і пакрысе пачаў натольваць сваю заўсёдна дэмакратычную душу неўтаймаваным студэнцкім вальнадумствам, ён з усёй абачлівасцю і клапатлівасцю папярэдзіў:

— Не лезь у паліціку. Заб'юць.

Слова «заб'юць» і дагэтуль сядзіць у маёй свядомасці як моцна загнаны востры жалезны цвік. І цвік той не вырваць з душы ніякімі абцугамі.

Да майго пісьменніцтва адносіўся з паразуменнем, але без асаблівага піітэту. Прачытаў мой першы раман «Людзі і маланкі», калі адпасваў радоўку ў лузе.

— Пішы, — толькі й пачуў я ад яго. Аднго гэта кароткае бацькава слова значней і важней для мяне шмат якіх рэцэнзій. У звязку з гэтым хачу падзяліцца з вамі, мае цярплівыя паважаныя чытачы, вось якой думкаю… Вышэйшае кіраўніцтва жадае, каб беларускія пісьменнікі напісалі новую «Войну и мир» Льва Талстога, а не новую "Новую зямлю» Якуба Коласа, і тады яно, вышэйшае кіраўніцтва, шчодра ўзнагародзіць пісьменнікаў, бо сучасным беларусам край як трэба ведаць пра жыццё багатага памеснага рускага дваранства XIX стагоддзя. Што на гэта можна сказаць? Кіруюць Беларуссю не нашы чытачы…

Недзе пасля васьмідзесяці, як я заўважыў, бацька пачаў задумвацца пра сваю магчымую смерць. Неяк мы стаялі каля магілы маёй маці, а ягонай жонкі, і я з маладзёвай жорсткай прасталінейнасцю ва ўпор спытаў, ці баіцца ён смерці.

Бацька зірнуў на мяне, усміхнуўся, сказаў:

— Хоць зараз вось тут яміну капай — і я лягу побач са сваёй Тэкляй.

Гэта не было бравадаю. Гэта не было старэчай халоднасцю, калі паступова тухне агонь ва ўсіх жылах. Нешта іншае было ў гэтых словах, і, пэўна, я расшыфрую іхні патаемны глыбінны сэнс толькі тады, калі сам буду паміраць, адлятаць душою ў нябёсы.

Даўно ўжо няма майго любімага бацькі. Я не магу дакранууцца да яго, не магу пачуць ягоны голас, не магу ўбачыць самыя сінія на свеце вочы. У таямнічым шуме начнога ветру, у няспынным загадкавым цячэнні рознакаляровых воблакаў, у срэбным звоне кропляў, што зрываюцца з даху майго лецішча і пляскаюцца аб пясок, тчэцца родны воблік. Здаецца, зрабі крок, і ажыве мінулае, але… Але смерць змятае людзей з твару зямлі, быццам смецце. Балючае параўнанне? Непрыемнае? Неэстэтычнае? Згодзен з вамі. Але ўслухайцеся — якія падобныя два гэтыя словы. Смецце. Смерць.

Тады, каля матчынай магілы, я ўпершыню пачуў ад свайго бацькі пра вуніяцтва. Напомню, што за камуністычным часам амаль усе мы, у тым ліку мой бацька і я, былі атэістамі, а рэлігія, як бадзёра навучалі нас тыя, што шчыльнымі шэрагамі стаяць сёння са свечкамі ў руках у святых храмах, была опіумам для народа. Калі-нікалі мне цьмяна ўзгадвалася, што мы праваслаўныя. Але толькі цьмяна і толькі калі-нікалі. І не больш.

— Мы не праваслаўныя. Мы — юніяты, — сказаў раптам ба-

цька, стоячы каля магілы маёй маці, сказаў менавіта «юніяты», а не «вуніяты». — Нашага прадзеда Мікіту сілком загналі ў праваслаўе. Як і ўсіх мясцовых людзей. Людзі не хацелі, шмат хто са святароў не хацеў, але іх загналі. Знішчылі амбоны. Забаранілі іграць на арганах.

З найвялікшым здзіўленнем глядзеў я ў той дзень на свайго бацьку. Вось што, аказваецца, жыло ў ягонай душы і нарэшце вырвалася на волю, як вырываецца з-пад халоднага снегу і лёду вясновы ручай!

Пасля такой размовы я адразу пайшоў у бібліятэкі (ніякага Інтэрнэту тады ж не было), з галавою нырнуў у даведнікі і энцыклапедыі. І вось што высветлілася, вось што выплыла з глыбіняў гісторыі.

18 кастрычніка 1596 года на царкоўным саборы ў горадзе Берасці аб'ядналіся праваслаўная і каталіцкая царква Рэчы Паспалітай. Кароль і вялікі князь Жыгімонт III Ваза зацвердзіў гэтае аб'яднанне, якое атрымала назву Берасцейскай вуніі. Рымскі папа Клімент VIII таксама ўхваліў вунію. Праваслаўная царква Рэчы Паспалітай стала грэка-каталіцкай (вуніяцкай), прызнала вяршэнства Папы рымскага, прызнала каталіцкі дагмат аб зыходжанні святога духа не толькі ад Бога-Айца, але і ад Бога-Сына. Узамен за гэта яна захавала сваю ўласную арганізацыйную структуру і іерархію, шмат якія праваслаўныя абрады, народныя мовы (ліцвінскую (беларускую) і ўкраінскую) у рэлігійнай літаратуры і казанях. Пётр Скарга, Іпацій Пацей, Язэп Руцкі, Кірыла Цярлецкі, Міхал Рагоза, Рыгор Загорскі, Лявонцій Пяльчыцкі, — вось якія мудрыя выбітныя людзі прычыніліся да гэтай эпахальнай падзеі. Берасцейская вунія — рэха Фларэнційскай вуніі 1439 года, ейны заканамерны, добра прадуманы, падказаны жыццём працяг. Фларэнційская вунія была ў свой час спробаю стварыць агульнаеўрапейскі бастыён супраць няўмольнай экспансіі туркаў-асманаў, што паставілі на калені Візантыйскую імперыю, імкнуліся авалодаць Венай і Рымам. Рэч Паспалітая, народжаная ў 1569 годзе, і ейнае дзіця — вуніяцкая царква — трымалі ў полі зроку не толькі ваяўнічых асманаў, але ў першую чаргу агрэсіўную Масковію, якая ў 1589 годзе самахоць аб'явіла аб стварэнні свайго праваслаўнага Патрыярхату, аб сваім гістарычным праве (!?) на ўсё наследдзе былой Кіеўскай Русі, прагавіта вастрыла зубы на землі Вялікага Княства Літоўскага, няспынна атакавала ягоныя ўсходнія межы. Па сутнасці, Масковія была той жа мангольскай імперыяй Чынгісідаў, ваяўнічай і жорсткай, толькі перафарбаванай у хрысціянскія еўрапейскія колеры.

Так нарадзілася Вунія. Так яна набірала сілу, расла, мацнела і зрабілася, урэшце, народнай рэлігіяй. Напрыканцы XVIII стагоддзя, перад самым сконам Рэчы Паспалітай ад рук драпежных суседзяў, у Вялікім Княстве Літоўскім жыло 39 адсоткаў вуніятаў, 38 — каталікоў, 6,5 — праваслаўных, 4 — старавераў, 1,6 — пратэстантаў. Вуніяцкія цэрквы Княства ўваходзілі ў склад Кіеўска-Віленскай, Пінскай і Полацкай дыяцэзіяў. Кіеўска-Віленская дыяцэзія апекавалася духоўным жыццём 1 804 388 парафіянаў, Полацкая — 765 154, Пінская — 85 103.

Тры падзелы Рэчы Паспалітай, тры вераломныя ўдары проста ў сэрца адбыліся з 1772 па 1795 год. Аўстрыя, Прусія і Расія, як тры сцярвятнікі, разарвалі на кавалкі славяна-балцкую хрысціянскую дзяржаву ў самым цэнтры Еўропы. Толькі з-за акіяну, з амерыканскіх штатаў, данёсся голас пратэсту. Еўропа ж не заўважыла разбой двух немцаў і адной немкі — расійскай імператрыцы Кацярыны II. Пэўна, палякам і ліцвінам помсцілі за Грунвальд, за ганебную паразу пад Воршай у 1514 годзе, а таксама не супраць былі паласавацца багатай чужой маёмасцю, прыхапіць чужой зямлі.

Сканала Рэч Паспалітая. А неўзабаве за ёю накінулі вяроўку на шыю вуніяцкай веры. Усё падавалася як дабраахвотнае «воссоединение, возвращение к природной вере праотцов». Але чаму ж тады ў студзені 1839 года ў Віцебскую губерню быў накіраваны 29-ы казачы полк палкоўніка Карнеева? Казакоў размясцілі ў Лепельскім, Сенненскім, Полацкім, Дрысенскім і Себежскім паветах. Загарцавалі казацкія коні, заблішчэлі шаблі ў шмат якіх паветах Менскай губерні. Ва Ушачы для сціхамірвання вуніятаў сцягнулі артылерыю. У вёсцы Забор'е Полацкага павета сяляне, калі туды прыехаў дэкан Ніканові́ч передаваць вуніяцкую царкву праваслаўным, павалілі яго на зямлю, вырвалі з рук ключы ад царквы, закрычалі, як адзін:

— Не жадаем веры ламаць!

Супраціўленне забойству сваёй царквы аказалі базыльянскія кляштары ў Полацку, Жыровічах, Менску, Барунах, Быцені. Віцебская манашкі на велізарным белым палатне вышылі чырвонымі ніткамі лік архіепіскапа-пакутніка Язафата Кунцэвіча, трымаючы яго ў руках, загарадзілі ўваход у кляштар праваслаўнаму святару.

— Святы Язафаце, абарані нас! — крычалі манашкі.

Асэсар Беларускай кансісторыі Ян Ігнатовіч разам з рэктарам полацкай семінарыі Міхалам Шалепіным, інспектарам той жа гімназіі Антоніем Томкавідам, іераманахам Канецкім уначы збіраў у сваёй полацкай кватэры незадаволеных, з усёй жарсцю заклікаў духоўных асобаў берагчы вунію, змагацца супраць яе скасавання і далучэння да праваслаўя. Акрамя таго ён пастаянна ездзіў у Себежскі і Дрысенскі паветы, сустракаўся са шляхтай і сялянамі, гаварыў з імі, узбадзёрваў, натхняў, абнадзейваў і ўмольваў. Падрыхтавалі прашэнне да імператара Мікалая І, якое падпісалі 111 святароў. «Калі вунія будзе ўсё ж скасавана, — заяўлялася ў прашэнні, — мы жадаем перайсці ў каталіцтва».

Ды аб якой вуніі і якім каталіцтве можна было заікацца ў «единой и неделимой»? Полацкі ваенна-палявы начальнік падпалкоўнік Агатонаў загадаў неадкладна арыштаваць Яна Ігнатовіча разам з Антоніем Тамкавідам і 29 святарамі. Суд быў кароткі: Ігнатовіча і Тамкавіда на высылку, астатніх — каго ў кляштары, каго ў дзячкі.

12 лютага 1839 года ў Полацку быў падпісаны Саборны Акт з просьбай аб далучэнні вуніяцкай царквы да праваслаўнай. Акт гэты завезлі ў Санкт-Пецярбург, і Святы Сінод адразу ж зацвердзіў пастанову «О принятии греко-униатской церкви в полное и совершенное общение святых православно-католических Восточныя церкви и в нераздельный состав церкви Всероссийской». Імператар Мікалай І, якому ўрачыста паднеслі гэты дакумент, «изволил начертать» на ім: «Благодарю Бога и принимаю». Вось такая гісторыя.

Калі я сёння чую і чытаю аб роскві́це і шматлюднасці Беларускай праваслаўнай царквы, якая падпарадкоўваецца Маскоўскаму Патрыярхату, калі па тэлевізіі паказваюць бясконцыя шэсці, службы, натхнёныя твары бабулек і юных дзяўчатак, залаты бляск адзення святароў, імпазантныя касцюмы ўрадавых чыноўнікаў са свечкамі ў руках, я памятаю, я не забываю, што ў абсалютнай большасці сваёй усе гэтыя людзі — прамыя нашчадкі тых вуніятаў, у якіх калісьці адабралі іхнюю царкву, «зламалі» іхнюю веру. Няспынная рака жыцця даўно знесла ў далёкую далячынь колішнія ўздыханні і слёзы іхніх продкаў. Тая рака ўжо не вернецца, бо новыя рэкі пабеглі па зямлі. А яны, сённяшнія беларускія праваслаўныя, зачараваныя галасістым перагудам маскоўскіх званоў, нават не ведаюць пра сваіх папярэднікаў-вуніятаў.

Асабіста мне сумна, што сучасная Беларуская праваслаўная царква, дзяржаўная, калі казаць па-шчырасці, царква, не аўтакефальная. Мне сумна, а некаму вельмі радасна з гэтае прычыны. Нічога не папішаш. Такое жыццё. Такія ягоныя законы. І кожны з нас, людзей, павінен годна несці свой вызначаны Богам і лёсам крыж...

Але я ведаю, што й дагэтуль жыве вуніяцкая вера і вуніяцкая царква на нашай зямлі. Так жывуць копты ў Егіпце, парсы ў Іране. Паміж мора іншаверцаў, якія далёка не заўсёды сябры. Іх пакуль што няшмат, але яны ёсць, яны з годнасцю ідуць духоўнай дарогаю сваіх прадзедаў. І ў самым пярэднім іхнім шэразе — нашыя беларускія пісьменнікі. Значыць, не ўсё страчана, і ёсць надзея на новы крылаты ўзлёт. І ён ужо, як бы цяжка ні было, пачаўся. Вунія — гэта вуліца, па якой ішоў і сёння ідзе народ, гэта — вочы, якімі ён глядзеў і сёння глядзіць на свет Божы.

Што тычыцца майго бацькі, мы мелі з ім яшчэ адну вельмі запамінальную размову — зноў жа на змітраўскіх могілках.

— Калі памру, — усміхаючыся, сказаў бацька, — дам табе адтуль нейкі знак, нейкі сігнал.

Ён круціў у руках жоўтую калючую шышку, што ўпала на зямлю з пракаветнай хваіны. Такія хваіны, гонкія медняствольныя, шумяць над тутэйшымі магіламі ўжо не першае стагоддзе.

Бацька па складу свайго характару быў містыкам, а я ўрадзіўся падобным на яго.

— Ды ты што? — запярэчыў я, але запярэчыў слаба і няўпэўнена, бо добра ведаў: мой бацька Марцін Сцяпанавіч слоў на вецер не пускае. Калі ўжо што надумаў, то грунтоўна, усур'ёз.

У мітульце дзён, месяцаў і гадоў забыліся тыя бацькавы словы. Навалілася столькі клопатаў, столькі праблемаў, што толькі паспявай сціраць пот з ілба і хаўкаць ротам. Памёр бацька. Мы пахавалі яго побач з маці. Зашумелі над ім, як і над ягонымі равеснікамі, медняствольныя хваіны, што ад старасці не вытрымлівалі напору ветру, і ўсё часцей з грукатам і крэктам абрушваліся на металічныя магільныя агароджы і крыжы. З родных у Змітраўцы ў мяне засталася жыць старэйшая сястра Дзіна. (На жаль, 9 лістапада 2010 года і яе не стала). Вось да сястры я й паехаў аднойчы па замеценых снегам зімовых няўтульных дарогах, дакладней, паехала мая жонка Зіна, як кіроўца аўтамабіля, а я сядзеў побач з ёю і з дрыготкай паныласцю пазіраў наўкола. Ехалі ад Мінска на Бабруйск, потым на Клічаў, адтуль у Змітраўку. Усё было спавіта нейкай нерэальнай цішынёй. Згубіліся галасы. Згубіліся гукі. Мяккалапая белая зіма асцярожнай ваўчыцаю кралася па лясах і палетках. Здавалася, за вакном аўтамабіля не дваццаць першае стагоддзе, а сямнаццатае або нават шаснаццатае.

Пагасцяваўшы пару дзён у сястры, засабіраліся назад у Мінск. Ужо калі выбраліся з сестрынога падвор'я на шашу, што вядзе ў Клічаў, я раптам загадаў жонцы спыніцца, кумільгом выскачыў з машыны, па калена праваліваючыся ў снезе, пайшоў-пабег да могілак, метраў сто па цаліку. Снег быў то зіхотка-белы, то сіні.

— Ты куды?! — крыкнула ўслед здзіўленая жонка. Але я толькі махнуў рукою. Як бы нейкае яркае-яркае святло ўспыхнула ўва мне. Як бы нейкі голас паклікаў.

Вось і могілкі. Вось і месца вечнага спачыну маіх маці і бацькі, цэнтр майго зямнога сусвету. Цішыня. Снег. Старыя хваіны. Ніякага голасу. Ніякага зыку. Ніякага следу. Я здзёр з галавы шапку, перахрысціўся, ступіў колькі крокаў наперад да сіняй зледзянелай агароджы і раптоўна спыніўся, замёр, адчуўшы гарачы штуршок у сэрцы. Паміж непарушнай белі тоўстага, як падушка, снегу, што выпаў, пэўна ж, уначы і яшчэ быў цнатліва-чысты, прамяніста-свежы, на магіле бацькі якраз у тым месцы, дзе калісьці супакоілася пад покрывам зямлі ягоная галава, мне ўбачылася круглая чорная дзірка. Быццам нечым надзвычай гарачым выпаліла-выплавіла снег. Яшчэ раз паўтаруся: наўкол, па ўсіх магілках, не было ні следу, ніякага следу, нават пункцірнага птушынага. Што ж гэта? Варона несла нешта цяжкое і выпусціла з дзюбы? Не падобна. Сарвала рэзкім парывам ветру з хваіны шышку і шпурнула ўніз? Не. Кропля зорнага дажджу, аскалачак метэарыту завітаў з касмічнага бязмежжа ў нашу ціхую Змітраўку? Не. Тады што гэта? І раптам мне ўспомніліся бацькавы словы: «Калі памру, дам табе адтуль нейкі знак, нейкі сігнал».

Я ўздрыгнуў, я сеў проста ў снег, а потым паглядзеў у студзёнае зімовае неба. І мне падалося, што з неабсяжных вышыняў пазіраюць на мяне, цёпла і клапатліва ўваходзяць-усяляюцца проста ў душу самыя родныя, самыя сінія на зямлі вочы. Дзе ж ты, бацька?

Пішу гэтыя радкі, успамінаю цябе, мой Марцін, мой еўрапеец, мой вуніят. І мне добра.



Фота franciscanas.org.br



Анатоль ВЯРЦІНСКІ

Духоўны знак



Фота www.news.ru

Адзін дзень у БНР

(Паводле праекта Беларускай службы Радыё Свабода, прысвечанага 90-годдзю БНР)

Самая лепшая з улад —
Тая, што раіцца з кожным і ўсімі,
Тая, дзе мудрасць у пашане і сіле,
Тая, дзе ўвесь народ — урад.
З ранейшага верша «Раіцца» (1966 г.)

Адзін толькі дзень?
Усяго адзін?
Усяго толькі некалькі гадзін? —
пытанні я задаю сабе.
І сам у сябе шукаю адказу.
Адказ знаходзіцца неяк адразу:
«Справа ж не ў колькасці, а ў цане».

Справа не ў тым, колькі, а як,
як дзень той прайшоў,
як быў ён пражыты,
які быў ягоны духоўны знак,
як там пачуваўся люд паспаліты.

Спрабую ўявіць гэты дзень, тых людзей.
Спрыяе вось гэтая фотакартка,
гэты адбітак слаўных падзей:
«Бурбіс, Варонка, Смоліч, Захарка...».
Дзевяцера сталі ў адзін рад.
Яны: Сакратарыят Народны.
Наш першы беларускі ўрад.
Насамрэч беларускі, родны.
Я зноў углядаюся ў воблікі іх.
Я з імі вітаюся, я ў іх пытаюся,
я з імі ў БНР вяртаюся.

Мне дораг дня таго кожны міг.
Жыва ўяўляю пачатак дня.
Займаецца ярка і ціхамірна.
Затым напаўняецца цішыня
гукамі пранікнёнага гімна.
У гімне пяецца пра «вольны прастор»,
пяецца пра «дух беларускі, родны».
Найначай пяе свабодны хор,
свабодна пяе пра народ свабодны.

Гучыць неўзабаве нейчы зварот...
Варонкі? Крэчэўскага? Езавітава?
З цікавасцю слухае. Так менавіта.
(На тое ж яна і БНР,
каб не фальшывілі мы, не хлусілі,
каб тут былі ў законнай сіле
праўда, сумленнасць і давер.)
Да ранніх тых спеваў, прамоў і званоў, —
паважліва слухаюць места і вёска, —
лучацца словы іх верных сыноў —
Луцкевіча, Ластоўскага, Лёсіка.
Няцяжка, мяркую, цяпер уявіць,
як гэты дзень далей адбываўся,
на лёсе народным як адбіваўся,
вілася далей як ягоная ніць;
якімі, цягам часу, былі
ягоныя поўдзень і адвячорак,
якія аблокі над імі плылі,
колькі ўзыходзіла над ім зорак.

Ва ўсякім разе — мой родны край
засвойваў дзяржаўным чынам строга:
«І сам жыві, і другому давай...»,
«Не рабі ліхога і не бойся нікога...»,
«Каб не памерлі, не згінулі каб,
не пакідай матчыну мову,
мову сваю шануй, як скарб,
цані, як заруку, як аснову...»,
«На Бога разлічвай, у Бога вер,
ды й сам не гніся, за справу бярыся...»...

Так мне ўявіўся ў агульных рысах
жыцця адзін дзень у БНР.
2007—2008, Стары Лепель — Менск

Ода электрычнасці

Ніне Мацяш

Прысніўся сон —
страшэнны, змрочны:
блукаю ў пошуках свайго жытла,
блукаю без надзеі і святла...

Прачнуўся на зыходзе ночы.
І гэтым сном цяжкім разбіты,
прыходзіў доўга у сябе.
Нарэшце ўгледзеў на сцяне
знаёмыя да болю рэквізіты:
то бок — разетку, шнур і бра.

Ура! Не ходзіць ліха без дабра.
Пакуль ты мроіў роспачныя сны,
жыла сваім жыццём электрасетка,
цябе чакалі ў галавах яны —
электрапровад, лямпачка, разетка.

Намацаў выключальнік машынальна.
І ўраз яскрава-асляпляльна
святло запаланіла мой пакой
і стрэс начны зняло, нібы рукой.

«Жывём!» — падумалася.
Ёсць ён, электрычны,
загадкавы такі і такі звычны,
не відавочны, але й не містычны,
ток электрычны, светланосны ток.

Ён тут як тут. Мой асвятлів куток.
І ўспомніліся з гэтае нагоды
радкі, напісаныя ў добры час:
«Зла са святлом змаганне йдзе заўсёды.
Няхай святло перамагае ў нас!».

І ў думках слаў я ўдзячнае вітанне
на адрас паэтэсы з паэтэс
й... белаазёрскай яе ДРЭС,
ім разам дзякаваў за ратаванне.

А потым падаспела і світанне...
2007

Лясныя асацыяцыі

Павалу Севярынцу — аўтару «Лістоў з лесу».

Новыя рыфмы: П а в а л і леса-п а в а л.
І жанр нейкі новы зусім: лісты з лесу.
Літаратура старая, бывай!
Хоць, праўда, прагрэс гэты
горш ад рэгрэсу.

У лесе пісаліся,
з лесу ішлі лісты.
Дзякаваць Богу, што лес гэты
наскі, блізкі,
не самы глухі, не самы густы,
не беспрасветны —
накшталт тайгі сібірскай.

Там, у сіблагаўскай
тайзе
не пісалі лістоў.
Калі хто рашаўся —
ляцелі крывавыя пырскі,
на белым снезе радок чырванеў...
Пагатоў — каралі без права перапіскі.

У нашым разе
з лесу ўшлі лісты.
І нават адольвалі
шлях да друку няпросты.
Спрыялі, пэўна,
родныя дрэвы-кусты...
«Ой, бярозы ды сосны,
партызанскія сёстры...»
«Лясная песня», «Лясная быль»...
І вось працяг тэмы — «Лісты з лесу».
Тэма старая —
новы змест і стыль.
Нешта ўсё-ткі накшталт прагрэсу...
2007

Сінявокая ў масковіі

Сучасная казка

Ці то ясным днём, ці то ў непагадзь,
ці то раніцай, ці то вечарам
ды дайшла-даехала, Сінявокая,
да ўладарства трыдзявятага,
трыдзясятага таго царства
са сталіцаю Белакаменнаю,
Залатаглаваю, Першапрастольнаю,
з гэтай самаю Масковіяй.
Пакланілася ёй нізка
і спыталася нясмела:
— Ты скажы мне, Масква-Масковія,
як вітаць мне цябе, якой моваю
мне пачаць размову з табою?
Сказаць ветліва: «Добры дзень!»?
Сказаць: «Добры дзень у хату»?
Альбо, можа, неяк інакш?

Ухмыльнулася Белакаменная,
усміхнулася Залатаглавая,
засмяялася Першапрастольная
і адразу ж адказала:
— Ну й дзівачка ж ты, Сінявокая,
вочы сінія, наіўныя!
Задаеш мне такое пытанне...
Ты напраўду не знаеш, не ведаеш,
як са мною трэба вітацца
і якой гаварыць са мной моваю?
Ты хіба не знаеш, не ведаеш,
што найлепшая з усіх моваў —
гэта мова мая, маскоўская,
гэта мова мая, расійская.
Ты спытаеш, чаму найлепшая?
А таму, што магутная самая,
а таму, што самая гучная,
і ёй дадзена ўладарыць,
панаваць над іншымі мовамі.
І навошта тваё гэта смешнае
«добры дзень... добры дзень у хату...»,
калі ёсць маё «здравствуйте!.. здрасте!..».
Зразумела, Сінявокая?

Тая колькі хвілін маўчала,
бо сумелася ад нечаканасці.
А затым прамовіла ціха:
— Не, не ведала я... Я думала...
А я думала, Масковія...

Засмяялася Першапрастольная:
— Во цікава... Яна думала...
Што ж тут думаць, Сінявокая,
калі тут і думаць нечага,
калі ўсё і так зразумела!
Казаць трэба: «Здравствуйте!..
здрасте!..».

Адазвалася Сінявокая,
ціхім голасам сказала:
— Калі я да цябе ішла-ехала,
то была ў галаве адна думка,
і была гэта думка пра тое,
што, шаноўная Масковія,
мы не толькі суседкі блізкія,
а мы сёстры родныя, крэўныя,
ва ўсім роўныя мы з табою,
што мы любім адна другую,
і таму ты не будзеш смяяцца
з маёй мовы, з майго прывітання:
«Добры дзень... дзень добры ў хату!».

Засмяялася Першапрастольная,
усміхнулася Залатаглавая,
ухмыльнулася Белакаменная:
«Здрасте, здрасте, Сінявокая!
Значыць, вось ты пра што думала
сваёй буйнаю галоўкаю,
значыць, вось ты чаго захацела...
А ці знаеш ты, а ці ведаеш,
што хоць сёстры мы, ды няроўныя:
ты — малодшая, я — старэйшая,
ты — малая, а я — вялікая
і ва ўсім за цябе я большая.
Пра любоў ты нешта сказала?
Дык вось слухай, сястра-сястрыца,
Сінявочка дарагая.
Ёсць падставы ў мяне сумнявацца,
што напраўду мяне самую
бескарысліва ты любіш.
Не мяне ты любіш, здаецца,
а найперш — мае грошы-траншы,
а найбольш — мой газ, маю нафту.
Ці не ўся тут любоў-сімпатыя?
Ці не так, сястра-сястрыца,
мая лепшая хаўрусніца
і саюзніца мая першая?

Разгубілася Сінявокая.
Разгубілася, сумелася,
засмуцілася і заплакала,
Паліліся з вачэй яе сініх
слёзы светлыя, буйныя.
Адно толькі з плачам казала:
— А я думала... а я думала...

Ухмыльнулася Белакаменная,
усміхнулася Залатаглавая,
засмяялася Першапрастольная,
запыталася ў Сінявокай:
— Пачакай... Што з табой, дарагая?
Ты заплакала? Ты плачаш?
Але ж ты дарма гэта робіш,
але ж слёзы твае марныя.
Ты хіба не знаеш, не ведаеш,
што Масква слязам не верыць?
Так, не верыць слязам спрадвеку.
Ні буйным не верыць, ні дробным,
ні салёным і не горкім,
ні чужым і не сястрынскім.
Ты хіба не ведаеш гэта?

— Я ці ведаю?.. Ці знаю?..
Не, я думала... я думала... —
прычытала ў адказ Сінявокая,
выціраючы слёзы горкія.
Хутка-хуценька засабіралася
у зваротны шлях-дарогу,
да сваіх абсягаў-гоняў,
да сваіх азёраў сініх
і да рэкаў сваіх блакітных.
І якраз у гэты момант
зазванілі-забілі куранты,
тыя, што на крамлёўскай вежы,
нібы звонам сваім пацвярджалі
(так пачулася Сінявокай),
што не верыць слязам Белакаменная
і не верыць Залатаглавая,
што яе нехта шчыра любіць
(хіба можна любіць за нафту?).
І яшчэ ў тым звоне адметным
яўна чулася Сінявокай,
што яна, Першапрастольная,
прызнае адно толькі вітанне
на адной толькі, гэтай вось мове:
«Здравствуйте... здрасте-здрасте...».

Тут і казцы канец, якую
я пісаў то пяром, то алоўкам
то ўранні, то познім вечарам
і назваў недарэмна сучаснаю,
бо яна сапраўды такая.
2015



Сяргей ЗАКОННІКАЎ

Знак свабоды

Цёплы пыл

Майму маленству прысвячаю

Што праходзіць
Праз увесь мой гонкі лёс?
Што найперш успамінаецца заўсёды?
Цёплы пыл у каляінах ад калёс
На шляху,
Што паўстае,
Як знак свабоды.

З вёскі ціхай
Шлях пралёг паміж азёр,
Ён рассек
Палі,
Лугі,
Дубровы,
Пушчы,
Ён наступнаму адтуліну прадзёр,
Каб я стаў да волі
Чуйным і відушчым…

Аглядаючы абсяг жывых гадоў,
Што ў сабе неспадзявана назапасіў,
Бачу, як брыдуць маруднаю хадой,
Узнімаючы пылок,
Каровы з пашы.

Крочу ўслед,
Прапахлы сонцам, малаком,
Дзень стаміў,
Бо бегатнёй ушчэнт загушкаў.
Мне зара
Чырвоным доўгім языком
Ліжа рыжую, віхрастую макушку…

Цёплы пыл,
Як час,
Між пальцамі працёк,
Ён гаіў не раз
Балючы лёсу выверт,
Ён сагрэў
Мой першы знойдзены радок,
І душу да вольнай волі ўрэшце
Вывеў.

Дыктат

Усё ўжо сказана да нас,
Але радкі дыктуе час.
Дыктуе свет, які наўкол:
Лясы,
Азёры,
Рэчкі,
Дол.
Дыктуе кожны чалавек,
Бо ён — загадкаю спрадвек.
Дыктуе вораг,
Сябра,
Брат,
Суаўтараў дыктуе шмат…

Я прызнаю такі дыктат!

Зямля

Ці папытаўся ты ў сябе калі:
«Дык што мяне трымае на Зямлі?».

Мая выснова простая зусім:
Любові прыцягненне —
Над усім.

Ёсць войны,
Подласць,
Катаванні,
Кроў…
Але непераможная — любоў!

З нас кожны ў дол кладзецца,
Як вянец,
Зямля — людскі пачатак і канец.

Усіх яна ва ўлонне прыняла —
І вестуноў дабра,
І вояў зла.

Адпрэчыць прыцягненне не змаглі…
Бо мы — зямля,
Хоць ходзім па Зямлі.

Няўмольны час

Час — наш няўмольны валадар,
З ім фінт хлусні не выгарыць.
Кідае ён пальчатку ў твар,
І паядынак выйграе.

Жыццё няўлоўнае, як дым,
У вечнасць вецер ссоўвае,
І трэба пагадзіцца з тым,
Што ўсе і ўсё —
Часовае.

ZERN: эксперымент «Вялікі Выбух»

Нашто вандроўнаму паэту
Прыпынак доўгі ў тых краях,
Дзе розумы з усёй планеты
Даследуюць Сусвету шлях?

Навошта пра калайдар звесткі
Таму, хто ў Францыю ляцеў,
Каб лекі, як хутчэй, прывезці —
Шанц для чарнобыльскіх дзяцей?..

Карціць вучоным вынік выдаць,
Зрабіць у невядомасць крок:
Імітаваць Вялікі Выбух —
Да Часу і Жыцця штуршок.

Але пакуль часцінкам робяць
Нязнаны — лоб у лоб — прымус,
Ад іх у Ветцы ці ў Нароўлі
Канае хворы беларус.

То ўдалы ўдар пучкі раскрошыць,
То намаганні ўсе дарма…
А я кую паэмай грошы,
Каб медыцыну падтрымаць.

Хоць пальму першынства заўсёды
Цікаўным фізікам аддам,
Ды не хачу, каб флірт з прыродай
Зямлю ператварыў у хлам…

Жыццё — нібыта лёгкіх выдых,
Як бы расіначка адна…
Навошта мне Вялікі Выбух,
Калі паўсюль грыміць вайна?

Студэнцтва

Калі мой век пражыты растасоўваць,
Па значнасці гады збіраць на веча,
Студэнцтва стане светлай паласою,
Якая здольная жыццё падсвечваць.

Але з вышынь,
Дзе рэй вядзе практычнасць,
Цяпер лягчэй прыйсці
да праўды голай —
Усё было даволі рамантычным,
Калі не ўлічваць пастаянны… голад.

Выбілі лепшых

Улада не любіць разумных людзей,
Ёй больш да спадобы —
Грошы,
Распуста.
Калі на трон запаўзе прахіндзей,
То ў наваколлі становіцца пуста.

Стагоддзя апошняга каламуць
Завершана найвялікшым
скандалам…
Хоць паўтаралі: «Усіх не заб'юць!»,
Але сапраўдных засталося мала.

Інтэрв'ю

Шлях у вечнасць западае лістам,
Бо бярэ пачатак ён з зямлі…
Абяцалі стрэцца журналісты,
Толькі да паэта не прыйшлі.

Адкладалі гутарку на потым,
Каб цяпер бязгучна мовіць: «Ах!».
Ён знікае там — за паваротам,
А над ім імгліцца Млечны Шлях.

Небу пажаліцца некаму

Спорненькі дожджык.
Вымак пінжак.
Неба жальбуе над доляю.
Крыўда наўмысная?
Можа, няўзнак?
Мне разгадаць не дазволена.

Нейкі ў прыродзе нябачаны збой,
Зроблены ён недарэкамі…
Ты можаш плакацца тым,
Хто з табой…
Небу пажаліцца некаму.

Заходняя Дзвіна

Ёсць у мяне свая рака,
Яна цячэ, як кроў у венах.
Дзе б я ні быў, што б ні шукаў —
Успамінаецца імгненна.

Я службу, як яна, нясу
У свеце, што ўсё больш лютуе,
І нават самы светлы сум
Ад грозных думак не ўратуе.

Мая віна ляжыць у тым,
Што на вачах рака мялее,
Што быў пясочак залатым,
Ды стаў даўно ўжо клейкім глеем.

Цень карабельнае сасны,
Водаахоўныя палосы
Шмат год знішчалі дзікуны
Пры патуранні безгалосым.

А сонечныя берагі
Спавіты невыносным смогам,
Бо за няясныя даўгі
Узяты фермамі ў аблогу…

Сініцу маю я ў руцэ,
А чым памог сваёй рацэ?
Цячэ Заходняя Дзвіна…
Расце, расце мая віна…

У табе

Ты — у нязнанасць казачныя дзверцы,
Ты — самы дасканалы інтэрнэт…
Усё змяшчаецца ў маленькім сэрцы,
Хоць за вакном шуміць вялікі свет.

Дзень новы
Шчодра праўдай не надзеліць,
Ён зноў хлуснёй
Па мазжачку дзяўбе…
А самыя сур'ёзныя падзеі
Вось зараз адбываюцца ў табе.

Бяззубыя псы

Снег выпаў,
І зноўку бяззубыя псы
З дрымоты ляцяць у сваволю,
Бо спрактыкаваныя ў нюху насы
Учуялі пах звабнай волі.

Ля будак утульных
Ляжаць ланцугі…
Там быць трэба ў час і дарэчы,
Дзе зло наразае мярзоты кругі,
Каб годнасць людскую нявечыць.

На ўскрайку жыццёвай крутой паласы
Выдатнай павінна стаць гонка…
Ну што, пабрацімы — бяззубыя псы,
Яшчэ павалтузім падонкаў?

Апошні сон

«Nox est perpetua una dormienda».
(«Нас усіх чакае вечная ноч», — лац.)

Мы з вечнай цемры ў белы свет
Прыходзім,
Каб пагасціць і назаўжды сысці.
Кругаварот,
Што вяршыцца ў прыродзе,
Прымае ўдзячна кожны пры жыцці.

Ёсць сэнс вялікі ў змене пакаленняў,
Каб чалавецтва курс трымала свой —
Ад дня невыпадковага стварэння
Прастор і час пранізвала стралой…

Мае нашчадкі — васілёчкі ў жыце,
Жадаю вам
Трыльён шчаслівых дзён!..
Сваю Зямлю і Волю беражыце…
А я пайду глядзець апошні сон.

Вышук

Так павялося ў свеце з даўніны,
Што за людзьмі,
Якія годнасць маюць,
Цікуюць несупынна таптуны —
Падслухваюць,
Падглядваюць,
Здымаюць.

Куды б мяне дарогі ні вялі,
Хавацца ад віжоў няма патрэбы.
Не страшны злосны вышук на зямлі…
Я помню,
Што за мною сочыць Неба.

Любоў невыведная

Сяджу пад вярбінаю ніцаю,
Гляджу на запылены шлях…
Усыпаны часу абсяг,
Як зоркамі,
Скрозь таямніцамі.


Пакінуў любоў невыведную
Той век, што пасланы на злом:
Усіх адарыў серабром,
І мне даў капеечку медную.



Фота Антона Кірыка

Чорны чалавек на зялёнай канапе

Фрагменты аповесці



Уладзімер АРЛОЎ

1

Вы, пэўна ж, чулі выслоўе *Habent sua fata libelli*, а ў перакладзе з лацiны — *Кнігі маюць свой лёс*... Яно належыць сучасніку Марка Аўрэлія старажытнарымскаму граматыку Тэрэнцыяну Маўру і насамрэч мае ці то свядома — калі казаць пра самiх аўтараў кніг — ці то проста, праз адвечную чалавечую ляноту, прызабыты і амаль згублены ў стагоддзях працяг: *адпаведна таму, як іх прымае чытач.*

2

Колькі гадоў таму я прыехаў у родны горад, каб нарэшце напісаць аповесць, якая нібыта даўно выспела і прасілася на волю, але класціся на паперу ў сталіцы — з самых розных, як уяўлялася, неістотных прычын кшталту позняй вясны, лёгкага абвастрэння піеланефрыту або даждлівага чэрвеня — катэгарычна адмаўлялася. Можна сказаць, што яна, яшчэ не перакладзеная на словы аповесць, нагадвала спакуслівы залацістабокі, з румянцам яблык, якому, тым не менш, хочацца даць трошкі часу, каб ён за пару пагодлівых дзён стаўся налітым і паказаў бы ў глыбіні жывога светлага бурштыну цёмныя кропелькі зярнятак, дзе запісаныя таемныя сэнсы, датычныя і гэтага плода, і яблыні, і цэлага саду.

У выніку было вырашана — пагатоў на небе нарэшце трывала атабарылася сонца — скарыстацца ад'ездам сястры ў адпачынак і, як ужо не раз бывала, ператварыць у кабінет адзін з пакояў ейнай вялікай чатырохпакаёвай кватэры, што засталася нам у спадчыну ад бацькоў на трэцім паверсе пяціпавярховіка з зацішным зялёным дваром, спакой якога, праўда, цяпер парушала аўтапаркоўка каля суседняга гатэля.

Дом з аднаго боку стаіць блізка ад Дзвіны, а з другога — ад ляснога возера. Такім чынам, у перапынках паміж працай я мог не толькі выпраўляцца на бясшлюмную праходку, але і дасхочу плаваць, выбіраючы, залежна ад настрою, раку з моцнай пругкою плынню або азёрны спакой у атачэнні ялін і хвояў.

3

Першы ж дзень на самоце, засведчыў, што інтуіцыя не падманула: увечары паўтузіна спісаных і скрэмзаных старонак легла са стала на падваконне. Тут трэба патлумачыць, што я старамодна пішу пачатковы варыянт ад рукі асадкай і адно потым прысаджваюся да кампутара.

Мой светлы драўляны стол месціўся пры акне ў таксама светлым сонечным пакоі, куды трапляеш з доўгага і прасторнага калідора, што адначасова служыць і вітальняй. Злева ад стала роўнядзь зеленаватай сцяны займаюць ясеневыя кніжныя шафы з некалькімі паліцамі нашых дзіцячых кніг, што робіць пакой асабліва прытульным.

Калі сядаеш за стол, за спінай апынаецца зялёная велюравая канапа з трыма падушкамі. Туды, на канапу, падчас маіх прыездаў звычайна перасялялася сястра, саступаючы мне шырокі ложак у колішняй бацькоўскай спальні, што ў канцы калідора направа.

4

Тэрэнцыян Маўр, а разам з ім і вядомы афарызм засталіся ў гісторыі дзякуючы вершаванаму трактату «Пра літары, склады і метры Гарацыя». Імя аўтара сведчыць пра паходжанне з рымскай правінцыі Маўрытаніі, абшар якой сённяшнія навукоўцы называюць краінамі Вялікага Магрыбу. Інача́й кажучы, Тэрэнцыян быў цемнаскурым маўрам, або, па-нашаму, мурынам.

5

Кожны літаратар ведае: сумовіцца з аркушам паперы, што палохае цнатлівай нерушшу, або з маніторам кампутара, які асабіста мяне напачатку злёгку жахае, бо, дзякуючы вочку відэакамеры, падаецца амаль жывой істотай, — занятак не з самых лёгкіх. Таму, сказаўшы, што працаваў з насалодаю і не зважаў на гадзіннік, я апынуўся б далекавата ад ісціны. Я не забыўся ні разагрэць пакінуты сястрой на першы выпадак абед, ні спусціцца да паштовай скрыні, ні — дзеля моцнай чорнай гарбаты з цытрынай, мёдам і тэленавінамі на канале Euronews — патануць тры разы ў сваім улюбёным скураным фатэлі ў гасцёўні.

Але тое, што адзін з калегаў называў неспадзяванкаю душы, а другі — больш кваціста і нясціпла — пошумам анёльскіх крылаў, усё ж здарылася. Пасля гарбаты а пятай адчуванне часу неўпрыкмет знікла. Нягледзячы на цудоўнае надвор'е і падрыхтаваны ручнік з плаўкамі, я забыўся і пра паход на Дзвіну, і пра вячэру, на якую сястра пакінула, відаць, з намёкам — маўляў, не разамаўляй, а пішы — вараны цялячы язык.

Аднак не буду ідэалізаваць сябе: пра вячэру я ўспомніў. Адчувалася, што яшчэ здатны з разгону напісаць старонку-паўтары новага раздзела, якія ўжо бачыў перад сабой, прычым менавіта так — старонку і ладны хвост на наступнай — ды абмежаваўся тым, што зрабіў накід з падкрэсленымі словамі-ключыкамі, якія заўтра мусілі адамкнуць абзацы і цэлыя старонкі.

Прыстоіўшы каля кніжных шафаў, я з удзячнасцю правёў рукой па карэньчыках выданняў на трох верхніх паліцах, дзе заслужана адпачывала чытанае-перачытанае ў дзяцінстве. Пальцы прайшліся па ружовых тамах Вальтэра Скота і блакітных Аляксандра Грына, затрымаліся на чорных, як і належыць, томіках Эдгара По...

У зборы твораў Фенімора Купера адной малахітавай кнігі не хапала: яе нахабна, ледзьве не на вачах, сцягнуў некалі, схаваўшы за пазуху, мой аднакласнік, апантаны гульнямі ў індзейцаў, сярод якіх ён зваўся братам Вялікае Вуха. Аднакласнік даўно жыў у Амерыцы і трымаў недзе на мяжы з Канадай рэстаран. Магчыма, усміхнуўся я, такому лёсу паспрыяў якраз скрадзены том, і купераўскія матывы гучаць у інтэр'еры ягонай харчова-пітной установы. Мо і сама тая кніга знайшла пачэснае месца паміж аўтэнтычнымі тамагаўкамі і, трэба спадзявацца, несапраўднымі скальпамі бледнатварых ворагаў. Цікава, які ў Вялікага Вуха спіс страваў? Ці знойдзецца штосьці з таго, чым кармілі нас маці ў дзяцінстве? Напрыклад, класічны дэсерт — халодная вараная бульба з бруснічным сочывам?

Урэшце думкі пра ежу скіравалі мяне на кухню, уваход у якую знаходзіўся цераз калідор і трохі наўскос ад кабінета. За вакном апусцілася на горад мяккае і ўтульнае ліпеньскае сутонне, і па двары, павольна запаўняючы сабою ўсе закуткі, плыла цішыня. У абладзе ціхай радасці ад таго, што ведаю, як узяцца за тэкст заўтра, я меўся аздобіць вячэру келіхам-другім прывезенага з сабой чылійскага шыразу.

6

Там, на кухні, разглядваючы вінную этыкетку, я і адчуў, *што ў кватэры прысутны хтосьці яшчэ.* Раптоўнае адкрыццё змусіла перахапіць неадкаркаваную пляшку за рыльца. Пасля кароткага роздуму я перакінуў гэтую зброю ў левую руку, у правай сціснуў самы вялікі кухонны нож і асцярожна ступіў у калідор.

Першае павярхоўнае абследаванне кватэры не прынесла ніякіх вынікаў. Надзейныя дубальтовыя дзверы на лесвічную пляцоўку былі на моцнай металёвай засаўцы. Пластыкавыя вокны прачыненыя зверху, і ўіх, апрача мух і камароў, маглі заляцець хіба што матылёк і, пры моцнай ахвоце, верабей.

Але адчуванне чужой прысутнасці не пакідала, а рабілася мацнейшым. Яно прымусіла рассунуць у спальні дзверцы шафы-купэ і перабраць вешакі з сястрынымі сукенкамі, каб упэўніцца, што за імі або ў іх самiх ніхто не затаіўся. Зазірнуўшы дзеля прыліку пад ложак і напалохаўшы порсткага павучка, я з парога зноў уважліва абвёў позіркам гасцёўню. Упэўніўся, што нікога няма ні ў кабінеце, ні ў маленькім пакоі паміж спальняй ды кухняй, які некалі служыў у бацькоў спальняю для гасцей. У вітальні я падміргнуў расхваляванаму чалавеку ў вялікім авальным люстры. Чалавек з люстра міргнуў у адказ, тым самым сведчачы, што з ягонай прасторы ў маю ніхто пакуль што не патрапіў. *Праінспектаваўшы* прыбіральню з лазенкай, я вярнуўся да круглага кухоннага стала і ўсё ж вырашыў — перадусім дзеля супакаення — выпіць келіх віна. Перапрацаваўся, паспрабаваў я ўголас растлумачыць свой стан, ды атрымалася зусім непераканаўча.

Корак з пляшкі выйшаў так звонка, нібы шніпар быў у руках у некага іншага. *Нервы... Яно, можа, і не дзіва, калі ўзяць пад увагу, што ты пішаш.*

Мая аповесць, умоўна кажучы, прысвячалася самнамбулам. Спярша гэта былі трое дарослых — Настаўнік, Залаціставаласая і Кіяскёрка, а таксама двое падлеткаў — Гімнастка-васьмікласніца ды крыху старэйшы за яе хлапчук, ад імя якога і распавядалася гэтая гісторыя. Ён быў адзіны, хто, прачнуўшыся, усё памятаў, таму што раней бачыў адбытае і на яве. Яны збіраліся з розных канцоў горада на даху недабудаванага закінутага гатэля і танчылі пад зоркамі, каб пасталець, згубіцца ў вялікім свеце і зноў — каму пашанцуе — сустрэцца ў маўклівым паўночным танцы ў памяць пра тых, хто танчыць на дахах ужо ў тагасветных гарадах. Разам з людзьмі ад самага пачатку танчыла Котка — нібыта звычайная трохколерная бела-чорна-рудая рыска, аднак з дзівосна доўгім хвастом, які, перакінуты на спінку, даставаў да вушак.

Шыраз трапіўся сапраўдны — густы, цёмна-фіялетавага колеру, букет, як і ўласціва гэтаму віну, бліжэйшы не да садавіны, а да спецыяў, з выразнымі смакавымі адценнямі шакаладу і чорнага перцу. Адмысloўцы, згадалася мне, нездарма называць шыраз вінoм пачуццёвым ці нават непрыстойным.

Ды падмануць сябе не ўдалося: думкі пра віно існавалі самі сабой, а ўся істота наструнена прыслухоўвалася да кватэры, прымушаючы ўнутраны зрок зноў, пачаўшы ад спальні, сканаваць пакой за пакоем.

Праз колькі імгненняў келіх з вінoм ледзь не выпаў з рукі. Цяпер я ўжо напэўна ведаў: *хтосьці ў кабінеце.* Прысутнасць гэтага *кагосьці* лакалізавалася на зялёнай велюравай канапе. Вольна адкінуўшыся на падушкі і паклаўшы нага на нагу, на канапе сядзеў... абсалютна чорны чалавек.

7

Каб авалодаць сабой, я зрабіў глыток, затым другі і трэці. Шыраз цалкам страціў нядаўнія ўласцівасці, перайначыўшыся ў шараговае пітво айчыннай фірмы «Ambassador», якая з аднолькавай сыравіны паспяхова вырабляла амаль што ўсе на свеце віны. Я механічна дапіў келіх і падняўся. Сказаўшы, што дзейнічаў рашуча, я нахабна б схлусіў. Праўдзівым было б іншае слова — зацкавана. Аднак я зрабіў некалькі крокаў, выйшаў у калідор і, таймуючы сэрца, асцярожна зірнуў у прачыненыя дзверы майго часовага кабінета. Як і чакалася, там нікога не было. І разам з тым *ён*, бясспрэчна, знаходзіўся ў гэты момант на канапе.

Зноў апынуўшыся на кухні, я зразумеў, што здолею разгледзець *яго* лепей. Першы раз здалося, быццам Чорны чалавек голы, але на ім выявілася нешта накшталт цёмнаатрамантавага, з лёгкім серабрыстым адлівам трыко. На нагах ён меў чорныя, нізкія і пляскатыя пантофлі з даўгімі, загнутымі ўгару мыскамі. Такі абутак можна ўбачыць на палотнах старых майстроў ва ўборах прыдворных блазнаў, хоць мой няпрошаны госць выдаваў на каго заўгодна, але не на блазна. З тае прычыны, што ён сядзеў, рост вусцішнага візітанта заставаўся нявызначаным, і пра яго мне наканавана было даведацца адно праз два тыдні.

Спадабаўшыся самому сабе, я даволі спакойна выпіў другі келіх шыразу. Рука не трымцела, віно вярнула сабе смакавыя якасці і прыемна паколвала язык.

Чорны чалавек, які рабіўся невідочным, калі я зазіраў у кабінет, і матэрыялізоўваўся, як толькі я адводзіў пагляд, ані не нагадваў аблічам мурына — ні класічнага жыхара экватарыяльнай Афрыкі, ні чарнаскурага амерыканца. Не выдаваў ён — тут, мяркую, са мною пагадзіўся б і Тэрэнцыян Маўр — і на жыхара Магрыбу, дзе мне калісьці пашчасціла тыдзень павандраваць і нават выключыць з гульні двух скарпіёнаў.

Еўрапейскія рысы твару, у меру высокі лоб, прамы, з

няўлоўнаю гарбінкаю нос. Валасы кароткія, але не ў дробныя кудзеркі, як руно, а — густы падрослы вожык і такая самая кароткая кучаравая барадка. Вызначыць колер вачэй у прыцемку не ўдалося, але яны падаліся агатавымі, не, лепей сказаць, чорнаслівовымі.

8

Выратавальную, як выглядала спачатку, думку — затэлефанаваць некаму з сяброў і, вымысліўшы праўдападобную прычыну, папрасіцца начач — я цвёрда пастанавіў не разглядаць. Па-першае, час набліжаўся да поўначы. Па-другое, хатні тэлефон стаяў на паліцы ў кабінеце, і тамсама, на стале побач з рукапісам, я пакінуў мабілку. Па-трэцяе, госць, хоць і стварыў у кватэры напружанне, відавочна не ўяўляў сабой непасрэднай пагрозы. Апрача таго, кожны з нас знойдзе ў памяці, прынамсі, адно здарэнне, якое аніяк немагчыма вытлумачыць у звыклай сістэме матэрыялістычных каардынатаў.

Карацей, ад намеру сысці да сяброў, на недалёкі адчынены ўначы аўтавакзал або проста на лавачку ў парку каля ракі, бо ноч была аксамітава цёплай, я адмовіўся. І не без палёгкі. Едучы да сястры, я пастанавіў унікаць сустрэч са знаёмымі, каб не парушыць неабходнай адзіноты. Дый адваротны варыянт — сыход з дому — стаўся б маладушнымі ўцёкамі. Хто ведае, што атрымалася б у выніку. Напрыклад, ці не была б кватэра, калі я вярнуся, зачыненая на засаўку ззярэдзіны?

Дзеля смеласці я выцадзіў новы келіх віна, а тады досыць бадзёра накіраваўся ў спальню, дзе, зачыніўшы дзверы, прылёг на неразасланы ложак і вымкнуў святло. Адчуванне *ягонай* прысутнасці не пакідала. Круцячыся на ложку, што зрабіўся страшэнна мулкім, не раўнуючы, як у матрац нехта падступна насыпаў жвіру, а падушку наладаваў пілавіннем, я ўспомніў пра *маміны вяртанні*.

Пасля пахавання мамы сястра штоночы прачыналася роўна ў дваццаць хвілін на трэцюю ад таго, што адчувала несумнеўнае маміна з'яўленне. Яна тады спала ў маім цяперашнім кабінеце, бо мама прамовіла апошнія словы якраз там, дзе я зараз варочаўся з боку на бок, страціўшы ўсякі спадзеў знайсці зручнае месца. У сваю сённяшнюю спальню сястра перасялілася толькі пасля ўгодкаў мамінай смерці.

Мама заўсёды вярталася сюды, у пакой, дзе развіталася з намі, затым, паводле слоў сястры, выходзіла ў гасцёўню і доўга стаяла там каля вакна, гледзячы ў яго праз свае акуляры з чарапахавай аправай, але ніколі не пераступала парог вітальні. Першыя дні сястра баялася, ды неўзабаве прывыкла, аднак да трэцяе гадзіны ночы — пакуль мама не развітвалася з роднымі сценамі — ляжала без сну. Але ў адну з начэй не прачнулася, і мама з яе паслясмерця больш ніколі не завітвала.

З візітамі мамы было збольшага зразумела. Яна, пакуль канчаткова не знайшла сабе месца ў новых, таемных для нас сферах, прыходзіла дамоў. Адкуль жа і чаму акурат у на-


Фота gero.org

шай кватэры з'явіўся Чорны чалавек? Што ў яго за мэты? З якой такой прычыны ён абраў менавіта кабінет? З сумам падумалася, што мара вярнуцца дахаты з новай аповесцю ма́е высокія шанцы пайсці дымам.

9

Трэба, аднак, было неяк датрываць да раніцы. Мой лёгкі хмельны кураж тым часам стаўся ўспамінам, але задача выглядала цалкам рэальнай, паколькі Чорны чалавек не дэманстраваў варожых намераў.

Я падняўся і выйшаў у калідор. Зачыніў дзверы ў гасцёўню, зрабіў тое самае з усімі астатнімі, акрамя дзвярэй кабінета і кухні, да якіх не рызыкнуў набліжацца. Пасля, зачыніўшыся ў спальні, разаслаў ложак, расчыніў вакно, што выходзіла на паркоўку пры гатэлі, і лёг. Позняй парою паркоўка, на жаль, азвалася не ўтульнымі зямнымі гукамі, якіх прагла знерваваная душа, а густой глыбокай цішынёю.

Каб заснуць, я паспрабаваў вынайдзены ў гады студэнцтва досыць дзейсны спосаб: у адваротным парадку, ад апошняга да першага, згадваць імёны нашых вялікіх князёў і каралёў. Звычайна ўжо недзе на сярэдзіне, прыкладна на Жыгімонце Аўгусце або на ягоным бацьку Жыгімонце Старым, жанатым з італійкаю Бонай Сфорца, думкі пачыналі блытацца ў прадчуванні блізкай дрымоты, і астатнія манархі маглі адно прысніцца. Гэтым разам мае намаганні скончыліся тунна. Аўгусцейшыя асобы, пакінуўшы старадаўнія партрэты і няроўна пашыхтаваўшыся, кпліва зіркалі на бяссонніка, а Бона з Барбараю Радзівіл нечакана аб'ядналіся ў непрыхавана здзеклівым смеху.

Дапамога з'явілася, адкуль я яе не чакаў. У начной вусцішы натхнёна зазвінеў і спікіраваў на мяне камар. Ён падаўся стварэннем бясконца зямным, блізкім і родным. Беспаспяховае, але шчаслівае змаганне з камаром і дазволіла заснуць.

Я не назваў бы сон спакойным і ціхамірным. У ім мроілася, што я ўскокваю ад рыпення дзвярэй, і вачам адкрываецца іхні пусты прахон, які, між тым, зусім не пусты. Па-сапраўднаму глыбока заснуць удалося тады, калі ў вакно разам з радасным званком самага ранняга трамвая папрасіўся світанак.

10

Раніца падаравала развітанне з тэатрам сціхотных ценяў. Дапамог і кароткі начны дождж, што пакінуў мокрыя газоны ды лужынкі на падсохлым асфальце, якія павінны былі вось-вось дазвання знікнуць разам з рэшткамі трывогі. Яшчэ лежачы ў ложку, я мог бы прысягнуць, што больш у кватэры нікога няма.

Паснедаўшы аўсянкай, я з кубкам гарбаты і слоікам у шакаладзе за шчакой смела зайшоў у кабінет. На сонечнай стальніцы, як і на зялёнай канапе, нічога — калі не лічыць, што разрадзіўся соты тэлефон, — не перайначылася. Акурат затэлефанавала з санаторыя сястра. Мы паразмаўлялі на звычайныя ў такіх выпадках тэмы, і я лёгка развітаўся з прамільгнулым жаданнем запытацца штосьці накшталт: *Ці не заўважала ты калі-небудзь у пакоі з кнігамі нечага дзіўнаватага?*

Словы-ключыкі пачалі пераўвасабляцца ў сказы і абзацы раней, чым я сеў за стол. Учорашнія прыгоды надзіва не заміналі, а — прынамсі, хацелася так думаць — абвастрыўшы пачуцці, спрыялі руцэ з асадкай. Нечаканы візітант зараз успрымаўся чымсьці сугучным маім таксама начным героям, маленькая сябрына якіх удзень распадалася на незнаёмых між сабою чужых людзей.

Нядаўняя прысутнасць Чорнага чалавека ніяк не адчувалася ці, можа, выявілася ў тым, што я зноў, але ўжо асэнсавана, не пайшоў купацца. Урупіўшыся ў тэкст, я проста забыўся на начнога госця, але, калі за вакном зашарэла, у душы зварухнуўся неспакой. Чорны чалавек зараз не выглядаў плёнам гульні ўяўлення, якое ўчора на знак падзякі ці пакарання за нешта намалявала тую невераемна жывую карціну — ажно да адметна загнутых мыскоў блазенскіх пантофляў.

І надышоў момант, калі ўва мне прагучаў выразны загад ставіць на сёння кропку, інакш у кабінеце можа зрабіцца зацесна. Без панікі адступаючы на кухню, я не забыў прыхапіць мабілку, халаднаватая пластыкавая рыбінка якой прыкметна дадавала ўпэўненасці.

11

Чорны чалавек з'явіўся той самай парою. Праўда, цяпер ён сядзеў на канапе не закінуўшы нага на нагу, а роўна, з пакладзенымі на калені рукамі. Яго сур'ёзная і ўадначас мірная пастава спадабалася мне значна болей, хоць, зрэшты, што тут магло асабліва падабацца?

Удзень я з дому не выходзіў, таму вячэра была падобнай да ўчорашняй як дзве кроплі вады. Праўдзівей — не вады, а віна, бо разам з рэшткамі халоднага языка чакаў недапіты шыраз. Зрабілася ясна, як божы дзень, што Чорны чалавек — наведнік невыпадковы, і датычна яго трэба выбудаваць адпаведную лінію паводзін. Няхай, вырашыў я, гэта будзе палітыка асцярожнага нейтралітэту з магчымымі дыпламатычнымі кантактамі.

Калі б Чорны чалавек паседжваў на канапе і раней, сястра неадменна б папярэдзіла мяне і без лішніх роспытаў. Адсюль вынікала, што ягонае з'яўленне звязанае якраз з маім прыездам і, відаць, з тым, чым я займаюся.

Перад сном я зачыніўся ў спальні і паспрабаваў чытаць захопленага з дому Марка Аўрэлія. Утульны томік разгарнуўся на кнізе сёмай: *Усё матэрыяльнае вельмі хутка знікае ў сусветнай сутнасці... І памяць пра ўсё не менш хутка знаходзіць сваю магілу ў вечнасці.* Не сказаць, каб сентэнцыя надта б спрыяла добрым снам. Я перагарнуў некалькі старонак. *Уяві, што ты памёр, што жыў толькі да гэтага моманту...* Дачытаўшы да канца, я быў узнагароджаны: *а час, што табе застаўся, успрымай як дадзены звыш адмеранага і жыві ў ім згодна з прыродай.*

Я нечакана супакоіўся: *жыві ў ім, жыві ў ім...*і на мяжы яві і сну працягнуў: *жыві ў ім... пры ім... за ім... над ім... ім...* Думкі блыталіся, ды, адплываючы ў сон, я паспеў згадаць дасціпна заўважанае калісьці, што *імператар* Марк Аўрэлій стаўся адно выпадковасцю, якая напаткала філасофа з тым самым імем. *Прысніцца можаце абодва*, запрасіў я, аднак з Маркам Аўрэліем у тую ноч спаткаўся хтосьці больш шанцоўны.

12

Шторанціцы, папіваючы першы кубак наймацнейшай за цэлы дзень гарбаты, я перачытваў напісанае напярэдадні і вяртаўся да сваіх танцораў. А мо гэта яны вярталіся да мяне, і я па чарзе нейкай часткаю істоты пераўтвараўся ў аднаго ці ў адну з іх, не мінаючы і Коткі. Каб перанесціся ў іхні свет, часам я нават пачынаў танчыць, робячы зусім маленькія, адпаведныя памерам кабінета, колы. Нарэшце хтосьці з маіх нябачных, але ўсё больш адчувальных партнёраў дакранаўся мне да рукі або да пляча. Гэта і служыла знакам таго, што вяртанне здзейснілася. На колькі гадзін я забываў і пра Чорнага чалавека, і, калі шанцавала, пра ўсё астатняе.

13

Травеньская ноч была цёплай і чуйнай. Шчыльныя аблокі захінулі месяц і зоркі, аднак, ратуючы ваваколле ад цямрэчы, злёгку свяціліся самі. Як звычайна, мы збіраліся па адным, але Залацістая з Коткай заўсёды чакалі астатніх каля квадратнага люка, усё роўна як і не пакідалі даха з мінулага разу.

Тонка праспявала нябачная страла, і ўслед за ёю недзе ўзляцела рука таямнічага дырыжора. Узляцела і застыла ў найвышэйшай кропцы, каб праз няўлоўнае імгненне даць сігнал музыкам...

Мы паспелі прайсці некалькі колаў, мяняючы хуткасць ды накірунак і пакрысе напаўняючы танец усё большай энергіяй, як раптам нас зрабілася не шасцёра, а сямёра.

У паветры ціха прашамацелі крылы, і на плячук Гімнасткі апусцілася дзіўная начная птушка, падобная да грака, але з двума ярка-зялёнымі пералівістымі пёрамі на баках і такой самай абламоўкаю чорнай шыі. Трэцяе пяро — доўгае і вузкае, спакойнага салатавага колеру — трымала ў дзюбе. Прыгледзеўшыся, я зразумеў, што гэта не пяро, а стрэлка аеру.

Як выглядала, ні Гімнастка, ні хто-небудзь яшчэ з танцораў, апроч мяне, не заўважыў нябеснай госці. Адно Котка насцярожылася і наставіла поўсць так, што стала добра відаць ейная абсалютна круглая ружовая плямка-пячатка, выпаленая некім ці нечым на падчарэўцы справа. Але праз хвілю наша чатырохногая танцорка ўжо ўсім сваім выглядам паказвала, што ніякае небяспекі яна не адчула.

Птушка не замінала танцу, і ён ні на момант не перапыняўся — ні тады, калі мы мяняліся месцамі, ні тады, калі, працятыя сціхотнай самотаю, браліся за рукі. Толькі перад тым, як бы на нечы загад, мы павінны былі абняць адно аднаго за плечы, зрабіўшы нашае кола зусім вузкім, птушка паднялася ў паветра. Трымаючыся накірунку агульнага руху і не выпускаючы аеравай сцяблінкі, яна пачала лётаць над намі нізкімі кругамі — як быццам таксама брала ўдзел у танцы.

Калі невідочныя музыкі, нібы папярэджваючы нас пра небяспеку, зайгралі зусім ціха і мы яшчэ раз узяліся за рукі, каб далей танчыць, заплюшчыўшы вочы, птушка зноў апусцілася на плячо Гімнасткі. Няўжо наша зялёнапёрая госця наперад ведала, што цяпер яна найбольш патрэбная менавіта дзяўчынцы, што на сваіх цёплых спружыністых ступачках найчасцей датанцоўвала да самага краю.

Птушка заставалася з намі да той хвіліны, калі напрыканцы мы ўскінулі рукі да зорак...

Адна ў белай хаце

Алесь ЖУК

У «Літаратурнай Беларусі» паведамлялася пра зварот Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беларускага Хельсінскага камітэта да колішняга генеральнага пракурора Беларусі Пятра Міклашэвіча з просьбай-прапановай «фармальна» рэабілітаваць вядомую беларускую паэтэсу Ларысу Геніюш (паколькі ейная грамадская рэабілітацыя адбылася ў чытацкай павазе і любові). Аднак у нашай дзяржаве нават генеральны пракурор (у якога тое ж прозвішча, што і паэтэсавае ў дзявоцтве) не мае… права на тое. Як аказалася, пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь ад 24 лістапада 1999 года Ларыса Антонаўна Геніюш прызнаная не падлеглай рэабілітацыі, а беларускі суд, як вядома, ***…
Повязь жа Ларысы Геніюш з нацыянальнай культурай — непарыўная, і сёння «Ь» друкуе прысвечанае паэтцы эсэ Алеся Жука (увойдзе ў новую кнігу прозы пісьменніка «Па дарозе дадому»), а таксама неардынарны дакумент мінулага — ліст Ларысы Геніюш да першага сакратара ЦК КПБ Пятра Машэрава.

Пра Ларысу Геніюш я ўпершыню пачуў ад Юркі Голуба, з якім мы былі аднакурснікамі. У той час кантактаваць з Ларысай Антонаўнай, асабліва моладзі, было непажадана. Людзі з органаў цікавіліся тымі, хто наведваў яе. А нацыянальна настроеная моладзь цягнулася да яе. І наведвала. Тую, што была сакратаром эмігранцкага ўраду БНР, тую, што друкавалася ў перыядычных выданнях таго часу, выдала сваю першую кнігу «Ад родных ніў» у Празе ў 1942 годзе. Тую, што ў 1948-м была арыштавана, вывезеная ў Мінск і асуджана на 25 гадоў лагераў, так і не рэабілітаваная ў 1956-м камісіяй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Камісія толькі скараціла тэрмін да 8 гадоў, практычна проста выпусціла на волю, пакінуўшы абвінавачванне ў сіле. «Няўдзячная» Геніюш, выйшаўшы на свабоду, не прыняла савецкага падданства, хаця і засталася жыць на радзіме, у Зэльве…

Для ўлады Ларыса Геніюш «как была, так и осталась националисткой», адным з тых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, віна якой была толькі ў тым, што любіла сваю Радзіму, свой народ, жадала яму «свайго пачэснага пасаду між народамі». Колькі светлых галоў заплаціла за гэтае імкненне жыццём, колькі талентаў так і прапала, зачахла ад свае незапатрабаванасці!

Ларыса Геніюш была адной з тых, хто не зламаўся, хто выстаяў да канца, хто верыў у тое, што зробленае імі не прападзе марна. Ларыса Антонаўна дасягнула свайго, няхай і пасля смерці. Напісанае ёю надрукавана, выдадзена, імя яе ўвайшло ў кагорту тых слаўных, кім ганарыцца Беларусь.

Але праз што даводзілася прайсці, якія хвіліны адчаю былі пераадоленыя, гаворыць і пісьмо Ларысы Геніюш на імя Пятра Міронавіча Машэрава. Наўрад ці трэба каментаваць гэты дакумент — сведчанне перажытага болю і адчаю, асабістай годнасці і вялікай чалавечай мужнасці.

На пісьме штэмпель групы рэгістрацыі пісем ЦК КПБ і няма ніякіх рэзалюцый. Але калі меркаваць па тым заданні, якое я атрымаў ад сакратара па ідэалогіі А.Т.Кузьміна, Машэраў пісьмо прачытаў. Аляксандр Трыфанавіч выклікаў мяне да сябе, сказаў, што па пісьме Ларысы Антонаўны мне трэба з'ездзіць у Зэльву, правесці гутарку з мясцовым кіраўніцтвам аб іх адносінах да паэтэсы, рэкамендаваць ім не перашкаджаць, а нават і спрыяць таму, каб Ларыса Антонаўна магла выступаць перад людзьмі, чытаць вершы. І яшчэ — каб ніякіх дзеянняў супроць Ларысы Геніюш не праводзілася. Калі што — звязвацца з сектарам мастацкай літаратуры ЦК.

Праз дзень я быў у Зэльве, дзе адбылася непрыемная для першага сакратара райкама партыі гаворка, але аспрэчваць указанні «таго дома» было не прынята.

Самае памятнае з тае камандзіроўкі — сустрэча і знаёмства з Ларысай Геніюш. Па дарозе ад райкама да хаты Ларысы Антонаўны я заўважыў, што прыстаўлены да мяне інструктар абкама Іван Граблеўскі нярвуецца. На маё пытанне, у чым справа, ён неахвотна патлумачыў, што Ларыса Антонаўна такая жанчына, што можам атрымаць ад варот паварот. Відаць, адчуваў нейкі грэх за сабою.

Запомнілася яшчэ брудная пасля зімы, няўтульная красавіцкая вуліца, просты вясковы плот, варотцы. Першым пра нас даў знаць сабака, які з'явіўся з-за хаты. Вуліца была пустая. Людзі з вокнаў назіралі за белай абкамаўскай «Волгай» і за людзьмі, якія з яе выйшлі. Неўзабаве дзверы сянец адчыніліся, да нас падышла жанчына. Гэта была суседка Ларысы Антонаўны, якая дапамагала ёй па гаспадарцы. Мы назваліся, жанчына вярнулася ў хату, і адтуль хутка выйшла сама Ларыса Антонаўна, нечакана моцная, па-мужчынску шырокая ў плячах, у лёгкай летняй сукенцы. Яна адчыніла варотцы, запрасіла заходзіць у хату, распрануцца і садзіцца за стол, сказала суседцы, каб прыгатавала чай.

Маю інфармацыю пра наведванне райкама выслухала стрымана, зрэдку злёгку ківаючы галавой ні то ў знак удзячнасці, ні то што норавы і павадкі сваіх чыноўнікаў ведае лепш за нас. Але з твару пасвятлела, узялася засцілаць стол, як было заведзена ў яе, вышываным прыгожым «поясам», паставіла талерачкі з «печывам» — сухарыкамі, дамашнім пячэннем, на што была вялікая майстрыца. І зусім нечакана на стале з'явіліся кілішкі і тое, што ў іх наліваюць. І пытанне:

— Ці пры выкананні начальства ня п'е?

Давялося аджартавацца, што якое ж гэта начальства, калі яно не п'е. А потым гаворка за чаем, нязмушаная, але і неабавязковая, як і звычайна паміж людзьмі раней не знаёмымі, роспыты пра Мінск. Да сваіх праблем Ларыса Антонаўна не вярталася, не скардзілася, толькі мімаходзь заўважыла, што яшчэ халаднавата на двары, а брыкет ніяк не могуць прывезці. Іван Станіслававіч адразу ж запэўніў яе, што брыкет будзе, папрасіў Ларысу Антонаўну на будучае запісаць ягоны тэлефон. Ларыса Антонаўна тэлефон запісала, але ўсміхнулася і паддзела:

— Вось бачыце, варта інструктару ЦК загаварыць па-беларуску, дык і абкам, аказваецца, умее.

Я нагадаў Ларысе Антонаўне пра вершы: у маё даручэнне ўваходзіла ўзяць вершы Ларысы Геніюш для надрукавання ў рэспубліканскіх выданнях. На нейкае імгненне яна быццам задумалася, потым падышла, здаецца, да шафы, вярнулася з папкай і нечакана прапанавала:

— А хочаце, я пачытаю вам свае вершы?

Чытала яна стоячы перад сталом і адначасна раскладвала лісткі ў два стосікі са словамі: «Гэта можна. Гэта ня пойдзе».

Чытаць Ларыса Антонаўна ўмела, пачуццё меры, як і разуменне сваёй годнасці былі ўласцівы ёй арганічна. І чытку яна не зацягнула. Паклала адабраныя лісткі ў папку, падала мне са словамі:

— Перадайце Максіму. Паклон яму ад мяне. І скажыце, няхай сам распарадзіцца.

Мне не трэба было тлумачыць, што Максім — гэта Максім Танк. Забягаючы наперад скажу, што Яўген Максімавіч распарадзіўся: у летніх нумарах «Полымя» і «ЛіМа» 1979 года былі надрукаваныя падборкі вершаў Ларысы Геніюш, а ў 1982-м была выдадзена і «вялікая» кніга паэтэсы «На чабары настоена», другая пасля «Невадам з Нёмана» 1967 года.

Правяла нас Ларыса Антонаўна да варотцаў, і калі я азірнуўся з машыны ад'язджаючы, здалося, што яна злёгку кіўнула галавой на развітанне. Падумалася, як цяжка і адзінока ёй у вялікай хаце з пабеленымі сценамі, разлічанай на вялікую сям'ю, жыць адной пасля смерці мужа, і як, мабыць, часта яна глядзіць на сцяну, дзе вісіць у рамачцы невялікая аматарская фатаграфія, з якое глядзяць на яе такія маладыя Данута Бічэль-Загнетава, Васіль Быкаў, Аляксей Карпюк… І яшчэ падумалася, што залішне зацятыя барацьбіты з нацыяналізмам наўрад ці перастануць рабіць ёй дробныя паскудствы, але на вялікія наўрад ці адважацца.

Вось кароценька і ўсё, што засталося ў памяці ў сувязі з пісьмом Ларысы Геніюш, дзякуючы якому я пабачыўся з сапраўднай паэтэсай і патрыёткай любімай ёю Беларусі.

«МАРАЛЬНАЕ МАРАДЗЁРСТВА, НЕДАСТОЙНАЕ БЕЛАРУСІ» ЛІСТ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ ДА ПЯТРА МАШЭРАВА

Высокапаважаны тав. МАШЭРАЎ.
Прозвішча маё Геніюш Ларыса Антонаўна. Жыву ў Зэльві, Гродзенская вобл., вул. Савецкая, 7. Мне вельмі патрэбная Вашая дапамога, бо інакшай не маю тут. 8/II сёлета памёр мой муж, лекар-пенсіянер, і яшчэ раз сустрэўшыся з дзікунствам, амаль нейкім маральным марадзёрствам тутэйшых зэльвянскіх уладаў, я не магу не напісаць Вам з розных меркаванняў.

«У космас узляцелі,
прасторы змаглі,
Розум на гэта патрэбны
і праца,
А я хачу пэўна ступаць
па зямлі
І злыдняў ніякіх на ёй
не баяцца!»

Жыццё мужа і маё было тут і ёсць невыноснае. Калі стары і хворы адыходзіў на пенсію, дык забаранілі калегам яго і персаналу нават праводзіць яго па-чалавечу. Нават прафсаюзу забаранілідаць тыя грошы, якія даюць усім, хто на пенсію адыходзіць. Болей таго. Болей, калі моцна захварэў, не магла нікога даклікацца з лекараў, каб мну дапамог! Тады я звярнулася да др. Багдановіча, Облздрава ў Гродне, і ён прыслаў кансультанта і назначыў тэрапеўта, які б даглядаў «Ветерана труда». Як пасля я даведалася, дык інструктар РКП у Зэльве спэцыяльна папераджаў лекараў, каб да нас не заходзілі нават! А муж задыхаўся, стагнаў і мучыўся на маіх руках. Была я тут сама і бязсільная ў сваёй розпачы. Парыла зёлкі, са сылзьмі выпрошвала «Валакардзін» і купляла тое, што сам ён сабе назначаў…
Вось сканаў на маіх руках. Сумленна даглядала яго др.Кулікава, але медыцына аказалася бязсільнай, як і мая любоў. Чужыя, простыя нашыя людзі, са шматвяковай народнай культурай у сэрцы, нават малапісьменныя памагалі мне тут, як маглі. Адазвалася сумленне і ў былых калегаў мужа. Адведалі яго хоць па сьмерці, падаравалі жывыя кветкі. Хацелі зрабіць апошнюю радасьць нябошчыку і загадалі стужкі на вянках падпісаць на яго роднай, каханай беларускай мове. Жаль, у майстэрні нейкі тав.К. загадаў сарваць тыя стужкі і напісаць іх па руску. Я шаную рускіх і іх мову і культуру, але за жыцьця і па сьмерці яго я хачу чуць удома і сваю родную мову! У нас Саюз Сацыялістычных Савецкіх Рэспублік, а не нейкі «Эйн фольк, эйн райх, эй фюрэр!», дзе ўжо нічога, нікому нельга! Цягалі, казалі людзі мне, тых бедных «геройскіх» лекараў, але яны маўчаць, бо баяцца. Няўжо і па сьмерці нельга той любай моваю карыстацца? Начальнік зельвенскай міліцыі нават забараніў шафёру хуткай дапамогі ехаць на могілкі і прывезьці каго з нашай сям'і, калі б там абамлеў з гора… Якое дзікунства! Хлапец спалохаўся. Нейкія тыпы падыходзілі да людзей і «грозна» папраджалі: «Никаких речей, никаких ракет /?/». Калі людзі пыталіся, хто яны такія і якім правам да іх з падобным звяртацца, дык адыходзілі. Бегаў і нешта ўсё запісваў у блакнот маленькі «мудры» Верстак, Палячок зельвенскі, начальнік Горсавета. Пасля аказалася, што ў спісак занесў тых, хто нёс вянкі і галоўнае: крыж. А крыжа таго нёс наш далёкі сваяк, інвалід, якога некалі лячыў мой муж. Крыж быў зроблены ў хаце, бо якжа нам іначай, калі мужаў дзед быў некалі царкоўным старастам у гэтым, здаецца, з XVI стагоддзя, старым храме….. Удома паставілі толькі пласцінку «Аве Марыя» па італьянску, а вось несьлі яго, як і дзядоў нашых — з крыжам. Падаў той Верстак беднага таго Ваню ў Райспалком, каб судзілі, панапісваў небыліцы проста і загадаў, каб чалавека пакаралі штрафам 50 рб. Каб хоць 10 рб, думае бедны чалавек, а скуль вазьму 50… Ледзь не плакаў, але тая камісія яму даравала… І дырэктар школы і той Верстак выклікалі людзей нашто неслі вянкі? Палохалі… А на могілках безліч рознай міліцыі! Ціж не жах? Пад канвоям хаваюць, беднага, загаманілі людзі. А мы за сьлязьмі не бачылі сцежкі. Ніхто не выступаў, не прамаўляў. І толькі сын падзякаваў усім добрым людзям і запрасіў на хаўтурную вячэру ў хату.
Я хачу прасіць Вас, каб Вы запэўнілі мне хоць крыху спакой, пакуль не зраблю парадак з магілкаю мужа /зямля павінна асесці/, а пасля дапамаглі мне выехаць недзе, хоць да Папуасаў, каб я такога болей не бачыла! Мне ўжо тут пагражалі, але сказалі: «Пусть ещё поживёт»….. Думайце, тав. Машэраў, бо Вы не ведаеце, што тут з людзьмі выробляюць. Вельмі прашу Вас, уважце мой боль і гэтую маю просьбу дапамагчы мне спакойна пражыць у сваёй хаце час, пакуль магілу не прывяду ў парадак. Яшчэ далучаю Вам ліста, якога ўчора атрымала. Піша гэта настаўнік з Гудзевіч, Гродзенскай вобл., які арганізаваў там добры літаратурна-краязнаўчы музей. Я абецала дапамагчы яму, але людзі, напалоханыя тымі пахавінамі, ужо і пісаць мне баяцца, ня толькі дапамагчы. Ізноў надзея толькі на Вас. Чалавек гэта разумны, вартасны і цяжка хворы. Калі гляджу на Вас па тэлебачанню, на Вашыя сустрэчы з сапраўды высокакультурнымі і гуманнымі паліт. дзеячамі сваёй і іншых краінаў, дык хочацца верыць, што такое знушчанне над жывымі і мёртвымі, маральнае такое нейкае марадзёрства, пакажацца і Вам недастойным нашай Беларусі! Застаюся з глыбокай павагай да Вас і з вераю, што абоім нам дапаможаце.

Ларыса Геніюш
Зэльва, 31/III.1979 г.

P.S. Я буду чакаць адказу ад Вас, ці вышлю яшчэ Вам копію свайго ліста, калі не дадуць Вам гэтага, бо ўсё думаю.

Ўжо свечкі даўно пагашаны.
І магілы пад снегам спяць…
— Няўжо і мяне няшчасную
Пад канвоям будуць хаваць?

Ларыса Геніюш

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: **(8-017) 354-80-91.** Адрас электроннай пошты: **sbp@tut.by**